Дубянецкі С.Ф.
Дубянецкі Э.С.



Цяжкі шлях да адраджэння

Брэст
Выдавецтва С.Лаўрова
1997

Хай Беларусь, мая старонка,
Ўваскрэсне к вольнаму жыццю!

Янка Купала

З ВЕРАЙ У БУДУЧЫНЮ
(замест прадмовы)

Для гісторыі Беларусі характэрны як перыяды сапраўднага росквіту, адраджэння, так і працяглыя часы ўсеагульнага заняпаду, адмаўлення самабытнасці беларускага народа, яго культуры і мовы. Аднак і ў самых неспрыяльных абставінах нашы продкі ўсё ж ніколі поўнасцю не страчвалі свайго унікальнага менталітэту, нацыянальнага характару, сваіх адмысловых традыцый, звычаяў, абрадаў. У мінулым беларусы нярэдка яскрава выяўлялі свае найлепшыя рысы і якасці, дэманстравалі ўсяму свету сваю таленавітасць, працаздольнасць, надзвычайнае багацце народнай духоўна-культурнай спадчыны.

Тым не менш, нягледзячы на шматвяковую гісторыю беларускай дзяржаўнасці, багатыя духоўныя традыцыі і прыкметны ўклад у скарбонку агульначалавечай культуры, нам пакуль не ўдалося да канца вырашыць праблему станаўлення нацыянальнай самасвядомасці як трывалага фундаменту суверэнітэту і свабоднага, незалежнага развіцця краіны.

Сёння наша грамадства сутыкнулася са шматлікімі цяжкасцямі і перашкодамі, якія прыкметна запавольваюць яго паспяховую эвалюцыю ў накірунку паглыблення дэмакратыі, ажыццяўлення прагрэсіўных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, дасягнення маральна-духоўнага адраджэння нацыі. Але ў гістарычнай перспектыве, як вядома, ніякае праследаванне і ніякія перашкоды няздольныя задушыць нацыянальнае адраджэнне народа і яго волю да свабоды і незалежнасці.

Адсюль неабходнасць глыбокага асэнсавання і вывучэння вытокаў нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, прычын і вынікаў іх асіміляцыі і дэнацыяналізацыі. Вельмі важна, каб мы ўсе ўсведамлялі сябе беларусамі, зразумелі, што ў нас ёсць што адраджаць, ёсць свае самабытныя традыцыі і багаты гістарычны вопыт.

А вопыт гэты сведчыць, што кожны раз выжыванню беларускай нацыі дапамагалі традыцыі талерантнасці і верацярпімасці, узаемасувязі і ўзаемапа-

разумення паміж народамі пры адначасовым захаванні такіх універсальных сімвалаў самавызначэння беларусаў і носьбітаў іх духоўнасці, як родная мова, нацыянальнае аблічча і традыцыйны лад жыцця.

Драматызм гістарычнага лёсу беларусаў, іх неадольнае імкненне захаваць незалежнасць свайго духу з'яўляюцца прадметам асаблівай увагі беларускіх даследчыкаў, усіх тых, для каго любоў да Бацькаўшчыны і клопат пра яе будучыню вызначаюць аснову светапоглядаў і жыццёвай пазіцыі. Тым больш, што і сёння не змаўкаюць дыскусіі не толькі вакол праблемы гістарычных каранёў беларускага народа, але і нацыянальнай спецыфікі яго культуры і светабачання, яго права "на законнае сярод іншых народаў існаванне" (І.Канчэўскі).

Добра вядома, аднак, што культура кожнага народа развіваецца не толькі ў рэчышчы агульначалавечага культурнага працэсу, але і па сваіх уласных законах, што яе важнейшай функцыяй з'яўляецца захаванне этнічнай своеасаблівасці, фарміраванне самасвядомасці і каштоўнасных арыентацый людзей. Пры ўсёй шматграннасці ўнутранай структуры такая культура ўяўляе пэўную цэласнасць і таму здольная супраціўляцца знешнім уздзеянням і самааднаўляцца, калі якая-небудзь яе частка аказваецца разбуранай. Аб гэтым могуць сведчыць прыкметы раннехрысціянскага адраджэння на Беларусі, грамадска-палітычны і культурны ўзлёт у эпоху Рэнесансу, развіццё беларускай мовы, літаратуры і мастацтва, незалежных сацыяльна-культурных структур у канцы 19 — пачатку 20 ст.

Асаблівасці гістарычнага шляху беларускага народа аказваюць істотны ўплыў на далейшае развіццё культуры і мовы, ажыццяўленне яго неад'емнага права на самавызначэнне і дзяржаўны суверэнітэт. Паспяховае вырашэнне такіх складаных і актуальных задач будзе залежыць ад настойлівай і мэтанакіраванай дзейнасці ўсёй грамадзянскай супольнасці па захаванні сваёй гісторыка-культурнай спадчыны, творчаму авалоданню каштоўнасцямі айчыннай і сусветнай культуры, назапашаным чалавецтвам вопытам пабудовы свабоднага, дэмакратычнага грамадства. Як падкрэсліваў Аляксандр Цвікевіч, калі вычэрпваюцца ўсе сілы народа, калі не застаецца ў ім ніводнай групы, годнай весці барацьбу за існаванне, тады памірае, зыходзіць са сцэны ўвесь народ, але калі здольнасць да творчай дзейнасці захоўвае хаця б асобная яго частка, то ўвесь народ яшчэ не асуджаны на скон.

Верыцца, што Беларусь зможа пераадолець наступствы радыяцыйнага і духоўнага Чарнобыля і з годнасцю ўвайсці ў сям'ю еўрапейскіх народаў, агульначалавечую супольнасць. У гэтай кнізе чытач знойдзе цікавыя факты, лічбы і высновы, якія датычацца цяжкага, часам трагічнага шляху беларускага народа да свайго новага Адраджэння. У аснову кнігі пакладзены навукова-папулярныя і публіцыстычныя артыкулы, апублікаваныя намі ў розных перыядычных выданнях Беларусі на працягу 1991—96 гг.

СВАБОДА ДУМКІ ЦІ НАСІЛЛЕ?

Гэтая спрадвечная антыномія не давала і не дае спакою чалавечаму розуму, выклікаючы непераадольнае жаданне хаця б крыху наблізіцца да яе вырашэння, хаця б трошкі аслабіць удары непрадказальнага і драматычнага Лёсу. Ва ўсе часы людзі пакутавалі ад бязлітаснасці абставін і жахлівых хваляў, якія кідалі іх у бездань новых пакут, сацыяльнага і духоўнага прыгнечання. І разам з тым іх ніколі не пакідала вера ў тое, што Дабро здольнае перамагчы Зло, што праз змрочныя краты іх абяздоленага быцця праб'ецца ў рэшце рэшт праменьчык святла і надзеі.

Такая надзея неаднойчы сустракала і наш гаротны, спакутаваны і цярплівы народ. Здарылася гэта пасля цяжкай і доўгачаканай перамогі над нацыянал-сацыялісцкай тыраніяй з яе блюзнерскмі планамі заняволення ўсяго чалавецтва. Але найбольш блізкай да свайго ўвасаблення гэтая мара здавалася тады, калі ўжо засталіся ў мінулым нягоды сталінска-жданаўскай сістэмы насілля і татальнага падаўлення асобы, яе неад'емнага права на свабоду думкі і перакананняў. Калі пачалі аддаваць даніну памяці ахвярам былых злачынстваў і генацыду, асэнсоўваць антычалавечую сутнасць і тую ж блюзнерскую афарбоўку ўсёпажыральнага ГУЛАГа.

І якое ж расчараванне спасцігла занадта даверлівых людзей, калі яны неўзабаве пераканаліся, што і без сталінскіх гужоў ім немагчыма "людзьмі звацца"! Што ўцалелыя жрацы культу правадыра вельмі хутка пакончылі з хрушчоўскай адлігай, з яго адчайнымі спробамі ачысціць неба ад чорных хмар страху і беззаконня. Што ў адно імгненне яны вынайшлі новыя метады барацьбы з іншадумствам — псіхушкі, ссылкі, забароны на прафесіі, на выезд з краіны і нават тайны абмен дысідэнтаў на савецкіх шпіёнаў за мяжой ці лідэраў заакіянскіх кампартый.

Зыходным пунктам падобных проціпраўных дзеянняў была "ўпэўненасць" улад у тым, што ў нашым грамадстве няма сацыяльнай глебы для прарастання атрутнага насення іншадумства, а яны, улады, нясуць асаблівую адказнасць за стан свядомасці грамадзян. І ніякіх, маўляў, зняволеных за перакананні ў нас няма, нікога не праследуюць у судовым парадку за палітычныя погляды і выказванні, адрозныя ад пануючай у грамадстве ідэалогіі. Ёсць толькі нешматлікія выпадкі прыцягнення да адказнасці людзей за дзеянні, якія кваліфікуюцца судом або як антысавецкая агітацыя і прапаганда, або як сістэматычнае распаўсюджванне загадзя ілжывых выдумак, знеслаўляючых савецкі дзяржаўны і грамадскі лад.

АБЯСШКОДЖВАННЕ "БОМБАЎ ХЛУСНІ"

Тым часам работа па своечасовым выяўленні і абясшкоджванні "бомбаў хлусні", як гэта раіў у свой час Ленін, працягвалася поўным ходам і ў масавым маштабе. Адных абвінавачвалі ў закліках да ўзброенай барацьбы супраць існуючага ў Савецкім Саюзе ладу, другіх — у распальванні нацыяналізму і варожасці паміж народамі СССР, трэціх — у парушэнні заканадаўства аб рэлігійных культах або недазволеным рэлігійным выхаванні дзяцей, чацвёртых — ва ўдзеле ў акцыях пратэсту супраць савецкага ўмяшання ў справы Чэхаславакіі і Афганістана.

Сіняўскі і Даніэль, як вядома, адсядзелі працяглыя тэрміны за ананімную публікацыю на Захадзе сваіх літаратурных твораў. Якіру і Красіну не змаглі прышыць нічога "лепшага", як сувязь з НТС. Галіча, Каржавіна, Аўтарханава і іншых разглядалі як штатных служак "імперыялістычнага цэнтра "Свабода", кіруючы камітэт якога, маўляў, з'яўляўся адным з галоўных органаў, накіроўваючых падрыўную дзейнасць супраць СССР і іншых сацыялістычных краін. Недаравальным грахом Максімава лічылі рэдагаванне ім "антисоветского журнальчика "Континент", які быццам бы таксама прэтэндаваў на тое, каб задаваць тон антысавецкім кампаніям.

Над вядомым праваабаронцам Кавалёвым, цяперашнім старшынёй камісіі Вярхоўнага Савета РСФСР па правах чалавека, учынілі судзілішча ні больш ні менш, як за выданне "Хронікі каталіцкай царквы ў Літве" і падпісанне кантракта з замежным выдавецтвам на права распаўсюджвання сваіх матэрыялаў. Ну, а мужнага, прастадушнага генерала Грыгарэнку трымалі ў спецыяльнай псіхіятрычнай бальніцы за тое, што ён дабіваўся вяртання крымскіх татар на сваю гістарычную Радзіму.

А хіба ўкладваюцца ў рамкі элементарнай прыстойнасці, не гаворачы ўжо аб нормах законнасці і маралі, тыя знявагі і здзекі, якія выпалі на долю Андрэя Дзмітрыевіча Сахарава і Аляксандра Ісаевіча Салжаніцына? Хіба вытрымліваюць якую-небудзь крытыку суслаўска-андропаўскія байкі аб тым, што гэтыя людзі выступалі супраць разрадкі міжнароднай напружанасці і міралюбівай палітыкі СССР, дзейнічалі не інакш, як супраць сваёй Айчыны і савецкага народа, насуперак іх карэнным інтарэсам і спадзяванням?

Вельмі цікава будзе нагадаць і аб сапраўднай цане ходкага ў тыя гады тэзіса аб тым, што ў поглядах так званых барацьбітоў за правы чалавека няма нічога свайго, што ўсё гэта спачатку імпартавана, а потым зноў падхоплена буржуазнымі журналістамі і радыёгаласамі і выдаецца за "думку ўнутранай апазіцыі ў СССР".

АХВЯРЫ КАБІНЕТНА-ПРАФІЛАКТЫЧНАЙ ПСІХІЯТРЫІ

Каля дваццаці гадоў кідалі па турмах і псіхбальніцах нашага земляка, бабруйскага рабочага Міхаіла Кукабаку. І толькі за тое, што ён яшчэ задоўга да перабудовы ўбачыў заганы і зразумеў бесперспектыўнасць таталітарнай сістэмы, адкрыта гаварыў аб гэтым і змагаўся — не, не са зброяй у руках, а словам, маральным учынкам — за ліквідацыю гэтай сістэмы, устанаўленне сапраўднай дэмакратыі і справядлівых адносін паміж людзьмі.

Сотні, калі не тысячы сумленных працаўнікоў станавіліся ахвярамі, калі можна так выказацца, кабінетна-прафілактычнай псіхіятрыі. Дастаткова было якому-небудзь неабыякаваму чалавеку напісаць з дзесятак пісьмаў-скаргаў, як з адпаведнага кабінета такім ціхенькім, мілагучным галаском раілі: "А ці не варта яго старанна абследаваць у клініцы? Мабыць, ён мае вялікую патрэбу ў кваліфікаванай медыцынскай дапамозе? Калі ласка, паклапаціцеся аб чалавеку, дапамажыце яму". І паслухмяныя лісліўцы з ліку падначаленых чыноўнікаў або непасрэдна галоўных урачоў гарадскіх ці раённых бальніц неадкладна кідаліся на "дапамогу" гаротнікам.

Такога "бацькоўскага клопату" быў удастоены школьны настаўнік мовы і літаратуры М.В.Дудар. З той толькі розніцай, што тэлефонная рэкамендацыя-рэцэпт ішла не зверху ўніз, а наадварот (бывае і такое!). Таленавіты педагог, шчыры і ўважлівы чалавек, ён выхоўваў у вучняў любоў да роднай зямлі, сеяў у іх душах зярняты дабрыні і чалавечнасці. А калі пайшоў працаваць намеснікам старшыні калгаса па выхаваўчай рабоце, з такой жа перакананасцю змагаўся супраць безгаспадарчасці, несправядлівасці і беззаконня. Шукаў праўды ў тагачасных кіраўнікоў Брэсцкай вобласці і аднойчы, не знайшоўшы яе, "прыстрашыў" гаспадара вялікага кабінета: "Вось паеду са скаргаю ў Маскву, там разбяруцца!" І сапраўды, "разабраліся"! Не паспеў Міхаіл Васільевіч ступіць на перон Беларускага вакзала, як яго "гасцінна" сустрэлі некалькі чалавек у "чорных плашчах", пасадзілі ў машыну і адвезлі...у псіхушку. На некалькі месяцаў, не паведаміўшы нават не толькі калгаснаму начальству, але і бедным жонцы і дзецям.

Не днямі і месяцамі, а ўжо цэлымі гадамі вымяраўся прафілактычны тэрмін для аднаго з першых скарыназнаўцаў і вяшчальнікаў перабудовы Вячаслава Зайцава. Камусьці не спадабаліся яго лекцыі пра іншапланецян ды НЛА, яго крытычныя выказванні ў адрас "выдатнага палітычнага і дзяржаўнага дзеяча сучаснасці" Л.І.Брэжнева і нават тое, што пісаў слова "Бог" з вялікай літары. Зайцава выключылі з партыі, звольнілі з работы ў Інстытуце літаратуры АН Беларусі.

Трагічны лёс напаткаў і другога супрацоўніка таго ж інстытута — Міколу Прашковіча. Яго звольнілі за тое, што збіраў грошы для дапамогі ахвярам брэжнеўскіх рэпрэсій на Украіне і ў Расіі, прапанаваў паклапаціцца пра тых

беларусаў, якія жывуць за межамі Беларусі. А літаральна за два гады да перабудовы Прашковіч памёр пры загадкавых абставінах.

Пад неаслабным кантролем абаронцаў парадку знаходзіліся і вернікі розных канфесій. На памяць міжвольна прыходзяць расправы над прыхільнікамі Савета цэркваў евангельскіх хрысціян-баптыстаў або, як тады называлі, раскольнікамі. Разгон мірных малітоўных сходаў, канфіскацыя рэлігійнай літаратуры, магнітафонных запісаў, арышты і турэмныя зняволенні, пазбаўленне правоў на адукацыю і свабодны выбар месца працы — такі арсенал форм і сродкаў адміністрацыйнага ўздзеяння на людзей іншага, чым адміністратары, веравызнання.

Напрыклад, у 1980 годзе жыхарка Брэста З.Я.Вільчынская была звольнена з работы за тое, што, напісаўшы заяву на адпачынак без утрымання, паехала ў Львоў на судовы працэс сваёй веруючай дачкі Галіны. А кандыдат навук Гаражанскі, які адкрыта заявіў аб сваіх рэлігійных перакананнях, вымушаны быў пайсці працаваць вартаўніком брэсцкай царквы.

Забароны на прафесіі па рэлігійных матывах часам закраналі і атэістаў, камуністаў і нават... партыйных работнікаў. Так, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Ганцавіцкага райкома КПБ Р.М.Лазіцкі быў вызвалены ад сваіх абавязкаў за ўдзел у пахаванні сваёй праваслаўнай маці па рэлігійным абрадзе. І як ні стараўся Рыгор Міхайлавіч даказаць сваю невінаватасць, у якія б інстанцыі ні звяртаўся — нічога не дапамагло! А на партыйным сходзе, дзе разглядалася яго "персанальная справа", адзін з калег нават упікнуў: "Патрэбна было, убачыўшы святара, завярнуцца і паехаць дамоў, як гэта зрабіў калісьці знаёмы раённы начальнік яшчэ той, сталінскай закваскі". З пасады дырэктара сярэдняй школы ў сваёй роднай вёсцы "зляцеў" і брат Лазіцкага, таксама камуніст. Невядома, якую меру выхаваўчага ўздзеяння прыдумалі мясцовыя камісары для другога брата — камуніста, які працаваў механізатарам у калгасе. Але можна дапусціць, што і яму прыйшлося зведаць немалыя маральна-псіхалагічныя нагрузкі.

З КАГО ЗРЫВАЦЬ МАСКІ?

Такія вось факты. А яны, як кажуць, рэч упартая. І не вельмі хочацца афіцыйна прызнаваць іх, што было б раўназначна прызнанню масавага характару парушэнняў правоў чалавека ў СССР. У тым ліку, зразумела, і права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі, на свабоду перакананняў і іх свабоднае выяўленне.

Менавіта таму яшчэ і ў нашыя дні моцна рэжуць слых любая інфармацыя ці навуковае абагульненне падобных з'яў. Як гэта здарылася, скажам, калі ў адной даволі "высокай" аўдыторыі былы загадчык сектара партыйнага будаўніцтва былога Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ У.А.Бабкоў сказаў,

што за найменшае праяўленне іншадумства чалавека маглі проста кінуць у псіхушку. У адно імгненне са сваіх месц ускочылі намеснік міністра аховы здароўя, пракурор рэспублікі і запатрабавалі ад лектара канкрэтных прыкладаў, а былы старшыня КДБ катэгарычна заявіў, што па Беларусі яму вядомы ўсяго адзін факт змяшчэння ў псіхбальніцу быццам бы па палітычных матывах, але гэты чалавек — Міхаіл Кукабака — быў сапраўды хворым.

І ўсё ж варта прыгадаць хаця б некалькі павучальных штрыхоў з "вопыту" таго масіраванага палявання на ведзьмаў, або таго, як пісаў Яўгеній Еўтушэнка, цэрберызму, які разбураў нашу маральнасць і культуру, пажыраў носьбітаў іх вечных каштоўнасцяў і нормаў.

Успомнім, скажам, як ва ўсіх сродках масавай інфармацыі, на ўсіх семінарах, у школах і інстытутах ганьбілі таго ж Салжаніцына — аўтара нерукатворных помнікаў ахвярам сталінскіх рэпрэсій, здзіўляючай сваёй яснасцю і прастатой праграмы маральнага самаачышчэння ўсіх і кожнага. Вялікаму пісьменніку-гуманісту прыклеілі тады столькі ярлыкоў, прыпісалі столькі адмоўных, ганебных рыс і якасцей, што нават не маглі прысніцца самаму таленавітаму раманісту.

Драматызм сітуацыі заключаўся яшчэ і ў тым, што Салжаніцына крытыкавалі нават некаторыя з тых, хто, як і ён, асабіста зведаў пакуты ГУЛАГа. Хто знемагаў ад голаду і непасільнай працы ў савецкіх канцэнтрацыйных лагерах. Хто кожную раніцу назіраў новыя штабелі трупаў зняволеных. Хто стагнаў ад болю і крыўды і сам сябе супакойваў, што гэта недарэчнасць, што не можа, не павінна быць такога ў нас.

Міласцівы Бог, мабыць, дараваў гэткі грэх Барысу Дзьякаву, які да таго ж, калі верыць прэсе, пад удушальным уздзеяннем "яжовых рукавіц" згадзіўся стаць сексотам НКУС. Але апісаныя ў яго "Аповесці аб перажытым" жудасныя карціны тэрору і вытанчаныя прыёмы катавання людзей даюць багаты матэрыял для разважанняў аб несумяшчальнасці сталінскай мадэлі жыццеўладкавання з дэмакратыяй і свабодай. А таксама аб аб'ектыўнай патрэбнасці ў поўным (!) аб'ёме аднавіць гістарычную справядлівасць, у тым ліку і ў адносінах да непасрэдных распрацоўшчыкаў і выканаўцаў "інструкцыі смерці". Нездарма адзін з герояў названай аповесці Гуральскі, старшы навуковы супрацоўнік Акадэміі навук СССР, аднойчы вымавіў: "Наступае, па выразу Леніна, час зрывання ўсіх і ўсялякіх масак". Напэўна, ім, гаротнікам, і сапраўды тады здавалася, што хутка ўсе даведаюцца пра іх мучыцеляў — наглядчыкаў, начальнікаў турмаў і лагерных пунктаў, пра тых, хто натхняў дамарощчаных карнікаў і забойцаў. Але словам гэтым, як бачна, не суджана было збыцца. Затое і цяпер шырока выкарыстоўваюцца апрабіраваныя метады "зрывання масак" з палітычных апанентаў, з тых, хто здольны прапанаваць і зрабіць штосьці добрае, цывілізаванае, прагрэсіўнае.

ПОШУК "ВОРАГАЎ" ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Чарнобыльскай вясной 1986 года па Мінску пракацілася чутка аб "справе" маладога Бембеля, сына вядомага скульптара, народнага мастака Беларусі. Аказваецца, на Захад трапіў рукапіс яго кнігі, складзенай з інтэрв'ю-разважанняў дзесяткаў людзей аб лёсе нашай роднай мовы, яе занядбанні ў БССР, аб неабходнасці надаць ёй статус дзяржаўнай.

І зноў... заявіла аб сабе тое самае "тэлефоннае права". Кнігу забаранілі друкаваць у мясцовых выдавецтвах, Алега Бембеля выключылі з радоў КПСС, пазбавілі работы. Застаецца толькі спадзявацца, што пасля прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце і Закона аб мовах у Беларускай ССР людзі, якія мелі дачыненне да гэтых акцый, зразумелі сваю памылку і ўжо не страшацца жывога слова, а, мабыць, і нармальна ўспрымаюць вершы беларускага паэта Зніча.

У наступным, 1987 годзе беларускую прэсу запаланілі артыкулы аб варожай нацыяналістычнай дзейнасці заснавальнікаў і актыўных дзеячаў урада так званай БНР, аб "шкодным" уплыве на моладзь узнікшых нефармальных аб'яднанняў, аб "антыпатрыятычнай сутнасці" беларускай нацыянальнай сімволікі накшталт "Пагоні" і бел-чырвона-белага сцяга. Але па радыё і тэлебачанні, на старонках газет і часопісаў чамусьці не расказвалі аб канкрэтных спробах адраджэння забытых традыцый, прапаганды гістарычных сімвалаў.

Не з газетных рэпартажаў, а хіба што ад саміх удзельнікаў пленумаў творчых саюзаў можна было даведацца аб найбольш вострых выступленнях у абарону роднай мовы, яе права на роўнае існаванне з рускай, яе ролі ў развіцці і ўзбагачэнні агульнай культуры народаў краіны. Чуліся папрокі за тое, чаму не змаглі прадухіліць з'яўлення ў "ЛіМе" паэмы Сяргея Грахоўскага "Балючая памяць" — усхваляванага расказу аб перажытай самім аўтарам трагедыі сталінскіх лагераў, грознага папярэджання аб недапушчальнасці паўтарэння падобных жахаў і здзекаў з Асобы.

Процістаянне двух розных падыходаў да сутнасці дэмакратыі і галоснасці дасягнула свайго апагею, бадай, восенню 1988 года. Здарылася гэта, як мы памятаем, адразу пасля выхаду ў свет 39-га нумару часопіса "Огонёк", дзе быў надрукаваны артыкул Алеся Адамовіча "Оглянись окрест!". Ужо самі здымкі, змешчаныя ў якасці ілюстрацыі да артыкула, здорава напалохалі сталіністаў. На здымках былі паказаны пастрэленыя чарапы, бясконцыя рады касцей, вынятых з магіл расстраляных у Курапатах людзей, а таксама плакаты з надпісамі: "Сталін — кат", "Патрабуем мемарыялу ахвярам сталінізму". Тым большую занепакоенасць выклікала пісьменніцкая думка аб неабходнасці дэмакратычных перамен у Мінску, недапушчальнасці ператварэння яго ў "антыперабудовачную Вандэю".

Адсюль і змест той шырока разгорнутай кампаніі па выкрыцці "палітычнага

невуцтва" аўтараў усялякага роду артыкулаў, адозваў, зваротаў, праграм. Самога Адамовіча абвінавачвалі ў тым, што ён стаў амаль што галоўным натхніцелем руху супраць асноў існуючай Сістэмы, адной з галоўных фігур у сіянісцкай змове супраць "сацыялістычнай Айчыны". (Проста-такі на некалькі год апярэдзілі "Советскую Россию" і блізкія ёй па духу выданні, якія сёння ў такіх жа грахах абвінавачваюць Гарбачова, Якаўлева, Шэварднадзе і іншых "прарабаў перабудовы").

Масавы чытач у той час і ў вочы не бачыў ідэйна-палітычнай платформы "Талакі", а крытыкі ўжо палохалі яго тым, што гэта платформа — ні больш, ні менш! — падвяргае грунтоўнай ператрэсцы асноватворныя палажэнні марксісцка-ленінскай тэорыі, насычана духам "даўно асуджанага гісторыяй і ўсім беларускім народам буржуазнага нацыяналізму". А ў жаданні моладзі аднавіць у Беларусі дзейнасць "беларускае аўтакефальнае праваслаўнае царквы і беларускае грэка-каталіцкае (уніяцкае) царквы" ўбачылі не што іншае, як падкопы былых гітлераўскіх прыслугачоў у асобе збегшых ад народнага гневу паліцэйскіх і бургамістраў. Ніколькі не лепшае, маўляў, і жаданне талакоўцаў узнавіць "практыку стварэння беларускіх вайсковых фарміраванняў", бо гэтым у свой час займаліся эсэры, беларускія буржуазныя нацыяналісты сумесна з белапольскімі акупантамі.

Прыкладна на такім узроўні крытыкавалі пасля, у верасні 1989 года, праграму і статут Беларускага народнага фронту "Адраджэнне". Прычым Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прыцягнуў для аналізу такія ведамствы і ўстановы, як Саўмін, Белсаўпроф, праваахоўныя органы. У падрыхтаваным на аснове гэтага аналізу "Заключэнні" выказвалася нязгода з палажэннем праграмы БНФ аб праве рэспублікі мець уласныя вайсковыя фарміраванні, аб вяршэнстве законаў Беларусі на яе тэрыторыі, аб неабходнасці адмены шостага артыкула Канстытуцыі СССР і ўстанаўлення шматпартыйнай сістэмы. Які далейшы лёс гэтых афіцыйна-навуковых высноў, вядома кожнаму з нас.

Горкі прысмак пакінулі і іншыя кампаніі канфрантацыі з грамадска-палітычнымі рухамі і партыямі. Беларуская сялянская партыя, да прыкладу, не падабаецца некаму за яе імкненне на практыцы рэалізаваць лозунг "Зямля — сялянам". Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада — за прыхільнасць ідэям сацыяльнай справядлівасці і гуманізму, жаданне стварыць, абапіраючыся на вопыт іншых краін, дэмакратычную прававую дзяржаву, у якой забяспечваюцца эканамічная, палітычная і духоўная свабода грамадзян, роўнасць усіх перад законам, высокі ўзровень дабрабыту і культуры народа. "Камуністаў Беларусі за дэмакратыю" не прызнаюць таму, што яны хочуць удыхнуць новае жыццё ў аслабелы ад сталінскіх догмаў арганізм КПСС, зрабіць яе цывілізаванай палітычнай партыяй парламенцкага тыпу.

І калі б справа толькі абмяжоўвалася славеснымі баталіямі, узаемнай крытыкай — гэта было б яшчэ паўбяды. Галоўнае ў тым, што пастаянная і бяскон-

цая псіхалагічная атака ў адзін выдатны момант здольная ператварыцца ў матэрыяльную сілу, у фізічнае дзеянне. Так здарылася і 30 кастрычніка 1988 года, калі ва ўмовах масіраванай ідэйна-палітычнай апрацоўкі грамадскай думкі некаторыя работнікі праваахоўных органаў і сапраўды паверылі, што на Маскоўскіх могілках і ў Курапатах сабраліся "экстрэмісты".

Вось адкуль, мабыць, і прыйшла ідэя дэпалітызацыі і дэпартызацыі такіх органаў, як і іншых дзяржаўных структур. Зразумелі гэтую ідэю і тыя мінскія міліцыянеры, якія прапаноўвалі альтэрнатыўны праект Закона БССР аб міліцыі. Зразумелі яе і лідэры рабочага руху ў сталіцы Антончык, Быкаў і Мухін, члены стачачных камітэтаў. На жаль, палітызаваны Вярхоўны Савет Беларусі замест глыбокага аналізу сутнасці справы і прыняцця разумных рашэнняў учыніў, можна сказаць, суд над стачкомамі, ды і над дзесяткамі тысяч рабочых, якія прыходзілі на плошчу Леніна і плошчу Перамогі ў тыя сонечныя красавіцкія дні.

МЕТАСТАЗЫ БЕЗЗАКОННЯ

Менавіта ў такіх абставінах і стала магчыма тое, што здарылася 7 мая гэтага года, калі быў арыштаваны і пасаджаны пад варту супрацоўнік газеты "Навіны Беларускага народнага фронту "Адраджэнне" Валеры Сядоў. А праз два месяцы праз "Народную газету" мы даведаліся аб неверагодных умовах утрымання падследных у следчым ізалятары МУС БССР і аб галадоўцы Сядова з патрабаваннем прызнаць яго справу палітычнай і замяніць арышт падпіскай аб нявыездзе.

Гэтае паведамленне выклікала расчараванне і боль, прымусіла людзей зноў мысленна вярнуцца да той страшнай "віцебскай справы". Бо ўжо, як вядома, шмат каму з нас здавалася, што ў Беларусі нарэшце перарваны гэты злавесны ланцуг беззаконня, грубага парушэння правоў грамадзян. Здавалася, што ўжо ніколі не паўтарыцца тое, што за турэмныя краты могуць быць кінуты і нават расстраляны ні ў чым не вінаватыя людзі. Хаця найбольш прадбачлівыя папярэджвалі, што занадта рана супакойвацца. Што яшчэ дзейнічае тая заганная сістэма барацьбы за высокія паказчыкі выкрыцця злачынства, якая забяспечвае кожнаму належнае месца, пасаду і званне. Што метастазы беззаконня ахапілі самыя розныя сферы жыцця і зводзяць на нішто ўсе намаганні па лячэнні задоўжанай хваробы.

Тут мы маем на ўвазе беззаконне ў шырокім сэнсе слова. Гэта значыць, усё тое, што робіцца або насуперак дзеючаму заканадаўству, або проста зыходзячы з таго, што правамоцная любая форма насілля над асобаю, калі яна не знайшла адлюстравання ў законе. Такое можа здарыцца, напрыклад, калі хто-небудзь па сваім меркаванні або па чыім-небудзь загадзе заводзіць "персанальную справу" на ўпаўне прыстойнага чалавека. Калі хто-небудзь можа бесцы-

рымонна паймаць "на вудачку" ячэйку з вашым тэлефонным нумарам. Калі з такой лёгкасцю могуць запісаць на відэакасету, магнітафонную стужку любы ваш рух ці нават шэпт на мітынгу або ў пікеце перад будынкам урада або Вярхоўнага Савета.

Хочацца звярнуць увагу яшчэ на адну акалічнасць. Мяркуючы па апублікаваным прадстаўленні Пракуратуры БССР Вярхоўнаму Савету БССР аб дачы дазволу на прымяненне мер адміністрацыйнага спагнання да народнага дэпутата рэспублікі, усё бліжэй і бліжэй праваахоўныя органы "падбіраюцца" да лідэра Беларускага народнага фронту З.С.Пазьняка. І наўрад ці можна тут схаваць таксама палітычныя матывы праследавання, якімі б аргументамі і спасылкамі на артыкулы розных кодэксаў і законаў гэта ні прыкрывалася.

Мабыць, нехта не здольны да гэтай пары зразумець, якія надзеі ўскладаюць людзі на дэмакратычныя пераўтварэнні і абнаўленне свайго ладу жыцця. І галоўнае — не здольны зразумець, што непасрэднымі творцамі і носьбітамі гэтых перамен з'яўляюцца сам народ і вылучаныя з яго асяроддзя лідэры, людзі высокага інтэлектуальнага ўзроўню і грамадзянскай мужнасці, людзі, якія разумеюць аб'ектыўныя патрабаванні часу і могуць штосьці зрабіць для іх практычнага ўвасаблення. Мабыць, ёсць яшчэ нямала людзей, якіх нічому не навучыў наш уласны гістарычны вопыт па ўстанаўленні амаль поўнага аднадумства, "усенароднага адзінства", дзеля дасягнення якога, па выразу Васіля Быкава, адзін са старажытнейшых і культурнейшых еўрапейскіх народаў праліў рэкі ўласнай і чужой крыві.

(Літаратура і мастацтва", 23 жніўня 1991 г.)

ВЫЙСЦІ З НАЦЫЯНАЛЬНАГА АНАБІЁЗУ

Гістарычны лёс беларускага народа з'яўляецца надзвычай адметным і своеасаблівым. Безумоўна, у падобным меркаванні ёсць вельмі значная доля ісціны. Дык у чым жа канкрэтна выяўляецца адметнасць станаўлення і развіцця культуры, мовы беларусаў, спецыфічныя рысы нацыянальнага светапогляду і самасвядомасці беларускага народа? Адказ на дадзенае пытанне ўвогуле досыць складаны, няпросты. Думаецца, тут неабходна аб'яднанне творчых намаганняў прадстаўнікоў розных навуковых дысцыплін — гісторыкаў, філосафаў, этнолагаў, літаратуразнаўцаў і г.д. Аднак пры вырашэнні праблем, звязаных з эвалюцыяй нацыянальнай свядомасці, з раскрыццём аўтэнтычных бакоў характару беларусаў, немагчыма абысціся без комплекснага, шматпланавага падыходу, у якім былі б адначасова выкарыстаны самыя разнастайныя метады і формы даследавання.

Сапраўды, фактараў (дэтэрмінант), якія накладвалі пэўны адбітак на асаблівасці псіхалогіі беларусаў, вельмі многа, прычым характар такога ўздзеяння быў нярэдка супярэчлівы. Адразу адзначым, што Беларусь у XIX ст. з'яўлялася арэнай барацьбы двух даволі моцных уплываў — польскага і расійскага. Ужо адно гэта вызначала адметнасць гістарычнага шляху беларусаў. Нават пры вонкавым разглядзе гэтай праблемы відавочна, што ўздзеянне двух супрацьлеглых фактараў не магло, у большасці выпадкаў, стымуляваць развіццё беларускай культуры і мовы. Але на самай справе ўсё было больш складаным, і таму некаторыя факты не паддаюцца адной дакладнай трактоўцы. Ды і ўвогуле неабходна разумець, што тыя фактары, якія негатыўна ўздзейнічаюць на асобны аб'ект, у іншых выпадках і пры іншых умовах могуць, наадварот, прыводзіць да пазітыўных зрухаў у іх. І гэта таксама трэба ўлічваць, каб пазбегнуць крайнасцей і аднабаковасці.

З гісторыі вядома, што з XVI—XVII стст. Беларусь знаходзілася пад даволі моцным уплывам Польскай Кароны. У канцы XVIII — пачатку XIX ст. сітуацыя пачала мяняцца. Тэрыторыя беларускіх губерняў трапляе, пасля яе інкарпарацыі ў склад Расійскай імперыі, у сферу асаблівай увагі з боку апошняй. І ўжо далейшае развіццё беларускага народа праходзіла пры парадаксальных умовах, як бы на скрыжаванні польскага і расійскага націску. Пры Аляксандры I у значнай меры захавалася перавага польскай культуры і мовы на землях Беларусі ў сферы адукацыі, справаводства і г.д. Але з пачатку 30-х гг., у час праўлення Мікалая I, цэнтр уплыву паступова пераносіцца на рускі элемент. Немалы штуршок падобнаму пераходу дало паўстанне 1830—31 гг. і яго хуткае паражэнне. Тады царскі ўрад надаў сваім дзеянням вядомую ідэалагічную "падкладку" ў выглядзе знакамітай трыадзінай фармулёўкі — "самаўладдзе, праваслаў'е, народнасць". У адносінах да Беларусі палітыка царызму вялася на аснове распрацаванай прыкладна тады ж канцэпцыі "заходне-русізму". Па-

водле яе, тэрыторыя Беларусі афіцыйна была аб'яўлена "Паўночна-Заходнім краем", а ўсе яе насельнікі з таго часу лічыліся "заходнерусамі". Па справядлівым меркаванні А.Цвікевіча, "заходне-русізм" на "некалькі дзесяцігоддзяў затрымаў развіццё беларускага культурнага адраджэння". Асабліва значныя практычныя вынікі рэалізацыя гэтай канцэпцыі на Беларусі прынесла ў другой палове XIX ст., пасля падаўлення паўстання 1863—64 гг. Менавіта тады быў нанесены найбольш магутны ўдар па самасвядомасці беларусаў, па іх самабытнай культуры, мове, па маральна-духоўным абліччы беларускага народа-пакутніка. У дадзеным сэнсе Беларусь была адкінута назад, на доўгі час былі "закансерваваны" самыя негатыўныя якасці і праявы духоўнага жыцця розных народаў, якія насялялі Беларусь. Што ж у першую чаргу маецца на ўвазе?

Пад такім магутным прэсам, калі ўсё навокал было рускім, паўсюдна панавала руская мова, беларускі народ траціў увогуле яшчэ неразвітае пачуццё сваёй нацыянальнай самабытнасці, саматоеснасці і беспаваротна, здавалася, страчваў тое асноўнае, што адрознівае адзін народ ад другога, — сваю родную матчыну мову. Беларусаў афіцыйныя ўлады, польскія і расійскія вучоныя не лічылі своеасаблівым народам, а ўсяго толькі нейкім "этнаграфічным матэрыялам", "групай", "галіной" рускай або польскай народнасці.

Ужо ў канцы XVIII ст., адразу пасля далучэння Беларусі да Расіі, спецыяльнымі загадамі прадугледжвалася неабходнай і карыснай замена мясцовых чыноўнікаў "натуральными русскими" з больш высокім жалаваннем. У далейшым рускія чыноўнікі атрымлівалі, як правіла, і шмат іншых прывілеяў, ільгот у параўнанні з прадстаўнікамі поліэтнічнага мясцовага насельніцтва. Да ліку падобных прывілеяў адносіліся больш вялікія памеры зарплаты настаўнікам, служачым органаў улады, выдача ім лепшых казённых кватэр з ацяпленнем і асвятленнем, забеспячэнне так званымі сталовымі, раз'яздными, кватэрнымі, прагоннымі грашыма і г. д.

Адным словам, для "вернападданых" Расійскай імперыі існавала ў той час цэлая сістэма пераваг у розных сферах жыцця. Многія чыноўнікі з Расіі па сваім уласным жаданні прыязджалі на Беларусь у мэтах нажывы ці пагоні за кар'ерай. Асабліва масавы характар набыла гэтая з'ява ў 60-я гг. XIX ст., калі ў выніку актыўнай дзейнасці Мураўёва-"Вешальніка" па расправе з паўстанцамі адбылося своеасаблівае "адкрыццё" Беларусі для расійскіх грамадзян. Нярэдка настаўнікі школ, гімназій, семінарый Беларусі, а таксама паліцэйскія, міравыя суддзі, пісары, пасрэднікі ды інш. на барацьбе за "чистый русский язык" рабілі сабе нядрэнную кар'еру, прычым атрымлівалі права на павялічаныя пенсіі (300 руб. і больш), на даволі значныя зямельныя ўчасткі, на атрыманне розных узнагарод (грошы, ордэны, медалі, падзякі і да т. п.).

У асноўным для чыноўнікаў рускага паходжання прадугледжвалася выдача канфіскаваных маёнткаў удзельнікаў паўстання 1863—64 гг. На месца пры-

ехаўшых з унутраных губерань Расіі чыноўнікаў адпраўлялі пераважна асоб, якія набылі адукацыю на Беларусі. Ім неабходна было, як правіла, адслужыць у Расіі поўны тэрмін (5—10 гадоў), пасля сканчэння якога мала хто з беларусаў ужо вяртаўся назад. У XIX ст. больш высокі сацыяльны статус мелі, вядома, польскія і рускія мовы, прычым добрыя веды апошняй з пачатку 30-х гадоў становяцца адной з галоўных умоў атрымання права на чын 14 класа (калежскага рэгістратара).

Зразумела, што ўсе вышэйпералічаныя перавагі, якія даваліся польскаму ці рускаму элементу, паступовае выцясненне ўсялякай "беларускасці" не маглі не закрануць светапогляду і адносін да падобных працэсаў часткі беларускага народа. І тут можна сказаць, што ўсебаковай дэнацыяналізацыі падвергліся пэўныя катэгорыі, слаі беларусаў, асабліва ў гарадах і мястэчках. Беларускае дваранства пачало пад уздзеяннем афіцыйнай русіфікатарскай, паланізатарскай прапаганды лічыць сваю родную мову і традыцыі "хлопскімі", "вясковымі", "ніжэйшымі" за польскія або рускія. Нярэдка беларускія па паходжанні дваране, мяшчане падкрэслівалі і ганарыліся сваім быццам бы польскім шляхецтвам на той толькі падставе, што польская культура з'яўляецца культурай "высакароднага, вышэйшага класа". Страта нацыянальнай самасвядомасці, сваёй непарыўнай прыналежнасці да Бацькаўшчыны назіралася нават і сярод сялянскага насельніцтва Беларусі. Так, яшчэ і ў 20-я гг. XX ст., калі ў рэспубліцы шырока разгарнулася беларусізацыя, далёка не выключэннем былі выпадкі, калі сяляне-беларусы лічылі сваю мову "мужыцкай", "халопскай", якая быццам бы ўвогуле "не мае будучыні". Відавочна, што пад уплывам (у большай альбо меншай ступені) палітыкі паланізацыі і русіфікацыі ў XIX — пачатку XX ст. знаходзілася немалая колькасць беларусаў.

Да ўсяго трэба дадаць, што царскія ўлады выкарыстоўвалі самыя розныя сродкі для дасягнення сваіх палітычных мэт — ад замаскіравана-ідэалагічных да адкрыта-рэпрэсіўных. Пры гэтым "няўрымслівымі" праваднікамі такой палітыкі з'яўляліся шматлікія чыноўнікі, паліцыя, армія і праваслаўнае духавенства, частка якога імкнулася "пераканаўча" даказаць беларусам вялікую неабходнасць поўнага падпарадкавання "акраіннай" Беларусі "вялікай матушцы-Расіі". А раней многія святары, шляхціцы даводзілі да свядомасці беларусаў, што яны "сапраўдныя палякі", а Беларусь павінна, нібыта, зноў увайсці ў склад былой Польшчы "ад мора да мора".

У такіх неспрыяльных варунках, калі "сельская паліцыя па загадзе вышэйшай улады змагалася з народнымі беларускімі звычаямі, старымі ігрышчамі і інш., саджала ў халодную сялян за народныя спевы, у якіх гаварылася аб цяжкім жыцці і дрэннай уладзе" (Е. Раманаў), пад такім вытанчаным прэсам афіцыйнай прапаганды, цэнзуры і г. д., па-сапраўднаму ўставала пытанне не толькі аб духоўным здароўі, але нават і аб выжыванні, выратаванні беларускага народа ад дэградацыі і поўнай асіміляцыі. Іншымі словамі, пытанне практычна стаяла

рубам — быць або не быць самабытнай беларускай культуры, мове і яе носьбітам.

У псіхалагічным плане, на падставе аналізу ўмоў жыцця ў тыя далёкія часы, а таксама розных прыкладаў беларускага фальклору можна сцвярджаць, што значная частка беларускага народа апынулася ў стане нацыянальнага анабіёзу, калі энергія, воля беларусаў былі паралізаваны, не маючы належных варункаў для свайго развіцця і практычнага ўвасаблення. У XIX ст. значна ўзмацніліся сярод беларусаў рысы канформнасці, нейкага раўнадушша, апатычнасці. Некаторыя з беларусаў у той час паддаліся канфармізму, волі і меркаванням рускага ці польскага чыноўніцтва, фактычна адмовіўшыся ад усяго аўтэнтычнага і тым здрадзіўшы сваёй Бацькаўшчыне.

Сапраўды, многія людзі і ў мінулым, і ў нашым стагоддзі разумелі, што беларускі народ няўхільна дэградуе, амаль што выраджаецца, і патрэбны нейкія захады дзеля яго ўратавання. Але практычна ўсе аддавалі перавагу маўчанню, пасіўнасці, бо так было лягчэй жыць і дамагчыся хаця б нязначных матэрыяльных дабротаў. І гэта таксама караніцца ў нашай псіхалогіі, — абы ўсё было спакойна і ціха, абы каго не пакрыўдзіць. Так, беларускі народ талерантны, лагодны, ён, як раней адзначалі, гатоў пайсці на кампрамісы, абы была заўсёды "згода". Безумоўна, гэта добрая рыса характару, аднак, на жаль, у некаторых абставінах яна можа прыводзіць і да негатыўных вынікаў (для саміх жа беларусаў), што між іншым нядрэнна разумелі і выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах паланізатары і русіфікатары "Паўночна-Заходняга краю". У тыя перыяды гісторыі, калі праяўляецца адкрыты здзек, глумленне над народам, яго мовай, звычаямі, празмерная талерантнасць (цярпімасць) народа часцей за ўсё не ідзе яму на карысць.

Значная частка беларусаў у XIX ст. верыла многім прапагандысцкім хлуслівым устаноўкам, падпадала псіхалагічна пад іх уздзеянне, як пры гіпнозе. У выніку мела месца т. зв. акцэнтуацыя (узмацненне) асобных рысаў характару беларусаў пры адначасовым аслабленні іншых, часта сацыяльна важных і неабходных духоўных якасцей. Сярод мноства тыпаў падобнай акцэнтуацыі характар беларусаў хутчэй за ўсё можна было б аднесці да астэнічнага і дыстымнага тыпу, якія вызначаюцца такімі рысамі, як пэўная нерашучасць, недастатковая актыўнасць, схільнасць да дэпрэсіі, пачуццё непаўнацэннасці, апатычнасці. Ды і якім іншым практычна мог быць тып характару беларускага народа пры такіх неспрыяльных умовах яго гістарычнага развіцця, пры падобным націску на псіхіку беларусаў з розных бакоў і па розных каналах?! Больш таго, беларускі народ мог бы поўнасцю асіміляваца ці дэградаваць, калі б не яго славутая доўгацярплівасць, працаздольнасць, таленавітасць. Калі б не гэтыя якасці беларускага нацыянальнага характару, існаванне беларускага народа як самастойнага этнасу магло б увогуле спыніцца яшчэ ў другой палове XIX ст., падчас максімальнага "росквіту" працэсаў дэнацыяналізацыі беларусаў.

Безумоўна, у значнай меры духоўна-маральны патэнцыял беларускага народа быў падарваны, нацыянальная псіхалогія падверглася штучным насільным зменам і скажэнням. Аднак, хаця воля да жыцця ў беларусаў аслабла, яе ўсё ж ніхто не змог пазбавіць поўнасцю. У тыя часы Беларусь "нацыянальна не паміралa, але і не жыла". Гэтыя словы належаць А.Цвікевічу, які далей піша, што Беларусь ахапіў гістарычны нацыянальны анабіёз, калі ўсе сілы, уся энергія народа "спыніліся, не выяўляючыся ў актыўнай творчасці, як бы чакаючы свайго ўваскросу".

Канешне, пры аналізе псіхалагічных праблем развіцця беларусаў нельга зараз асвятліць усе бакі і адказаць на ўсе пытанні. Мы ж не мелі тут намераў абвінавачваць каго-небудзь у нашым сённяшнім становішчы, ускладаць за гэта віну на ўсіх прадстаўнікоў якой-небудзь адной нацыі. За тое, што было ў гісторыі Беларусі, аб'ектыўна павінны несці пэўную адказнасць у першую чаргу тыя, хто найбольш заўзята праводзіў палітычныя ўстаноўкі на практыцы, незалежна ад іх нацыянальнай і канфесійнай прыналежнасці. Але ўсё гэта адышло ў нябыт, і цяпер усім прыхільнікам беларушчыны даецца яшчэ адзін (мо апошні?) шанц на справе даказаць, што не ўсё яшчэ страчана, што ў нас яшчэ хопіць сілы волі і моцы здзейсніць светлыя ідэалы нашага новага Адраджэння.

("Літаратура і мастацтва", 5 чэрвеня 1992 г.)

НАШЧАДКІ ШАВЭНА

Распад былога СССР паказаў, што прага народаў да свабоды і незалежнасці неадольная, а пабудаваць сапраўдную дзяржаўнасць можна толькі на аснове поўнага суверэнітэту і самавызначэння нацыі, яе раўнапраўнага супрацоўніцтва з іншымі членамі сусветнай супольнасці. Пераканаўчым доказам аб'ектыўнасці і непазбежнасці гэтага працэсу сталі няздольнасць былога імперскага Цэнтра задушыць свабодалюбівыя памкненні літоўскага, эстонскага і латышскага народаў, поўны крах спроб рэфармаваць Саюз.

Нацыянальная самасвядомасць, праз якую кожны народ і прыходзіць да ўсведамлення сваіх інтарэсаў, становіцца дзейсным фактарам самаарганізацыі, назапашвання стваральна-творчага патэнцыялу і адраджэння нацыі. Вось чаму ідэя развіцця і ўмацавання такой свядомасці, павага нацыянальнай годнасці грамадзян, недапушчэнне любых дзеянняў супраць суверэнных правоў народаў абвяшчаюцца ў якасці асноўных прынцыпаў нацыянальнай палітыкі любой самастойнай дзяржавы. Тым большае значэнне набывае рэалізацыя гэтых ідэй у Рэспубліцы Беларусь, якая пераадольвае цяжкія вынікі мэтанакіраванай палітыкі крамлёўскіх і мясцовых звышінтэрнацыялістаў па дэнацыяналізацыі ўсіх сфер жыццядзейнасці грамадства.

ХТО ПРАГНЕ РЭВАНШУ

Чым шырэй разгортваюцца працэсы суверэнізацыі і радыкальных пераўтварэнняў у новай Садружнасці, тым большае супраціўленне сустракаюць яны з боку кансерватыўных і прагнучых рэваншу сіл. Што толькі ні робяць іх арганізатары, каб скампраметаваць ініцыятараў белавежскіх пагадненняў, зганьбіць саму ідэю самастойнага, незалежнага развіцця народаў. І што, маўляў, распад Савецкага Саюза — гэта вынік нейкай міжнароднай змовы, мэтанакіраваных падкопаў ЦРУ і іншых спецслужбаў, агентура якіх пранікла аж да Віскулёў, урадавых кабінетаў і парламенцкіх ложаў ва ўсіх без выключэння рэспубліках. І што хтосьці збіраецца нас каланізаваць, пазбавіць роднай зямлі-карміцелькі і загнаць у вечнае рабства ўсё да тых жа ненавісных капіталістаў.

Паколькі з дапамогаю старых ідэалагічных клішэ ажывіць састарэлы арганізм немагчыма, на паверхню выцягнулі зусім было забытую "рускую ідэю", а дакладней, яе вялікадзяржаўна-шавіністычную інтэрпрэтацыю. Нараджалася гэтая ідэя ў свой час як абгрунтаванне справядлівага імкнення рускага народа да духоўнага і маральнага ўдасканалення, як сродак узбагачэння лепшых нацыянальных традыцый і рыс характару. Ды і тыя філосафы-ідэалісты (Бярдзяеў, Ільін, Фядотаў і іншыя), якіх так палюбілі цяпер маскоўскія і мінскія матэрыялісты, называлі выношваемую ў Расіі рускую ідэю ідэяй братэрства

людзей і народаў, лічылі яе не насіллем над другімі, а намаганнем над сабой.

Пошуку цывілізаваных шляхоў адраджэння новай Расіі, прымірэння рускіх паміж сабой і ўсімі "блізкімі і далёкімі братамі" прысвячаюць сёння свае намаганні вядомыя дзеячы культуры гэтай краіны і замежжа, прагрэсіўныя палітыкі. Усе яны зыходзяць з разумення таго, што сам па сабе рускі народ не мае дачынення да таго чалавеканенавісніцкага нацыяналізму і насілля, якое праявілася ў злоўжываннях дзяржаўнай улады ў мінулым, асабліва ў гады сталінскага тэрору і дэпартацый народаў. Бо добрае і злое ў рускім характары, як правільна зазначыў акадэмік Д.Ліхачоў, зусім не ўраўнаважаны, добрае заўсёды ў шмат разоў каштоўнейшае і больш важкае за злое.

Зразумела, не гэтыя гуманістычныя пачаткі рускай нацыянальнай ідэі падымаюцца на шчыт сучаснымі "сынами и патриотами Отечества". З яе выхопліваюцца і абсталютызуюцца тыя палажэнні і прынцыпы, якія так ці інакш "працуюць" на дасягненне агульнай мэты — вярнуць Расію "дамоў", да яе чыстых сельскіх вытокаў, да выпрабаваных форм дзяржаўнасці і рэлігіі. Для адных гэта азначае зварот у царскую, дапятроўскую ці дакамуністычную Русь, для другіх — у больш блізкую і знаёмую дахрушчоўскую альбо даперабудовачную Краіну Саветаў.

Па сутнасці, нічога благога ў такіх пажаданнях не было б, калі б пад Руссю "патрыёты" разумелі, скажам, тэрыторыю, якая цяпер і носіць адпаведную афіцыйную назву "Расійская Федэрацыя — Расія". Бяда, аднак, у тым, што яны, прама і адкрыта ігнаруючы снежаньскія пагадненні і новую геапалітычную сітуацыю, гавораць аб Вялікай Расіі ад Буга да Курылаў, ад Ямала і да Кушкі. Гэта фактычна азначае новы перадзел граніц, прызнаных ад імя сваіх народаў Вярхоўнымі Саветамі ўсіх рэспублік, Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і практычна ўсёй сусветнай супольнасцю.

"Там, дзе жывуць расіяне, — ёсць расійская зямля" — такі прынцып абароны тэрытарыяльнага адзінства Расіі прапанаваў рускі эмігрант з Парыжа Э.Лімонаў, які сам сябе не без гонару называе расійскім нацыяналістам. А для паскарэння працэсу ўзнаўлення былой імперыі ён патрабуе арганізаваць барацьбу за аўтаномію рэгіёнаў, населеных расійскім народам, альбо поўны выхад з-пад юрысдыкцыі "варожых этнасаў". Мабыць, тое ж самае меў на ўвазе і віцэ-прэзідэнт Расійскай Федэрацыі А.Руцкой, які амаль па-генеральску загадаў лідэрам нацыянал-кар'ерызму (гэта значыць, кіраўнікам незалежных дзяржаў) "зарубіць сабе на носе, што Расія не аддасць ні пядзі зямлі", а падчас свайго няпрошанага візіту ў Малдову фактычна прызнаў "незалежнасць" абвешчанай прыднястроўскімі сепаратыстамі рэспублікі.

А які вэрхал учыніла так званая агрэсіўна-непаслухмяная большасць удзельнікаў апошняга з'езда народных дэпутатаў Расіі, каб не дапусціць канстытуцыйнага прызнання новых рэалій, захаваць у Асноўным законе адкінутае жыццём палажэнне аб існаванні СССР і ўваходжанні ў яго склад Расійскай

Федэрацыі! Каб любой цаной адрадзіць былую імперыю і ўсе яе каланізатарскія структуры, неадкладна адабраць ад незалежнай Украіны Крым, "падараваны" ёй былым савецкім кіраўніцтвам у гонар 300-годдзя добраахвотнага ўз'яднання з Расіяй. Каб не столькі абараніць правы сваіх грамадзян у Прыднястроўі, колькі аддзяліць яго ад суверэннай Малдовы (зразумела, трымаючы ў моцнай вуздэчцы Чэчню і Татарстан).

Усё гэта вельмі нагадвае "філасофію" таго напалеонаўскага салдата Шавэна, які быў занадта заўзятым прыхільнікам захопніцкай палітыкі свайго імператара і ад прозвішча якога паходзіць само паняцце "шавінізм". З той толькі розніцай, што ў аснове вялікарасійскага шавінізму ляжыць "тэорыя" аб дзяржаўнай велічы і сусветным месіянстве рускага народа, аб яго нейкай асаблівай духоўнай і выключна кансалідуючай ролі. Нават у самім паняцці "рускія", згодна з гэтай канцэпцыяй, утрымліваецца ідэя саборнасці, збірання ўсіх нацый і народаў у адно дзяржаўнае адзінства, трываласць якога заўсёды вызначалі аўтарытарная ўлада і праваслаўе як вышэйшая духоўная ipастась у параўнанні з "заземленым каталіцызмам" і рэфарматарскімі "сурагатамі" хрысціянства.

Такая ідэйна-тэарэтычная аснова неверагодна ўзросшай актыўнасці прыхільнікаў саборна-дзяржаўнага патрыятызму і наваяўленых месій, якія хочуць "ашчаслівіць" людзей сваімі байкамі аб "народнай манархіі" і "народным сацыялізме", а па сутнасці — прадоўжыць і замацаваць сваё неабмежаванае панаванне ў грамадстве, не дапусціць ні малейшых зрухаў у напрамку дэмакратыі, нацыянальнай і эканамічнай свабоды, культурнага прагрэсу. Адсюль і такія метады барацьбы, як запалохванне, ультыматумы, крайні нацыяналізм і антысемітызм, ускосныя і прамыя пагрозы грамадзянскай вайной, што асабліва голасна прагучалі на Усеармейскім афіцэрскім сходзе, Кангрэсе грамадзянскіх і патрыятычных сіл Расіі і падпольным з'ездзе народных дэпутатаў былога СССР у падмаскоўным саўгасе "Воранава".

НЕБЯСПЕКА СУЧАСНАГА "ЗАПАДНО-РУССИЗМА"

Атрымаўшы такі магутны "метадалагічны" зарад ад сваіх духоўных настаўнікаў з Масквы, акрыялі і прыкметна ажывіліся нашы дамарослыя змагары за вялікую маці-Расію, за родны і мілы іх сэрцу "Союз нерушимый республик свободных". Яны таксама ўнеслі карэктывы ў сваю стратэгію і тактыку, правялі перагрупоўку сваіх шэрагаў, вывелі, што называецца, з падполля ачуняўшых ад жнівеньскага і снежаньскага шоку фундаменталістаў. І зразумеўшы, што беларускі народ ўжо добраахвотна не адмовіцца ад заваяванай свабоды, узялі на ўзбраенне тыя ж сілавыя прыёмы ўздзеяння, тыя ж дэмагагічныя лозунгі і ўстаноўкі.

Што ж гэта за людзі, так заклапочаныя вялікай геапалітыкай і рашуча не прызнаючыя новы статус сваёй Радзімы як незалежнай дзяржавы? Ці здоль-

ныя яны аказаць колькі-небудзь прыкметны ўплыў на натуральнае цячэнне нашага жыцця-быцця? Якія клопаты апаноўваюць іх у гэтыя пераломныя для рэспублікі дні?

Каб адказаць на пастаўленыя пытанні, варта прыгадаць хаця б некаторыя ўрокі так званай "западно-русской школы" і яе прадстаўнікоў, што вялі такую жорсткую барацьбу супраць беларускага вызваленчага руху ў канцы мінулага — пачатку гэтага стагоддзя. Галоўным у гэтай барацьбе быў аргумент аб "вялікай магутнай Расіі", а яе ідэалагічным афармленнем — "западно-руссизм", альбо тая плынь у гісторыі грамадска-палітычнай думкі, якая лічыла, што Беларусь не з'яўляецца краінай з асобнай нацыянальнай культурай і таму не мае права на самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, і што яна, як "Заходняя Расія", непадзельна звязана з цэлым — "адзінай вялікай Расіяй", а беларусы, як адно са славянскіх плямён, арганічна ўваходзяць у склад "адзінага рускага народа". У гэтым сэнсе "западно-руссизм", як своеасаблівае праяўленне вялікадзяржаўнай формы рускай ідэі, процістаўляў сябе плыні нацыянальна-беларускай і заўсёды вызначаўся адпаведнымі русіфікатарскімі тэндэнцыямі ў стасунку да Беларусі. З'яўляючыся свайго роду антытэзай паланізатарскім тэндэнцыям, ён змагаўся супраць іх зноў жа ў інтарэсах не Беларусі, а Вялікай Расіі.

Зыходныя ідэалагічныя ўстаноўкі і мэты вызначалі канкрэтныя формы і метады барацьбы з беларускім вызваленчым рухам, якая вялася тады па ўсіх кірунках і ва ўсіх момантах жыцця: у прэсе, у грамадскіх арганізацыях, у школе, у сям'і. У сваёй кнізе "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадскай думкі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в." (Мінск, 1929) Аляксандр Цвікевіч падкрэсліваў, што "западно-руссизм" карыстаў у гэтай барацьбе ўсе сродкі, якія былі ў яго загадзя: з царкоўнага амбону, з прафесарскай катэдры, праз паліцыю і суд, праз безліч афіцыйных выданняў, праз "брацкія лісткі" і школьныя падручнікі, — усюды ішла прапаганда таго, што беларускі нацыянальны рух — "польская інтрыга", выдумка ворагаў Расіі, што ідэя адраджэння беларускай культуры ёсць плод цёмнага розуму, які хоча загнаць Беларусь у процьму непісьменнасці і адсталасці". У выніку такога жорсткага процістаяння былі раздушаны беларускія палітычныя партыі, культурна-асветніцкія і кааператыўныя арганізацыі, забаронены "Наша Ніва", іншыя выданні.

І нават пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года і той буры, якая пранеслася за ёю ў Расіі і ў рэшце рэшт растрэсла самадзяржаўную імперыю, дала магчымасць і Беларусі народзіць з іншымі народамі самастойна вырашаць асноўныя пытанні свайго існавання, ідэалогія "западно-руссизма" была галоўнай перашкодай у справе нацыянальна-культурнага адраджэння. Сведчаннем гэтага стала нежаданне Часовага расійскага ўрада А.Керанскага пайсці насустрач сціплым патрабаванням беларусаў аб забеспячэнні права на палітычнае самакіраванне, нацыянальную культуру. Далейшыя зносіны з гэтым урадам, а пазней і з

бальшавіцкім Саўнаркомам, як зазначыў А.Цвікевіч у другой сваёй рабоце "Беларусь: Палітычны нарыс" (Берлін, 1919), "канчаткова пераканалі ўсіх, што калі раней беларускаму адраджэнню даводзілася мець справу з расійскім самадзяржаўем, то цяпер даводзіцца мець справу з велікарускім вялікадзяржаўем, якое аказалася значна мацней, чым можна было меркаваць, і якім аказаліся прасякнуты ўсе без выключэння расійскія палітыкі, не выключаючы і самых левых".

Прарочыя, проста скажам, словы наконт прасякнутасці левых палітыкаў ідэяй нацыянальнага шавінізму. Сапраўды, хіба не велікарускім вялікадзяржаўем патыхае ад таго перапалоху, які ахапіў пасля ўтварэння СНД частку траўкінскай Дэмакратычнай партыі, хрысціянскіх дэмакратаў на чале з Аксючыцам? Хіба не аб настальгіі па СССР сведчыць і той факт, што раптам замаўчалі тыя маскоўскія паэты і пісьменнікі, якія ў час хрушчоўскай "адлігі" так моцна ўзвысілі свой голас супраць таталітарызму і дасюль з'яўляліся для нас узорам барацьбы за нацыянальныя і агульначалавечыя ідэалы?

І хоць цяперашнія "западно-руссы" яшчэ не аб'ядналіся, як раней, у магутную палітычную партыю, а іх парады і рэкамендацыі не прымаюцца да неадкладнага выканання ўрадам, нельга недаацэньваць і маштабы дзейнасці гэтых людзей, і выкарыстоўваемыя імі прыёмы ўздзеяння на грамадскую думку, на пэўную частку нашых суайчыннікаў. Сваю "ідэалагічную падкормку" ў агульную чашу нацыянальнага Адраджэння яны спрабуюць падкінуць і праз вышэйшыя органы ўлады, мясцовыя Саветы і выканкомы, праз шматлікія таварыствы, саюзы і рухі, праз сродкі масавай інфармацыі, навучальныя ўстановы, школы і курсы, навуковыя канферэнцыі і сімпозіумы.

Дастаткова перагартаць старонкі стэнаграм або справаздач аб пасяджэннях Вярхоўнага Савета Беларусі, каб перакананацца: ніякага іншага існавання, іншага быцця, як у адной упражцы з Расіяй і ўсімі саюзнымі рэспублікамі, народы якіх не менш за нас імкнуліся вырвацца з абдымкаў усясільнага Цэнтра, дэпутаты-саюзнікі і антырыначнікі проста не бачылі. Ды і па сённяшні дзень, аб'яднаўшыся ў новыя парламенцкія фракцыі, яны пад выглядам "абароны" інтарэсаў людзей працы па сутнасці тармозяць прыняцце законаў і рашэнняў, якія стваралі б неабходныя знешнія і ўнутраныя ўмовы для рэалізацыі дэкларованага суверэнітэту рэспублікі, яе самастойнага існавання як раўнапраўнага члена еўрапейскай і сусветнай супольнасці, дэмакратычнай нацыянальнай дзяржавы.

Нацыянальны нігілізм, прыхільнасць да вялікадзяржаўнай ідэі і непрыняцце фактычна ўсіх афіцыйных высілак на шляху нацыянальна-палітычнага і культурнага адраджэння — характэрныя рысы не толькі шмат якіх абывацеляў, што страцілі пачуццё нацыянальнай годнасці ў надзейных ланцугах сталінізму, але і тых, хто прэтэндуе на ролю нейкіх правадыроў і ідэйных пастыраў "пакрыўджанага" народа. Яны працягваюць ганьбіць нават нашы святыя нацыянальныя сімвалы — бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня", пад якімі развіваўся

і развіваецца беларускі адраджэнцкі рух, патрабуюць рэферэндуму аб мэтазгоднасці іх выкарыстання, стварылі нейкі таямнічы камітэт "Беларусы супраць "Пагоні".

Вялікую трывогу выклікае той факт, што сярод "расійска-падданых беларускіх патрыётаў" аказалася нямала прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Канечне, дзесяцігоддзі жыцця ў дэнацыяналізаваных умовах не маглі не адбіцца на ўспрыманні ёю асноватворных каштоўнасцяў свайго народа. Але, як адзначаў Максім Багдановіч у сваім артыкуле "Беларусы", народная інтэлігенцыя ў свой час з'явілася асновай беларускага руху, замацавала дэмакратычнае аблічча яго ідэалогіі. "Абараняючы інтарэсы свайго народа, — пісаў ён, — і кладучы ў аснову гэтай дзейнасці наяўнасць самастойнай беларускай нацыянальнасці і беларускай культуры, беларуская інтэлігенцыя ніколі не ўпадала ў шавінізм, не імкнулася да прымяншэння правоў суседніх нацыянальнасцей на ўсю паўнату самастойнага развіцця".

У сувязі з гэтым нельга не сказаць некалькі слоў аб тых дыскусіях, якія вядуцца апошнім часам вакол нацыянальных інтарэсаў Беларусі ў сэнсе яе геапалітычнага становішча, тэрытарыяльнага рассялення беларусаў. Зразумела, нам трэба добра ведаць, што было і што адбываецца "па той" і "па гэты" бок "крэсаў", як дзялілі жыццёвую прастору Сталін з Гітлерам і Молатаў з Рыбентропам. Але галоўнае, каб гэта не суправаджалася прыніжэннем годнасці іншых народаў, тым больш іх запалохваннем сербахарвацкім варыянтам у выпадку няўважлівых адносін да нашых суайчыннікаў за мяжой альбо — яшчэ горш — патрабаваннямі неадкладнага звароту тых ці іншых тэрыторый, што вельмі нагадвае той самы шавінізм, толькі са сваёй нацыянальнай афарбоўкай.

І тут дарэчы было б параіць удзельнікам такіх дыскусій прыслухацца да голасу Васіля Быкава: ніякіх тэрытарыяльных прэтэнзій да суседзяў, ніякіх памежных спрэчак, бо ўсё гэта працуе не на нашу галоўную ідэю, а разбурае яе.

Такім чынам, масавае праяўленне шавінізму, канфрантацыйнай псіхалогіі з'яўляецца небяспечным само па сабе, якімі б матывамі — эканамічнымі, сацыяльнымі, нацыянальнымі — яно ні абгрунтоўвалася. Але не меншую занепакоенасць выклікае і тое, калі на аб'ектыўных цяжкасцях і незадаволенасці людзей спрабуюць спекуляваць не проста прыхільнікі аднаўлення дзяржаўнасці (хай то ў форме былой федэрацыі саюзных рэспублік ці былой імперыі), а людзі, усур'ёз заклапочаныя тым, каб паміж Беларуссю і Расіяй зніклі ўсялякія межы і адрозненні, людзі, якім вельмі даспадобы абвешчаны яшчэ Аляксандрам III прынцып "Расія існуе толькі для рускіх", якія настойліва імкнуцца надаць свайму руху арганізаваны пачатак, стварыць нейкія структуры і ячэйкі, прыцягнуць у свае шэрагі маладых, не прайшоўшых выпрабавання жыццём людзей.

МЕСІЯНСКАЕ ПРЫЗНАЧЭННЕ СЛАВЯНСКАЙ ІДЭІ

Відавочна, што і ў гэтай справе беларускія прыхільнікі рускай ідэі не вылучаюцца якойсьці арыгінальнасцю ці творчымі пошукамі. Тут таксама назіраецца прамая пераемнасць са сваімі гістарычнымі папярэднікамі, выкарыстанне вопыту сучасных расійскіх манархістаў і славянафілаў.

Як вядома, тэарэтычным падмуркам таго ж "западно-руссизма" была тэорыя аб асаблівай "абранасці" Расіі, як носьбіта ўсёратуючай ідэі славянства. Альбо, кажучы інакш, перанесеная на расійскі грунт ідэя Гегеля аб "абранасці" нямецкай нацыі. Што прынесла спроба рэалізацыі гэтай ідэі, зведалі на сабе дзесяткі мільёнаў ахвяр фашысцкай агрэсіі, у тым ліку і самі немцы. У дарэвалюцыйнай Расіі тэорыяй "абранасці" кіраваўся ў сваёй дзейнасці па бязлітасным вынішчэнні "крамолы", арганізацыі яўрэйскіх пагромаў чарнасоценны "Саюз рускага народа", у праграме якога ясна і адназначна запісана, што рускай народнасці, якая стварыла вялікую і магутную дзяржаву, належыць першынствуючае значэнне ў дзяржаўным жыцці і ў дзяржаўным будаўніцтве. Ну, а ад бальшавіцкага разумення "абранасці" дагэтуль крываточаць раны на целе і рускага, і ўсіх іншых народаў былога СССР і былога сацыялістычнага лагера.

Прымаючы па сутнасці ўсе тэарэтычныя пастулаты славянафільства, сучасныя прыхільнікі гэтай ідэі "дапоўнілі" іх некаторымі сацыялістычнымі дамінантамі дзяржаўнасці (напрыклад, грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці), а галоўнае — паставілі ў цэнтр увагі барацьбу з пагрозай "мондиализма" — нейкай сусветнай глабальнай ідэалогіі, на аснове якой, маўляў, ажыццяўляецца "сусветная змова" з мэтай стварэння сусветнага ўрада і ў рэчышча якой цудоўна ўкладваецца развал СССР. Праз "Политический собеседник" яны на поўным сур'ёзе папярэджваюць людзей, што "мондиализм" уяўляе рэальную пагрозу не толькі нацыянальнай самабытнасці Беларусі, але і нашаму выжыванню як народа. На такім фоне ні аб якой сапраўднай незалежнасці рэспублікі, на іх думку, не можа быць і гаворкі, гэта ўсяго толькі капітуляцыя на амерыканскіх умовах, таму асабліва недарэчнымі і смешнымі выглядаюць "нашы дзіцячыя гульні ў суверэнітэт".

Такі падыход знайшоў нагляднае ўвасабленне, скажам, у апублікаванай газетай "Политика. Позиция. Прогноз" "Дэкларацыі аб стварэнні Усебеларускага Славянскага Сабору". Тут катэгарычна сцвярджаецца, што нейкія варожыя наднацыянальныя сілы развязалі этнічны, культурны і фізічны генацыд супраць славянскіх народаў, спрабуюць нанесці рашаючы ўдар шляхам падагравання сепаратызму, раз'яднання беларусаў, рускіх і ўкраінцаў — "галоўнай апоры ўсяго славянскага свету", "станавога хрыбта унікальнай еўразійскай цывілізацыі". Адсюль, на думку аўтараў, і вынікае месіянская роля Беларусі, Расіі і Украіны, яднанне якіх толькі і зможа забяспечыць "сумеснае дзяржаўнае быццё ўсіх народаў былога Савецкага Саюза". А гэта, пагадзіцеся, той жа самы

дух "абранасці", тая ж славянска-імперская ідэя "триединой России — всея, Великия, и Малыя, и Белыя".

Да і наогул, амаль усе ствараемыя занава і існуючыя раней у Беларусі аб'яднанні "славянска-патрыятычнай" накіраванасці па сутнасці з'яўляюцца філіяламі ці аддзяленнямі аналагічных расійскіх альбо міжнародных арганізацый. А па вялікім рахунку, дык іх нават цяжка назваць стабільнымі арганізацыямі, хутчэй — гэта невялікія групоўкі людзей, якія пераносяць на беларускі грунт метады работы шавіністычных расійскіх рухаў, "сабораў", партый. І хоць большасць з іх афіцыйна не зарэгістраваны і амаль нікому невядомы, але шуму, можна сказаць, ствараюць шмат.

Пры наўнасці вельмі нязначных адрозненняў, квінтэсенцыяй задач усіх падобных аб'яднанняў з'яўляюцца пабудова адзінай магутнай дзяржавы, процідзеянне "варожым славянству сілам", стварэнне неабходных геапалітычных умоў і жыццёвай прасторы для ажыццяўлення свайго месіянскага прызначэння.

Узяць, напрыклад, Беларускае прадстаўніцтва міжнароднай арганізацыі "Славянскі Сабор". Яно "арганізуе" ў Мінску выязныя пасяджэнні Думы Сабора, распаўсюджвае праз масавыя выданні сумніцельныя высновы ананімных маскоўскіх акадэмікаў аб сучасным генацыдзе славян, прычына якога — "у сіёна-масонскай змове" (як быццам не ведаюць аб знішчэнні дзесяткаў мільёнаў сваіх братоў-славян мясцовымі сталінска-берыеўскімі сатрапамі). Адсюль і накірунак галоўнага ўдару — барацьба супраць сіёна-амерыканскага капіталу, што, маўляў, імкнецца знішчыць славян як ніжэйшую расу, асіміляваць народы, перасяліць, скажам, частку прыбалтаў, палякаў і беларусаў на Захад, на іх месца — в'етнамцаў, немцаў і яўрэяў, а на пустуючыя пладародныя землі Расіі — таджыкаў (?). Адсюль і падтрымка прынятых у Маскве на нечарговым з'ездзе Сабора заклікаў да стварэння славянскіх абшчын, атрадаў самаабароны, падрыхтоўкі да правядзення перавыбараў органаў кіравання на месцах і прэзідэнтаў краін — членаў СНД.

Нешта падобнае прапагандуюць і тыя, хто адносіць сябе да народна-праваслаўнага Саюза "Белая Россия". Сумесна з "саборнікамі" яны патрабуюць ад Вярхоўнага Савета Беларусі неадкладнага абмеркавання пытання аб уз'яднанні з Беларуссю "спрадвечных беларускіх і ўсходнеславянскіх зямель" у Літве і Латвіі, арганізуюць пікеты з тэрытарыяльнымі патрабаваннямі ў час візітаў кіраўнікоў названых дзяржаў.

Найбольшую актыўнасць праяўляюць у Беларусі пярвічныя арганізацыі "Ліберальна-дэмакратычнай партыі Савецкага Саюза" пад кіраўніцтвам пана Жырыноўскага. Гэта ён засведчыў яшчэ ў сваім выступленні па Беларускім тэлебачанні, калі растлумачваў народу "новую канцэпцыю развіцця краіны", сутнасць якой зводзіцца да некалькіх простых ісцін: усе так званыя "незалежныя" рэспублікі будуць ліквідаваны і на іх месцы ўтворацы губерні; усе

арганізатары развалу Саюза будуць пасаджаны ў турму, усе палітычныя партыі левай арыентацыі і іх друкаваныя органы будуць забаронены.

Да самага апошняга агнявога рубяжа змагаліся за ленінска-сталінскі Саюз лідэры былой Камуністычнай партыі Беларусі. Яшчэ ўчора выступаючы — пад націскам няўмольнага поступу жыцця — за незалежнасць КПБ ад КПСС і падтрымку суверэнітэту рэспублікі, яны сёння адкрыта ствараюць камітэты па адраджэнні той жа партыі, аднаўляюць у ёй сваё членства па закліку Маскоўскага (?) абкома і нават паведамляюць праз рэспубліканскую прэсу аб існаванні Гродзенскага падпольнага абкома і яго кіпучай дзейнасці па падрыхтоўцы да XXIX з'езда забароненай КПСС. У свае саюзнікі і партнёры ПКБ выбрала рэгіянальныя аддзяленні "Усесаюзнай" рабоча-сялянскай сацыялістычнай партыі і нінаандрэеўскай ВКП(б), члены якой на ўстаноўчай канферэнцыі ў Мінску калектыўна выпрацоўвалі рэкамендацыі аб рашучым спыненні "контррэвалюцыйнай вакханаліі", нейтралізацыі "самага натуральнага класавага ворага" і пераможным завяршэнні гэтай барацьбы ў ходзе прамога ваеннага супраціўлення. А ўдзельнікі больш шырокага фарміравання — "Рух за дэмакратыю, сацыяльны прагрэс і справядлівасць" (ДСПС) у сваіх афіцыйных заявах, рэзалюцыях мітынгаў і зваротах з зайздроснай паслядоўнасцю гавораць аб неканстытуцыйнасці СНД, аб тым, што яго стварэннем завяршыўся правы, буржуазна-"дэмакратычны" пераварот, а рашэнне "правіцеляў" Расіі, Украіны і Беларусі па спыненні дзеяння Дагавору 1922 года з'яўляецца выкананнем сацыяльнага заказу міжнароднай фінансавай алігархіі па расчляненні, эканамічным і палітычным закабаленні магутнай дзяржавы,

"Патрыятызм", які дапускае адмаўленне павагі і любові да сваёй культуры, мовы, да роднай зямлі дзеля захавання старых і новых утопій аб Вялікай Расіі, Вялікай Савецкай Айчыне, можа прывесці да непажаданай канфрантацыі паміж народамі, да самагубства. Урэшце, важкае слова тут павінен сказаць Закон. У ім дакладна вызначаны адносіны да палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў і асоб, якія выступаюць супраць нацыянальнай дзяржаўнасці Рэспублікі Беларусь, маюць на мэце гвалтоўную змену канстытуцыйнага ладу, прапаведуюць ідэі нецярпімасці і варожасці ў міжнацыянальных адносінах.

("Літаратура і мастацтва", 19 чэрвеня 1992 г.)

СІНДРОМ БЕЛАРУСАФОБІІ

Гэтая сацыяльная "хвароба" была і застаецца галоўнай перашкодай на шляху нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. А перашкод такіх сапраўды шмат. Гэта і свядомае процідзеянне адраджэнскім працэсам з боку дэнацыяналізаваных работнікаў апарату, кіраўнікоў вытворчасці і розных псеўдарыначных структур. Гэта і ліхаманкавае стварэнне нейкіх каардынацыйных камітэтаў і "народных рухаў" з ліку разнамасных палітычных груповак, адзіных хіба што ў сваім імкненні аднавіць "вялікі і магутны Савецкі Саюз" і прыдаць анафеме ўсіх рупліўцаў на ніве беларушчыны, нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Гэта і істэрычныя спробы ўвядзення, насуперак закону, афіцыйнага двухмоўя, спынення беларусізацыі ў школах, ВНУ, на прадпрыемствах і ў дзяржустановах. Нарэшце, гэта тая злосная кампанія парламентарыяў, пісьменнікаў, вучоных і журналістаў, якая разгарнулася ў неабалышавіцкіх выданнях і сваім зместам вельмі нагадвае "знішчальныя" ўдары па "нацдэмакратызму" і "буржуазнаму рэстаўратарству" ў трагічныя для беларускага народа 30-я гады.

СТРАХ І БОЯЗЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Наогул, сярод пэўнай часткі нашых грамадзян усё прыкметней праяўляюцца разнастайныя сімптомы непрыняцця самой ідэі і адмаўлення самога факта існавання незалежнай Беларусі, нецярпімасці, а ў шэрагу выпадкаў і адкрытай варожасці да беларускасці, нацыянальна ўсвядомленых рашэнняў і дзеянняў. А ўзятыя разам, у сваёй сукупнасці, гэтыя сімптомы сведчаць аб новай успышцы застарэлай "хваробы" беларусафобіі, якая для сучасных "рэстаўратараў" савецкай імперыі становіцца такой жа неад'емнай часткай свядомасці, як і юдафобія, прыбалтафобія, армянафобія, грузінафобія і г.д.

Сапраўды, колькі нянавісці і зла, колькі страху яшчэ зусім нядаўна выклікалі ў гэтых людзей свабодалюбівыя імкненні прыбалтыйскіх народаў, іх самаадданасць у барацьбе за аднаўленне незалежнасці! Як не хацелася і не хочацца ім бачыць свабоднымі і незалежнымі дзяржавамі Украіну, Малдову, Грузію, Арменію! На якія толькі авантуры і хітрыкі не спрабуюць ісці сёння расійскія апазіцыянеры, каб зноў запрэгчы ў адны аглоблі ўсе былыя рэспублікі-калоніі, неадкладна вярнуць Расіі ролю метраполіі ці "старэйшага брата". Ну, а што датычыць юдафобіі, то яна наогул стала казырнай картай неабальшавікоў і славянафілаў — ва ўсіх цяжкасцях і няшчасцях вінаваціць не саміх сябе, а нейкіх ворагаў — іншародцаў і жыдамасонаў, у любых нацыянальна-дэмакратычных актах і дзеяннях бачыць вынік нейкай сусветнай змовы і падкопы агентаў міжнароднага сіянізму.

Усе гэтыя віды "фобіі" дыялектычна ўзаемазвязаны, дапаўняюць адзін

другога, уяўляючы нешта ўпаўне цэласнае, комплекснае і часта пераходзяць у своеасаблівы псіхічны стан страху, боязі чаго-небудзь альбо каго-небудзь, актыўнага процідзеяння чаму-небудзь ці каму-небудзь. І ў дадзеным выпадку пад тэрмінам "беларусафобія" мы разумеем зусім не боязь і нянавісць да другога чалавека, скажам, да канкрэтнага беларуса ці жыхара Беларусі, якія развіваюцца альбо маглі б узнікнуць у асобных людзей пры некаторых формах псіхозу. Мы вядзём гаворку пра сацыяльную паталогію, пра тую сацыяльна-палітычную ідэалогію і практыку (заходнерусізм, сталінізм, шавінізм), якая заўсёды адмаўляла і адмаўляе беларускай нацыі ў яе праве на самастойнае палітычнае і культурнае развіццё, не давала і не дае ёй магчымасці раскрыць свой стваральна-творчы патэнцыял, з гонарам увайсці ў агульначалавечую сям'ю народаў.

Боязь самастойнасці і незалежнасці сваёй Айчыны абавязкова суправаджаецца і непрызнаннем такога права за іншымі народамі былога дзяржаўна-імперскага ўтварэння на адной шостай частцы зямной сушы. А гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да своеасаблівай раздвоенасці асобы, калі яна, жывучы, скажам, у незалежнай і ўжо прызнанай усім сусветным супольніцтвам Рэспубліцы Беларусь, адначасова жыве і ў створаным ёю свеце ілюзій, дзе па-ранейшаму "існуюць" СССР і БССР, КПСС і КПБ, УЛКСМ і ЛКСМБ, Савецкая Армія і ЧБВА... І калі б такая раздвоенасць стала вынікам якіх-небудзь рэальных змяненняў у свядомасці чалавека, то гэта было б яшчэ паўбяды. Галоўнае ж заключаецца ў тым, што яна ёсць адлюстраванне свядомых дзеянняў зацікаўленых палітычных сіл па псіхалагічнай апрацоўцы мас альбо проста няздольнасць ці нежаданне некаторых людзей вызваліцца ад палітыка-ідэалагічных стэрэатыпаў.

Дзе ж глыбінныя вытокі так моцна ўзросшай "актыўнасці" людзей з падобнай арыентацыяй? Ці здольныя яны, абапіраючыся на нацыянальны нігілізм і пасіўнасць значнай часткі беларускага грамадства, затармазіць альбо адцягнуць аб'ектыўна наспеўшыя працэсы нацыянальнага адраджэння і сацыяльнага прагрэсу? Каб адказаць на гэтыя пытанні, варта перагартаць найбольш драматычныя старонкі нашай мінуўшчыны, прааналізаваць перадумовы і вынікі дэнацыяналізацыі Беларусі на розных гістарычных этапах яе развіцця, прасачыць пераемнасць і ўзаемасувязь гэтага працэсу з сучаснымі высілкамі па "контрбеларусізацыі", адмаўленню нацыянальных каштоўнасцей, і перш за ўсё такой з іх, як суверэнітэт і свабода выбару народам уласнага шляху развіцця.

ГВАЛТ НАД ДУШОЮ НАРОДА

Беларусь заўсёды была арэнай барацьбы за авалодванне ёю паміж рознымі нацыянальна-дзяржаўнымі ўтварэннямі, рознымі палітычнымі сіламі і ідэалогіямі. Гэтая барацьба аказвала негатыўнае, а ў большасці выпадкаў разбуральнае ўздзеянне на фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці

беларусаў, іх разуменне непаўторнасці і самабытнасці сваёй нацыянальнай культуры і мовы, усведамленне сваёй чалавечай годнасці.

Гвалт, прымус, здзекі — найбольш характэрныя прыкметы той вялікай трагедыі народнага духу, якая была вечным спадарожнікам і сутнасцю такога змагання. А пачалося яно яшчэ ў X—XI стст., калі Беларусь аказалася паміж дзвюма варожымі кірункамі прынятага славянамі хрысціянства, калі вызначальнай рысай яе гісторыі была жорсткая барацьба паміж кіеўскімі (рускімі) і полацкімі (беларускімі) князямі.

Уплывы з усходу і захаду, па вобразным выразе Ігната Абдзіраловіча (Канчэўскага), круцілі і гвалцілі душу беларуса, прымушаючы яго ўбачыць, што ў чужой скуры заўсёды дрэнна, што трэба вытварыць нешта сваё, роднае, блізкае, арганічнае. І сярод нашых суайчыннікаў нават у самыя змрочныя часы знаходзіліся людзі з такім разуменнем жыцця, прычым іх колькасць значна ўзрастала ў перыяды больш-менш спрыяльных умоў для развіцця нацыянальнага пачатку альбо інтэнсіўнага, паскоранага засваення айчыннага і сусветнага вопыту. Так сталася, напрыклад, у перыяд першага па-сапраўднаму беларускага адраджэння, якое супала з эпохай еўрапейскага Рэнесансу і было цесна звязана з навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасцю Францішка Скарыны, яго шматлікіх паслядоўнікаў і пераемнікаў, якія заклалі падмурак нашага гуманізму і талерантнасці, высокай духоўнасці і нацыянальнай самасвядомасці.

Пасля аб'яднання ў 1569 годзе Польскага Каралеўства і Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, у якім беларусы мелі ўсе магчымасці для поўнага і ўсебаковага самавыражэння, культурная сітуацыя, мякка кажучы, змянілася яўна не на іх карысць. Абвешчаны ўладамі Рэчы Паспалітай прынцып "Адна дзяржава — адзін народ" прывёў да ліквідацыі шэрагу існаваўшых у Княстве дэмакратычных інстытутаў, згортвання і летаргіі ўсяго беларускага нацыянальнага жыцця.

Паступова, але няўхільна пачала скарачацца сфера ўжывання беларускай мовы, многія адміністрацыйныя пасады займалі часцей за ўсё палякі альбо прадстаўнікі акаталічанай беларускай шляхты, вышэйшага і сярэдняга слою беларускага дваранства. Яны нярэдка вельмі ганебна, пагардліва адносіліся да беларускай мовы і самі першыя адмаўляліся ад яе на карысць польскай. А неўзабаве мова беларускага народа была поўнасцю выцеснена са справаводства дзяржаўных органаў і судоў, з навучальных устаноў, выдавецкай справы, літаратуры. Значна спрыяў паскарэнню працэсаў паланізацыі на Беларусі і часам насільны, гвалтоўны перавод праваслаўнага насельніцтва краю ў каталіцкае веравызнанне. Саміх жа беларусаў у той час не лічылі самастойным этнасам, а ўсяго толькі "галіной" польскай народнасці.

Дзеля справядлівасці, аднак, трэба заўважыць, што "пальшчызна" і тады, і ў будучым прынесла непараўнальна менш страт для нашай Айчыны, чым яе наступныя дачыненні з усходнім суседам. Змагаючыся супраць працэсу апа-

лячвання, беларускі народ працягваў захоўваць сваю нацыянальную самабытнасць аж да канца XVIII стагоддзя, калі Беларусь пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай была далучана да Расійскай імперыі. Шэсць вякоў самастойнага дзяржаўнага існавання і два стагоддзі сумеснага пражывання з Польшчай зрабілі жыццё Беларусі настолькі своеасаблівым і настолькі адрозным ад Расіі, што руская ўлада натуральна адчувала сябе тут чужаніцай. Свае самабытныя законы, дэмакратычныя органы кіравання, неразвітасць абшчынных пачаткаў у землеўладанні, моцна развіты гандаль, знешнія сувязі, свая адметная мова, свае звычаі, вераванні, абрады рабілі жыццё нашага краю поўным свайго ўнутранага зместу.

А ўсё гэта ў комплексе і складала нацыянальны твар народа, яго нацыянальную сутнасць і, як адзначаў Аляксандр Цвікевіч, канчаткова выдзяляла Беларусь ад шэрагу звычайных правінцый Расійскай імперыі, рабіла яе іншародным целам у дзяржаве, пастаянна раздражняла ўладу, напружвала яе ўвагу і палохала. Вось чаму цэнтралісцкая Расія не магла прымірыцца з такой з'явай і ўвесь час імкнулася нівеліраваць усе асаблівасці Беларусі, падвесці яе пад агульны ранжыр. Вось чаму і пачалася гістарычная барацьба паміж народам і ўладай, якая вялася царызмам адначасова на Украіне, у Польшчы, Фінляндыі, на Каўказе.

Барацьба гэтая з боку ўлад і была адкрытым, а нярэдка замаскіраваным праяўленнем дзяржаўнай беларусафобіі і, зразумела, украінафобіі, палонафобіі і г.д. Асабліва адчувальны ўдар па самабытнай культуры, самасвядомасці беларусаў быў нанесены пасля задушэння паўстання 1863—64 гг., калі стала ажыццяўляцца палітыка планамернай русіфікацыі "Северо-Западного края", а мясцовыя ўлады пад камандай генерал-губернатара Мураўёва пачалі "восстановлять русскую народность", нішчачы ўсё, што не было падобным да маскоўскага і велікарускага.

Частка гарадской інтэлігенцыі, выхаваная у традыцыях, непрыхільных да беларускай культуры, са звычайнай недружалюбнасцю адносілася да нацыянальна-культурнага руху, была актыўным і няўрымслівым правадніком палітыкі свядомага падаўлення яго яшчэ нязначных і кволых парасткаў. Таму зусім не дзіўна, напрыклад, што ў настаўніцкіх семінарыях і інстытутах, якія былі па сутнасці адмысловымі школкамі абрусення і муштравання сялянскіх дзяцей на добрых праваднікоў расійскай абрусіцельнай палітыкі на Беларусі, "усё роднае, мясцовае, беларускае зневажалася і тапталася ў гразь" (Я.Лёсік).

У той жа час антыбеларускія сілы як бы ў процівагу нацыяльным арганізацыям і партыям пачалі аб'ядноўвацца ў свае ўласныя таварыствы з вядомай заходнерускай арыентацыяй, наладзілі выпуск шэрагу шавіністычных выданняў, такіх, як "Россия", "Голос Москвы", "Окраины России", якія лічылі Беларусь спрадвечна рускім краем і вялі на сваіх старонках барацьбу супраць усялякіх "сепаратысцкіх" імкненняў, пад якімі разумеліся фактычна любыя

(нават нязначныя) праявы нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў.

Ідэалагічнай асновай дзейнасці гэтых палітычных аб'яднанняў і перыядычных выданняў быў так званы заходнерусізм, які адмаўляў Беларусі ў праве на самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, а беларусам пакідаў права толькі на "этнаграфічнае прызнанне". Гэта значыць, за імі прызнавалася права на мясцовы "дыялект", на народную песню, народную вопратку, наогул, на вясковы быт, бо вышэйшае развіццё нацыянальнай культуры, маўляў, азначала б "расшчапленне" адзінай расійскай культуры і палітычны сепаратызм. Такая "перакананасць" грунтавалася на тэорыі аб асаблівай "абранасці" Расіі, на жаданні адгарадзіцца ад Еўропы з яе капіталізмам і "праклятым духам рэвалюцыі — якабінствам", на разуменні мясцовага двараніна-славянафіла, што яго ратунак у "голубом мундире" імператара, што штык і нагайка ўсерасійскага гарадавога ёсць найлепшая гарантыя яго ад усялякіх сацыяльных узрушэнняў. Не дарма за сваю вернасць цару і прастолу, процідзеянне беларускаму "сепаратызму", развалу і гібелі "вялікай" імперыі, дыскрэдытацыю беларускай дэмакратычнай грамадскасці і беларускай прэсы, пісьменнікаў і публіцыстаў "заходне-русы" былі прыняты і аблашчаны ўладамі, заслужылі адабрэнне і пахвалу з боку актыўных праваднікоў палітыкі русіфікацыі і вялікадзяржаўнага шавінізму.

СТАЛІНСКІ ТЭРОР І "КОНТРБЕЛАРУСІЗАЦЫЯ"

Задыхаючыся ў ціскach непрыхільнай нацыянальнай улады і цярпліва несучы цяжар гісторыі, беларускі народ моўчкі чакаў часу свайго ўваскросу. І перадавыя яго прадстаўнікі не ўпусцілі шанц выкарыстаць такую магчымасць ва ўмовах, калі на руінах Аўстра-Венгерскай манархіі пачалі стварацца самастойныя славянскія дзяржавы і стала відавочна, што і ў самой Расійскай імперыі народы павінны будуць уладкоўваць сваё жыццё не на пачатках насілля і прымусу, а на прынцыпах пагаднення адзін з другім і прызнання ўзаемных інтарэсаў. Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года, якая ўрэшце рэшт растрэсла самадзяржаўную імперыю на ўсе яе састаўныя часткі, і абвешчаных у кастрычніку таго ж года ідэй аб'яднання людзей на прынцыпах роўнасці і дэмакратыі яны зрабілі рашучыя крокі па ажыўленні дзейнасці нацыянальна-патрыятычных арганізацый, падтрымцы незатухаючага стагоддзямі ўнутранага агню творчай нацыянальнай энергіі.

25 сакавіка 1918 года была створана свая нацыянальная дзяржаўнасць у выглядзе Беларускай Народнай Рэспублікі, якая ў хуткім часе атрымала афіцыйнае прызнанне на міжнароднай арэне. Такім быў заканамерны ход гісторыі і, як зазначыў Аляксандр Цвікевіч, не з цэнтра, не ад Петраграда ці Масквы атрымала Беларусь хартыю сваёй вольнасці — яна напісала яе сама, падпарадкоўваючыся розуму часу, тым запаветам, якія дадзены былі яе папярэдняй барацьбой. Але лёс распарадзіўся так, што незалежная БНР праіснавала

нядоўга, бо праз дзевяць месяцаў бальшавікі абвясцілі аб утварэнні сваёй "контрдзяржавы" — Беларускай ССР. А затым, пасля далучэння ўсходнебеларускіх зямель да РСФСР і падпісання ў 1921 годзе грабежніцкага Рыжскага дагавору, Беларусь наогул страціла значную частку сваёй этнічнай тэрыторыі і вымушана была весці нацыянальна-дзяржаўнае і культурнае будаўніцтва ў межах шасці паветаў былой Мінскай губерні, дзе пражывала ўсяго паўтара мільёна чалавек з прыкладна дванаццаці мільёнаў грамадзян ліквідаванай БНР.

Зразумела, уздым нацыянальнай свядомасці беларусаў, развіццё іх культуры з'яўляюцца складанымі, але надта неабходнымі і неадкладнымі задачамі. І добра, што гэта зразумелі некаторыя кіраўнікі новаўтворанай БССР, якія падтрымалі ідэю правядзення ўсебаковай беларусізацыі, паднялі яе да ўзроўню агульнадзяржаўнай палітыкі. Яе ажыццяўленне дазволіла хутка сфарміраваць нацыянальную сістэму народнай адукацыі, уключаючы вышэйшую школу, сродкі масавай інфармацыі і кнігавыдавецкую справу, актывізаваць удзел беларусаў у палітычным, культурным і гаспадарчым жыцці і — галоўнае — паступова пераадольваць шырока распаўсюджаную практыку насаджэння "больш высокай" рускай культуры, а значыць, замацавання панавання велікарускай нацыянальнасці.

Былі створаны спрыяльныя ўмовы для развіцця культур небеларускага насельніцтва рэспублікі. Пэўная частка людзей (як гэта нярэдка адбываецца і цяпер) выказвала рэзка адмоўныя адносіны да беларусізацыі, разглядала яе як "справу групы фанатыкаў", "прымусовае абеларушванне" і не хавала сваёй непрыязнасці да беларускай мовы, створанай быццам з "усялякіх выразаных са слоўнікаў слоў", у чым наглядна можна было распазнаць сімптомы той жа самай "хваробы" беларусафобіі.

Але найбольш цяжкай, бадай, крытычнай стадыі дадзенае сацыяльнае "захворванне" дасягнула крыху пазней — у канцы 1920-х — пачатку 1930-х гадоў, з усталяваннем таталітарнага рэжыму і ажыццяўленнем на практыцы сталінскай нацыянальнай палітыкі. Яна была, па сутнасці, відавочнай формай генацыду, для якой характэрна пэўная накіраванасць — супраць нясучых канструкцый народнасці і культуры этнасу. Сведчаннем гэтага з'яўляецца той факт, што ў Беларусі барацьба супраць "варожых элементаў" і "контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму" вялася перш за ўсё па нацыянальнай прыкмеце і свядома вынішчалася ўсё аўтэнтычна-беларускае. А сярод рэпрэсаваных, як сведчаць спецыяльныя дследаванні, пераважную большасць складалі менавіта беларусы. Напрыклад, у ліку 90 асуджаных па "справе" аб так званым "Саюзе вызвалення Беларусі" ў 1931 годзе было 89 беларусаў і адзін рускі, ды і той у анкеце запісаўся беларусам. Сярод іх былі наркамы, акадэмікі, многія вядомыя пісьменнікі. Тых, хто яшчэ пісаў па-беларуску, размаўляў ці карыстаўся ў сваёй дзейнасці роднай мовай, абвінавачвалі ў "нацдэмаўшчыне" і высылалі з Беларусі, знішчалі фізічна. Балючы ўдар па беларускай мове быў нанесены

сумнавядомай пастановай СНК БССР "Аб зменах і спрашчэннях беларускага правапісу" ад 25 жніўня 1933 г., у адпаведнасці з якой адбылося наўмыснае, штучнае скажэнне лексічных і граматычных нормаў роднай мовы, у выніку чаго яна значна наблізілася да "вялікай" рускай мовы. Яскравымі прыкладамі ўсебаковай "контрбеларусізацыі" з'явіліся скарачэнне колькасці беларускамоўных школ, народных дамоў, хатаў-чытальняў, ліквідацыя нацыянальных сельсаветаў, змяншэнне выдання беларускіх кніг, газет. Адбываліся замена беларусаў на кіруючых пасадах пераважна рускімі, перавод справаводства розных устаноў на рускую мову.

Новая, яшчэ больш моцная ў параўнанні з папярэдняй, хваля сталінскага тэрору на Беларусі нахлынула ў канцы 30-х гадоў. Тады агенты НКУС сфабрыкавалі справу аб існаванні на Беларусі быццам бы "аб'яднанага антысавецкага падполля, нацыянал-фашысцкай арганізацыі" на чале з кіраўнікамі рэспублікі А.Чарвяковым, М.Галадзедам і М.Гікалам. Членаў гэтай "арганізацыі" (як раней і "СБ") абвінавачвалі ў здрадніцтве і шпіянажы на карысць буржуазных дзяржаў, а таксама ў антысавецкай нацыяналістычнай агітацыі, у садзейнічанні рэстаўрацыі капіталізму, аддзяленню БССР ад Савецкага Саюза. (Характэрна, што менавіта ў такіх "грахах" неабальшавікі абвінавачваюць сёння кіраўнікоў Рэспублікі Беларусь, "перафарбаваўшыхся" апаратчыкаў і сучасных "нацыянал-дэмакратаў"). Былі арыштаваны каля сотні членаў Саюза пісьменнікаў БССР, палавіна з якіх загінула ў турмах і лагерах ГУЛАГа. "Буйным цэнтрам шпіёнска-разведвальнай работы" аб'яўлялася ўся Акадэмія навук Беларусі. Жорсткім праследаванням падвяргаліся і іншыя катэгорыі беларускага насельніцтва (настаўніцкая інтэлігенцыя, самыя гаспадарлівыя сяляне, рабочыя). А ў выніку бязлітаснага, "массовидного" (выраз Леніна) тэрору ў Беларусі былі закатаваны альбо прайшлі праз горан энкавэдзісцкіх "чысцілішчаў" сотні тысяч ні ў чым не вінаватых людзей, амаль поўнасцю знішчана нацыянальная інтэлігенцыя.

Бессэнсоўная, непатрэбная жорсткасць тэрору была, мабыць, своеасаблівай формай агоніі сталінскай тыраніі і праяўленнем духоўнага крызісу тых, хто сам чагосьці баяўся і не вельмі ўпэўнена адчуваў сябе сярод звычайных людзей-працаўнікоў. Праўда, у гэты ж час і па другі бок савецка-польскай мяжы — у Заходняй Беларусі — таксама прыкладваліся актыўныя намаганні па дэнацыяналізацыі карэннага насельніцтва. Але драматызм сітуацыі быў у тым, што аднаўленне тэрытарыяльнага адзінства заходніх абласцей з Савецкай Беларуссю, якое адбылося ў верасні 1939 года, суправаджалася непараўнальна больш жорсткімі і вытанчанымі рэпрэсіямі, фізічным вынішчэннем інтэлігенцыі, кіраўніцтва нацыянальна-дэмакратычных і нават камуністычных арганізацый. Тысячы простых, далёкіх ад ідэалогіі і палітыкі працаўнікоў былі кінуты за краты па абвінавачанні ў "контррэвалюцыйнай дзейнасці".

Дарэчы, усё гэта нам добра вядома па "справе" нашага бацькі і дзядулі

Фёдара Ігнатавіча Дубянецкага — звычайнага селяніна з палескай вёскі, які быў арыштаваны органамі НКУС у лістападзе 1940 года і абвінавачваўся ў "злачынствах", прадугледжаных артыкуламі 72 (антысавецкая агітацыя і прапаганда) і 74 (удзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі) Крымінальнага кодэкса БССР, а дакладней — у агітацыі сярод аднавяскоўцаў супраць савецкай улады і выбараў у Саветы, ва ўдзеле ў нейкім невядомым яму "саюзе рэзервістаў" і інш. І мы ганарымся тым, што на ўсіх турэмных допытах (зняволенне было спынена вайной) ён катэгарычна адхіліў гэтыя выдуманыя абвінавачанні, а зусім нядаўна намі атрымана афіцыйная даведка з Камітэта дзяржбяспекі Рэспублікі Беларусь аб тым, што пры пасляваенным пераглядзе "справы" яго прызналі невінаватым.

Кансалідацыі беларускай нацыі і адраджэнню яе культуры, інтэлектуальнага патэнцыялу не дапамагла і перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, на алтар якой Беларусь аддала кожнага чацвёртага свайго жыхара. Прычынай сталася ўсё тая ж сталінская рэпрэсіўная машына, тая ж паталагічная боязь нацыянальнага самавызначэння, усяго нацыянальна-спецыфічнага. Яны і ляглі ў аснову новага шырокамаштабнага эксперыменту па дэнацыяналізацыі беларускага грамадства, які суправаджаўся "укреплением" кіруючых кадраў рэспублікі за кошт "передвиженцев" галоўным чынам з унутраных і ўсходніх абласцей РСФСР, прымусовай русіфікацыяй сістэмы народнай адукацыі, дээтнізацыяй гарадскога і сельскага насельніцтва.

Такія фактары стваралі спрыяльныя ўмовы і адпаведнае асяроддзе для ўзмацнення асімілятарскіх тэндэнцый, разбурэння нацыянальнай культуры і адміністрацыйнага ўвядзення двухмоўя ў рэспубліцы. А ў той час двухмоўе ў разліках бюракратыі, як адзначаў Зянон Пазьняк, было метадам націску на нацыянальную культуру, сродкам падрыву яе адзінага кансалідуючага пачатку, "раззбраення" перад тварам асіміляцыі ў інтарэсах адзінай бюракратычнай дзяржавы. Сфармуляваны яшчэ пяць гадоў таму назад у артыкуле "Двухмоўе і бюракратыя", гэты вывад захоўвае сваю сілу і сёння, бо тыя адчайныя высілкі па наданні рускай мове статуса дзяржаўнай якраз і скіраваны на недапушчэнне росту нацыянальнай самасвядомасці як лепшай гарантыі захавання суверэнітэту нацыі, на працяг асімілятарскай лініі ў надзеі на хуткае аднаўленне ўжо існуючай імперыі.

Далейшае аслабленне патэнцыялу нацыянальнай культуры, зніжэнне ўзроўню нацыянальнага самаўсведамлення працягвалася і ў перыяд "застою", і ў гады так званай "перабудовы". Небывалыя маштабы дэнацыяналізацыі на працягу 1960—80-х гг. прывялі да размывання ў значнай часткі людзей менталітэту, развіцця так званага комплексу непаўнацэннасці, сораму за родную мову, за сваё паходжанне. Ды і не магло быць інакш, калі ў рэспубліцы не засталося практычна ніводнай беларускамоўнай школы ці беларускамоўнага дзіцячага садка, і рускае аднамоўе, а не дэкларованае двухмоўе, панавала ва ўсіх

універсітэтах, інстытутах, тэхнікумах і прафтэхвучылішчах, ва ўсіх установах і на прадпрыемствах. Калі тыражы рускамоўных газет прыкладна ў дзесяць разоў перавышалі адпаведныя лічбы для беларускай прэсы, а па колькасці выданняў на нацыянальнай мове Беларусь займала апошняе месца сярод усіх рэспублік былога СССР. Калі амаль поўнасцю зрусіфікаванымі аказаліся навука, мастацкая культура, грамадска-палітычнае жыццё і іншыя сферы.

АДОЛЕЦЬ БЯДУ

Вось такая яна, разнастайная і шматколерная беларусафобія — непрыязнасць да самастойнасці і незалежнасці Беларусі, да свабоднага выяўлення нацыянальнага духу яе сыноў і дачок. І яе рухаючымі спружынамі, стымулятарамі з'яўляюцца не радавыя людзі, а канкрэтныя сацыяльна-палітычныя інстытуты, якія ў сваёй дзейнасці кіруюцца канкрэтнымі нацыянальна-дзяржаўнымі ўстаноўкамі і мэтамі.

Тым больш не вінаватыя ў беларусафобіі тыя ці іншыя народы, да прыкладу, рускі народ, які і сам быў па сутнасці ахвярай таталітарнай сістэмы і не падзяляў канцэпцый прымусовай русіфікацыі альбо рускамоўнага "інтэрнацыяналізму". Ды і прагрэсіўная руская культура, да якой з вялікай павагай заўсёды ставіўся беларускі народ, не мела нічога агульнага з нацыянальна-шавіністычнымі імкненнямі ўладных структур у мінулым, як не мае яна нічога агульнага і з дзейнасцю сучаснай парламенцкай апазіцыі і самазванага "фронту нацыянальнага выратавання".

Нацыянальны нігілізм, нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці ёсць "самая цяжкая спадчына, якую пакінулі нам і царызм, і дзесяцігоддзі панавання бальшавіцкай дыктатуры. І гэтую бяду нам трэба адолець — абавязкова і ў першую чаргу" (Н.Гілевіч). Яны сталі адным з асноўных вынікаў дзяржаўна-бюракратычнай беларусафобіі і сёння вельмі энергічна выкарыстоўваюцца сіламі, якія хацелі б павярнуць кола гісторыі назад. Але, як сведчыць тая ж гісторыя, на Беларусі заўсёды былі людзі, якія імкнуліся захаваць адметныя рысы культуры, нацыянальных традыцый і звычаяў і прыкладвалі свядомыя намаганні, каб дапамагчы хутчэйшаму выхаду сваёй Айчыны са стану нацыянальнага і палітычнага анабіёзу. Такія намаганні ў якасці своеасаблівага прафілактычнага сродку ігралі (і яшчэ могуць адыграць) дадатную ролю ў ахове грамадства ад гістарычнага манкурцтва і нацыянальнага самаадмаўлення.

З гонарам неслі і нясуць эстафету сваіх папярэднікаў-класікаў, змагароў за беларушчыну І.Мележ, Ул.Караткевіч, В.Быкаў, Я.Брыль, С.Грахоўскі, П.Панчанка, Р.Барадулін і іншыя майстры слова, нацыянальна-патрыятычная і гуманістычная накіраванасць творчасці якіх вызначала ўнутраную сутнасць і духоўны змест сапраўднай, а не бюракратычна-элітарнай беларускай культуры, уводзіла яе ў агульнаеўрапейскі і агульначалавечы культурны абарот. І гэта нягледзячы на тое, што творы некаторых з іх дзесяцігоддзямі забараняліся, падвяргаліся цэнзуры, выкідваліся з тэматычных планаў, а часам нават "рассыпаліся" ў друкарнях ужо ў набраным выглядзе. Шмат зрабілі для аднаўлення гістарычнай памяці народа, збліжэння і ўзаемапаразумення паміж людзьмі

розных нацыянальнасцей некаторыя дзеячы тэатральнага і выяўленчага мастацтва.

Асаблівай павагі заслугоўваюць прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, якія ў канцы 80-х гадоў уступілі ў адкрытую барацьбу з дзяржаўна-асімілятарскай палітыкай і практыкай і ў сваіх шматлікіх зваротах у ЦК КПСС і ЦК КПБ, у выступленнях на пленумах творчых саюзаў (замоўчваемых афіцыйнай прапагандай) паказвалі трагічныя вынікі дэнацыяналізацыі ў рэспубліцы, прапаноўвалі канкрэтныя меры па ўзнаўленні разбуранай інфраструктуры і дэфармаванага зместу беларускай культуры. Не прайшлі дарэмна смелыя захады і творчыя ініцыятывы па адраджэнні нацыянальных традыцый і духоўных каштоўнасцей, з якімі выступілі ў той час маладзёжныя "нефармальныя" аб'яднанні "Талака", "Паходня", "Тутэйшыя", а таксама такія аб'яднанні старэйшага пакалення нацыянальнай інтэлігенцыі, як "Мартыралог Беларусі", "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны" і іншыя.

У своеасаблівы каардынацыйны цэнтр па аб'яднанні ўсіх нацыянальна свядомых творчых сіл ператварыўся ў тыя пераломныя гады штотыднёвік "Літаратура і мастацтва", які і сёння застаецца, можна сказаць, флагманам сярод перыядычных выданняў у барацьбе за беларушчыну, нацыянальную самасвядомасць і духоўнае аднаўленне і які таксама, як і тады, падвяргаецца масіраваным нападкам з боку прыхільнікаў саюзна-імперскай ідэалогіі і практыкі.

Несумненным з'яўляецца той факт, што галоўную ролю ў псіхалагічнай падрыхтоўцы грамадства да ўспрымання ідэй суверэнітэту і нацыянальна-культурнага адраджэння адыграў Беларускі народны фронт "Адраджэньне". Яго палітычная дзейнасць, парламенцкія ініцыятывы па распрацоўцы і абароне ідэй незалежнасці дапамагаюць стварыць грунтоўную прававую аснову, перадумовы і гарантыі сапраўды свабоднага эканамічнага, палітычнага і духоўнага развіцця беларускай нацыі, яе вяртання ў сям'ю еўрапейскіх народаў і агульначалавечую супольнасць. Было б вельмі добра, калі б і парламенцкая большасць, і выканаўчыя структуры ўлады, і розныя палітычныя партыі і рухі нарэшце ўсвядомілі жыццёвую неабходнасць і незваротнасць новага нацыянальна-дзяржаўнага Адраджэння і сумесна дамагаліся ўмацавання свайго нацыянальнага дома і згоды ў ім, развіцця ў кожнага грамадзяніна пачуцця нацыянальнага гонару, асабістага дачынення да лёсу сваёй Айчыны.

Становіцца відавочным, што многія нашы суайчыннікі ўжо адчулі сябе беларусамі, зразумелі, што ў нас ёсць што адраджаць, ёсць свае самабытныя традыцыі і гістарычны вопыт. Адраджаючы гэтыя традыцыі, мы, па словах кіраўніка нашай дзяржавы Станіслава Шушкевіча, перастаём прытрымлівацца тых звычаяў, якія не падыходзяць нашай зямлі, але для таго, каб Беларусь стала сапраўды свабоднай і незалежнай, трэба добра і доўга працаваць. І менавіта ў гэтым нам бачыцца дзейсны сродак "выздараўлення" ад яшчэ даволі жывучай, цяжка пераадольваемай і небяспечнай "хваробы" беларусафобіі, рэальнага ўвасаблення стваральна-творчага патэнцыялу беларускага народа.

("Літаратура і мастацтва", 12 сакавіка 1993 года)

ЦЯЖКІ ШЛЯХ ДА АДРАДЖЭННЯ

Наша Бацькаўшчына перажывае цяпер вельмі важны і складаны этап свайго новага нацыянальнага адраджэння, пераадольвае цяжкія вынікі ранейшай татальнай дэнацыяналізацыі ўсіх сфер жыццядзейнасці грамадства. Створаны аб'ектыўныя перадумовы і магчымасці для свабоднага, незалежнага развіцця беларускай нацыі, яе вяртання ў сям'ю еўрапейскіх народаў і ў агульначалавечую супольнасць. Яны грунтуюцца на абвешчанай Вярхоўным Саветам Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь, прынятых у адпаведнасці з ёю законах аб мовах, аб адукацыі, культуры і інш.

Аднак, нягледзячы на неадкладную, лёсавырашальную неабходнасць сённяшняга адраджэння, на яго шляху паўстаюць шматлікія перашкоды, у асноўным палітычнага і ідэалагічнага характару. Зноў, як і ў мінулыя часы, моцна загучалі галасы з патрабаваннямі афіцыйнага двухмоўя, спынення альбо запаволення тэмпаў беларусізацыі. Зацягваецца стварэнне сапраўды нацыянальнай сістэмы навучання і выхавання, функцыянавання сродкаў масавай інфармацыі, усёй інфраструктуры культуры. Пад выглядам нейкіх самазваных "каардынацыйных камітэтаў" і "народных рухаў" на авансцэну па сутнасці выступіў альянс палітычных сіл, якія адмаўляюць саму ідэю і сам факт існавання незалежнай Беларусі, суверэннае права яе народа на самавызначэнне і свабоду выбару ўласнага шляху развіцця. Нацыянальна-культурнае адраджэнне і строгі ўлік нацыянальных інтарэсаў яшчэ не сталі прыярытэтам практычнай дзейнасці некаторых дзяржаўных устаноў і грамадска-палітычных арганізацый.

Каб зразумець прычыны і глыбінныя вытокі ўзнікаючых цяжкасцей і перашкод, матывы ўзросшай "актыўнасці" людзей, мякка кажучы, ненацыянальнай арыентацыі, варта прааналізаваць перадумовы і вынікі дэнацыяналізацыі Беларусі на розных гістарычных этапах яе развіцця, прасачыць пераемнасць і дыялектычную ўзаемасувязь гэтага працэсу з сучаснымі высілкамі па "контрбеларусізацыі", аднаўленні "вялікай і непадзельнай Расіі", альбо "Саюза непарушнага рэспублік свабодных".

У ЦІСКАХ ПРЫМУСОВАЙ АСІМІЛЯЦЫІ

Прыхільнікам беларушчыны ва ўсе часы даводзілася змагацца за адраджэнне Радзімы ў асабліва неспрыяльных варунках, пры моцным процідзеянні асімілятараў шматлікіх накірункаў і пазіцый. Ажыццяўляемая імі палітыка прымусовай асіміляцыі і уніфікацыі суправаджалася заняпадам нацыянальнай культуры, дэфармацыямі менталітэту і самасвядомасці беларускай нацыі, аслабленнем механізму яе самазахавання і выжывання як самастойнага этнасу. Таму і ўся духоўная гісторыя нашага народа, як вобразна зазначыў Уладзімір Конан, разглядаецца не як простая, узыходная лінія бесперапыннага прагрэсу,

а як лінія ломаная, з крутымі спадамі і такімі ж пад'ёмамі, зігзагамі і паваротамі назад.

Як састаўная частка гэтай гісторыі беларуская нацыянальная культура таксама прайшла складаны і супярэчлівы шлях свайго развіцця, які характарызуецца чаргаваннем перыядаў амаль поўнага заняпаду і больш-менш працяглых стадый духоўнага ўдасканалення і актыўнага засваення прагрэсіўнага культурнага вопыту іншых народаў. Пэўныя адраджэнскія рысы, напрыклад, былі характэрны яшчэ для старабеларускай культуры XI—XII стст., у часы росквіту Полацкага і Турава-Пінскага княстваў, а таксама для наступнай трохсотгадовай эпохі, калі завяршылася станаўленне беларускага народа, старабеларускай мовы, этнасу, сялянска-народных форм культуры. Але асабліва бачна прыкметы першага сапраўды беларускага адраджэння праявіліся ў пачатку XVI ст. і былі звязаны з навукова-асветніцкай дзейнасцю Францішка Скарыны і яго паслядоўнікаў, з агульным нацыянальна-культурным уздымам і адраджэнскімі працэсамі ў Еўропе. У той час актыўна арганізоўваліся беларускія брацтвы, закладваліся друкарні, адкрываліся школы з даволі шырокай праграмай (у некаторых з іх выкладалася пяць моў), узнікалі вышэйшыя навучальныя ўстановы. Узрастаў інтарэс да культурна-філасофскіх каштоўнасцей, узмацняліся мецэнацкія тэндэнцыі, шырока распаўсюджваліся ідэі гуманізму і рэфармацыі, ішло станаўленне беларускай мовы, нацыянальнай пісьменнасці, літаратуры, мастацтва. "Усё гэта, узятае разам, — падкрэсліваў Максім Багданаовіч у сваім артыкуле "Беларускае адраджэнне", — вылучала Беларусь на адно з першых месцаў сярод культурнага славянства, ставячы яе далёка наперадзе Маскоўшчыны — тагачаснай славянскай глушы, якая жывілася, як чужаедная расліна, духоўнымі сокамі Белай Русі".

Найбольш прыкметныя вынікі ў справе нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі былі дасягнуты пасля ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху ў другой палове XIX ст. і ў пачатку XX ст. Асновай для ажыўлення гэтага працэсу з'явілася станаўленне новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы, якое вызначалася творчасцю Я.Чачота, Я.Баршчэўскага, У.Сыракомлі, А.Рыпінскага, В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, М.Багдановіча, Я.Купалы, Я.Коласа, А.Пашкевіч (Цёткі) і іншых пісьменнікаў. У гэты перыяд сфармаваліся асновы лексікі, фанетыкі, марфалогіі, сінтаксісу і стылістычная разнастайнасць беларускай літаратурнай мовы, была створана арыгінальная эстэтыка, якая ўвасабляласа ў фальклоры, прыкладным і пластычным мастацтве, у народнай філасофіі.

Паміж гэтым, можна сказаць, другім гістарычным этапам нацыянальнага адраджэння і гуманістычным адраджэннем XVI — першай паловы XVII ст. ляжаў працяглы перыяд нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту, запаволенага развіцця і пераадолення вялікіх перашкод у станаўленні нацыянальнай культуры і самасвядомасці беларусаў. Розныя формы процідзеяння адраджэнскім тэн-

дэнцыям існавалі і ў іншыя эпохі. Шмат вякоў беларусы, па словах Ігната Абдзіраловіча (Канчэўскага), вялі змаганне з чужынскімі варожымі ўплывамі за сваю душу, за магчымасць стварыць свае, арганічныя, беларускія формы жыцця.

Так, у чэрвені 1569 г. у Любліне быў падпісаны "Заключны Акт аб уніі", які ўвайшоў у гісторыю як Люблінская унія. У выніку адбылося аб'яднанне Польскага Каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (у склад якога ўваходзіла тэрыторыя Беларусі) і ўтворана так званая Рэч Паспалітая. Як бы ў процівагу былому спрыяльнаму для нацыянальнага развіцця беларусаў становішчу гэты акт забараняў правядзенне ў Княстве соймаў, ліквідаваў дэмакратычны вялікакняскі Статут, што фактычна азначала пачатак палітыкі поўнай паланізацыі Беларусі. Польскія каралі дзейнічалі ў адпаведнасці з абвешчаным імі прынцыпам "Адна дзяржава — адзін народ", маючы на ўвазе, што ўсё насельніцтва Рэчы Паспалітай павінна лічыцца польскім, а Беларусь — яе неад'емнай часткай, правінцыяй.

У 1697 г. была прынята спецыяльная пастанова, якая канчаткова забараняла выкарыстанне беларускай мовы і афіцыйна замацавала палажэнне аб тым, што ў справаводстве дзяржаўных органаў і судоў усе рашэнні павінны рыхтавацца на польскай мове. Неўзабаве мова беларускага народа была поўнасцю выцеснена з навучальных устаноў, выдавецкай справы, літаратуры. Працягваўся перавод значнай часткі праваслаўнага насельніцтва ў каталіцкае веравызнанне. Даволі хутка дэнацыяналізаваўся вышэйшы і сярэдні слой беларускага дваранства, а затым і прадстаўнікі дробнай шляхты і гарадскога мяшчанства.

Новы віток прымусовай асіміляцыі, падгонкі ўжо пад агульнарускі ранжыр пачаўся ў канцы XVIII ст., калі пасля трох падзелаў магутнай у мінулым Рэчы Паспалітай Беларусь была ўключана ў склад Расійскай імперыі і стала разглядацца яе ўладамі як "исконно русская" тэрыторыя, "окраина" Расіі. У лютым 1839 г. была ліквідавана унія, якая праіснавала на Беларусі амаль два з паловаю стагоддзі. Знішчалася царкоўная літаратура на беларускай мове, праследавалася публікацыя беларускіх мастацкіх твораў, на рускую мову перакладаліся справаводства і навучанне. Амаль адначасова быў скасаваны Статут Вялікага Княства Літоўскага і ўведзены ў дзеянне законы Расійскай імперыі.

Магутны ўдар па нацыянальнай самасвядомасці, маральна-духоўным абліччы беларускага народа быў нанесены ў сярэдзіне — другой палове XIX ст., асабліва пасля задушэння паўстання 1863—64 гг. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. У першую чаргу гэта было звязана з актыўнай дзейнасцю генерал-губернатара Мураўёва-"Вешальніка" па "восстановлению русской народности", вынішчэнню ўсяго, што не было падобна да маскоўскага і велікарускага. Гэта і засяленне Беларусі "велікарасійскімі падданымі" і сялянамі з унутраных губерняў Расіі, продаж расійцам канфіскаваных і секвестраваных зямель, ства-

рэнне на Беларусі калоній са звольненых салдатаў, дэнацыяналізацыя значнай часткі насельніцтва ў гарадах і мястэчках. Гэта і своеасаблівая апрацоўка свядомасці "галавы народа" — яго інтэлігенцыі, людзей асветы, якія з цягам часу "адышлі ад некультурнага, забітага паншчынай беларуса-мужыка і зліліся з інтэлігенцыяй альбо Польшчы, альбо Вялікарасіі" (У.Ігнатоўскі).

У такіх варунках поўнай дэнацыяналізацыі падверглася і сістэма адукацыі. Было зачынена каля двухсот уніяцкіх манастыроў і цэркваў, пры якіх тады найбольш і мясцілася беларуская асвета, шмат іншых мясцовых школ. Непрыхільна сустрэў народ стварэнне на Беларусі расійскіх школ. Па вобразным выразе Язэпа Лёсіка, у той час мацеркі крыжам лажыліся на парозе, каб не пусціць дзяцей у расійскую школу, а іх бацькі наймалі сваіх настаўнікаў граматы ды вучылі дзяцей па хатах на роднай мове. (Не ў прыклад, скажам, сучасным рагачоўскім "патрыёткам", якія на ўсю рэспублікі пракрычалі: "Не пустим детей в белорусскую школу". — "Народная газета", 1992, 9 чэрвеня). Да 1900 г. усе школы без выключэння — а ўсяго іх у Беларусі налічвалася каля васьмі тысяч — былі расійскімі з выкладаннем на рускай мове. Беларускіх школ — з выкладаннем на беларускай мове — не было зусім, бо і сама беларускай мова была забаронена.

Адмысловымі школкамі абрусення былі ў той час і настаўніцкія семінарыі і інстытуты, у якіх па сутнасці не вучылі, а муштравалі сялянскіх дзяцей на добрых праваднікоў расійскай абрусіцельнай палітыкі, а ўсё роднае, мясцовае, беларускае зневажалася і тапталася ў гразь. Мабыць, гэты "вопыт" прыйшоўся даспадобы тым сённяшнім выкладчыкам Віцебскага педінстытута, якія накіравалі калектыўны пратэст у маскоўскую "Правду" супраць беларусізацыі працэсу навучання і выхавання.

Шматлікія прыцясненні і здзекі, яўнае ці скрытае глумленне над мовай і літаратурай, доўгатэрміновая двайная дэнацыяналізацыя, безумоўна, значна дэфармавалі, сказілі менталітэт беларусаў, але не змаглі поўнасцю вытравіць іх душу, зрабіць іх "истинно русскими" альбо палякамі. Да прыкладу, у тых жа самых сялянскіх дзяцей, перапакутаваўшых сваё зневажэнне ў русіфікатарскіх школах і цярпеўшых затым нацыянальны здзек на заработках на чужыне і дома ў гарадах, пачыналі абуджацца нацыянальная свядомасць і разуменне неабходнасці нацыянальна-культурнага адраджэння Айчыны.

З вялікімі цяжкасцямі на Беларусі фармавалася і сталела свая нацыянальная інтэлігенцыя, якая і распачала ў канцы XIX — пачатку XX ст. актыўную працу па арганізацыі шырокіх і дзейсных асяродкаў беларушчыны і пошуку найбольш прымальных шляхоў развіцця Беларусі. Пачалі ўзнікаць беларускія нацыянальна-палітычныя арганізацыі і партыі (напрыклад, Беларуская Сацыялістычная Грамада), былі заснаваны першыя легальныя беларускамоўныя выданні "Наша доля" і "Наша ніва".

У той жа час значную актыўнасць сталі праяўляць і антыбеларускія,

шавіністычныя арганізацыі, такія, як Рускае ўскраіннае таварыства, Беларускае таварыства, Саюз беларускай дэмакратыі, Беларускі народны камітэт, якія, зыходзячы з так званай тэорыі "западно-руссизма", не лічылі Беларусь краінай з асобнай нацыянальнай культурай і таму не прызнавалі яе права на самастойнае культурнае і палітычнае развіццё. У выніку названыя арганізацыі і партыі сталі састаўной часткай сістэмы ваяўнічага расійскага нацыяналізму, а за сваю вернасць цару і прастолу, процідзеянне беларускаму "сепаратызму", развалу і гібелі "вялікай імперыі" яны заслужылі адабрэнне і пахвалу з боку рэакцыі, якая ў 1905—1907 гг. задушыла рэвалюцыю ў крыві вісельных распраў і катаржных прысудаў.

"КОНТРБЕЛАРУСІЗАЦЫЯ" 30—80-х ГАДОЎ І ЯЕ ТРАГІЧНЫЯ ВЫНІКІ

Як вядома, ва ўмовах, калі на руінах Аўтра-Венгерскай манархіі пачалі стварацца самастойныя славянскія дзяржавы, калі лютаўская рэвалюцыя і бальшавіцкі пераварот 1917 г. у Расіі прывялі да распаду самадзяржаўнай імперыі і фармальнага абвяшчэння ідэй справядлівасці і роўнасці людзей, беларуская грамадскасць вярнулася да сваёй спрадвечнай мары — адраджэння нацыянальнай культуры і самавядомасці народа. Лагічным завяршэннем гэтых мэтанакіраваных намаганняў і захадаў стала ўтварэнне 25 сакавіка 1918 г. сваёй нацыянальнай дзяржаўнасці ў выглядзе Беларускай Народнай Рэспублікі, незалежнасць і вольнасць якой абвяшчалася трэцяй Устаўной Граматай. Як бы насуперак гэтаму дзяржаўнаму акту праз дзевяць месяцаў (1 студзеня 1919 г.) у Смаленску бальшавікі абвясцілі ўтварэнне Беларускай ССР.

Адным са сродкаў дасягнення мэтаў нацыянальнага адраджэння стала ў тыя гады агульнадзяржаўная палітыка беларусізацыі, якая афіцыйна пачала праводзіцца з ліпеня 1924 г. Важным вынікам ажыццяўлення гэтай палітыкі з'явілася стварэнне нацыянальнай сістэмы народнай адукацыі, уключаючы вышэйшую школу. У 1926—27 навучальным годзе, напрыклад, працоўныя школы БССР, апрача нядаўна далучанай Гомельшчыны, былі беларусізаваны на сто працэнтаў, прафесійныя — на 60,2 працэнта, тэхнікумы — на 62 працэнты, ВНУ — на 17,5 працэнта. Ва ўсіх школах нацыянальных меншасцяў беларуская мова з'яўлялася абавязковым прадметам, як мова большасці насельніцтва Беларусі, а расійская мова як асноўная мова Саюза ССР. Акрамя таго, ствараліся нацыянальныя сельсаветы, хаты-чытальні, выдаваліся кнігі, газеты на розных мовах і г. д.

На жаль, гісторыя распарадзілася так, што гэты дабратворны працэс кансалідацыі беларускага народа і адраджэння яго культуры быў гвалтоўна перарваны. У Савецкім Саюзе, у тым ліку і ў Беларусі, усталяваўся сталінскі таталітарны рэжым, былі ліквідаваны рэшткі рынкавых адносін і свабоднага

прадпрымальніцтва, якія складалі сацыяльна-эканамічную базу нацыянальнага адраджэння і развіцця. Давалі свой "плён" і сталінская палітыка "аўтанамізацыі", якая па сутнасці адмаўляла беларускай нацыі ў яе праве на самавызначэнне, і насаджала розныя псеўданавуковыя канцэпцыі аб адміранні нацыянальных культур, зліцці народаў і нацый у адзінае сусветнае брацтва. Да таго ж пэўная частка дэнацыяналізаваных элементаў адносілася рэзка адмоўна, агрэсіўна да беларусізацыі.

Разгарнуліся бязлітасны тэрор, праследаванні нацыянальнай інтэлігенцыі, лепшых прадстаўнікоў рабочага класа, сялянства, іншых сацыяльных слаёў і груп насельніцтва. Апагеем гэтай шырокамаштабнай кампаніі "контрбеларусізацыі", барацьбы з "беларускім буржуазным нацыянал-дэмакратызмам" стала справа аб так званым "Саюзе вызвалення Беларусі" (СВБ), па якой у 1930 г. было арыштавана 108 чалавек, у тым ліку народныя камісары, акадэмікі, вядомыя пісьменнікі. Кіраўніком Саюза быў аб'яўлены былы прэм'ер-міністр БНР, акадэмік АН БССР Вацлаў Ластоўскі, якога паўторна арыштавалі ў 1937 г. і расстралялі як "агента польскай разведкі і ўдзельніка нацыянал-фашысцкай арганізацыі" ў студзені 1938 г. Былі асуджаны і расстраляны альбо кінуты ў канцлагеры, высланы ў аддаленыя раёны краіны і іншыя "айцы-стваральнікі" БССР, якія падтрымалі палітыку ўсебаковай беларусізацыі.

У 1937 г. агенты НКУС сфабрыкавалі "справу" аб існаванні на Беларусі быццам бы "аб'яднанага антысавецкага падполля, нацыянал-фашысцкай арганізацыі" на чале з кіраўнікамі рэспублікі А.Чарвяковым, М.Галадзедам і М.Гікала. Членаў гэтай "арганізацыі" (як раней і "СВБ") абвінавачвалі ў жаданні рэстаўрацыі капіталізму, аддзялення Беларусі ад СССР, шпіянажы на карысць буржуазных дзяржаў і шмат у чым іншым. Масавых чыстак і рэпрэсій не пазбегла і сама рэспубліканская камуністычная арганізацыя — КП(б)Б, якая страціла звыш 40 працэнтаў сваіх членаў.

У тыя ж гады было арыштавана каля 90 членаў Саюза пісьменнікаў БССР, з якіх больш як 50 загінулі ў лагерах і турмах ГУЛАГа. Дастаткова назваць толькі некалькі прозвішчаў расстраляных у канцы 30-х гг., каб зразумець, што рэпрэсіўная машына была скіравана перш за ўсё супраць лепшых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, "цвету" нацыі. Сярод іх М.Гарэцкі, М.Чарот, У.Галубок, А.Дудар, М.Зарэцкі, П.Галавач і многія іншыя таленавітыя пісьменнікі, росквіт творчасці якіх пачаўся якраз у гады беларусізацыі.

У адной з дакладных запісак на адрас ЦК КПБ(б) і НКУС БССР буйным цэнтрам шпіёнска-разведвальнай работы аб'яўлялася ўся Акадэмія навук Беларусі, а многіх вучоных было прапанавана арыштаваць альбо неадкладна звольніць з акадэмічных пасад. У выніку АН БССР страціла каля 140 найбольш таленавітых і кваліфікаваных вучоных, дзве трэці з якіх складалі беларусы; з 60 расстраляных супрацоўнікаў Акадэміі беларусаў было 76 працэнтаў, яўрэяў 13 працэнтаў і столькі ж прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў.

Шмат пісалі тады і аб "злосным шкодніцтве контррэвалюцыйнай часткі" інжынерна-тэхнічнай і агранамічнай інтэлігенцыі, а таксама аб тым, што ў гады нэпа ў вышэйшую школу дзяржавы пралетарскай дыктатуры глыбока пранікла ўздзеянне буржуазнай прафесуры, грунтоўна нашпігаванай ідэалогіяй буржуазнага рэстаўратарства. Ішло масавае скарачэнне колькасці беларускамоўных школ, народных дамоў, хатаў-чытальняў, выдання беларускіх кніг і газет. Былі ліквідаваны нацыянальныя сельсаветы, ажыццяўляліся іншыя мерапрыемствы па русіфікацыі культурнага і грамадскага жыцця рэспублікі.

Каб надаць сваім антынацыянальным дзеянням хоць нейкі афіцыйна-законны выгляд, уладныя стрыктуры распрацоўвалі і прымалі адпаведныя рэзалюцыі, пастановы аб небяспецы мясцовага нацыяналізму, аб нацыяналістычных арганізацыях, групах і г. д. Менавіта ў такім кантэксце трэба разглядаць і пастанову СНК БССР "Аб зменах і спрашчэннях беларускага правапісу" ад 25 жніўня 1933 г., у якой адзначалася, што "існуючы правапіс значна засмечаны нацыянал-дэмакратычнымі плынямі і таму падлягае зменам". Іншымі словамі, адбылося наўмыснае, штучнае скажэнне лексічных і граматычных нормаў беларускай мовы, набліжэнне яе да "вялікай" рускай мовы.

Праявы паталагічнай боязі беларускай мовы, культуры значна абвастрыліся ў пасляваенны перыяд. Мясцовыя русіфікатары адразу пачалі яшчэ смялей і хутчэй "набліжаць" беларускі народ ва ўсіх адносінах да свайго "старэйшага брата", падаўляючы ўсё спецыфічна-нацыянальнае, аўтэнтычна-беларускае. На кіруючыя дзяржаўныя, партыйныя і адміністрацыйныя пасады ў Беларусі (паколькі яна, маўляў, была пад акупацыяй) назначаліся і прысылаліся "передвиженцы" з розных абласцей РСФСР, якія не праяўлялі ні малейшага інтарэсу ні да беларускай мовы, ні да культуры.

У гады т.зв. застою Беларусь ахапіў усебаковы глабальны нацыянальна-культурны крызіс, які праяўляўся ў дэградацыі беларускай культуры, мовы, размыванні традыцыйных рысаў беларускага менталітэту, зніжэнні ўзроўню нацыянальнай ідэнтыфікацыі, самаўсведамлення. Паступова ў часткі насельніцтва рэспублікі склаўся даволі ўстойлівы негатыўны стэрэатып успрымання сваіх уласных мовы і культуры, што абумовіла абыякавыя, а нярэдка і яўна нецярпімыя адносіны да іх. У сваю чаргу, гэта стварала спрыяльную глебу для развіцця і ўмацавання ў некаторых беларусаў так званага "комплексу непаўнацэннасці", пачуцця сораму за родную мову, культуру, за сваё паходжанне.

У выніку на працягу 60—80-х гг., ва ўмовах паскоранай урбанізацыі, працэс дэнацыяналізацыі дасягнуў небывалых маштабаў, аб чым пераканаўча сведчаць наступныя факты. Да сярэдзіны 70-х гадоў ва ўсіх гарадах і амаль ва ўсіх райцэнтрах Беларусі не засталося ніводнай беларускамоўнай школы і ніводнага беларускамоўнага дзіцячага сада, а ў сельскай мясцовасці многія школы, якія фармальна лічыліся беларускімі, былі пераведзены на рускую мову.

Была нават уведзена зусім, здавалася б, немагчымая ні ў якой іншай краіне практыка вызвалення школьнікаў ад вывучэння беларускай мовы па жаданні бацькоў альбо па медыцынскай даведцы, у якой было запісана, што дзіця па стану здароўя не можа займацца вывучэннем беларускай мовы. Як быццам для вывучэння, скажам, матэматыкі, хіміі ці англійскай мовы не трэба было "адпаведнае" здароўе?! Дэкларованае двухмоўе поўнасцю адсутнічала ў сістэме вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі, дзе падрыхтоўка кадраў ажыццяўлялася толькі на рускай мове. Па колькасці выпускаемых кніг на нацыянальнай мове Беларусь займала апошняе месца сярод усіх рэспублік былога СССР, а тыражы беларускамоўных газет складалі ўсяго дзесятую частку ад тыражоў аналагічных рускамоўных выданняў..

ВЫРАТАВАЦЬ ГОНАР І ГОДНАСЦЬ НАЦЫІ

З такімі сапраўды трагічнымі вынікамі падышла Беларусь да свайго цяперашняга нацыянальнага адраджэння. Шматвяковае панаванне імперскай ідэалогіі і палітыкі, свядомае вынішчэнне нацыянальнага пачатку прывялі да непапраўных дэфармацый у развіцці грамадства, адмоўна адбіліся на ўзроўні этнічнай самасвядомасці розных катэгорый насельніцтва. "У нас, — адзначаў Васіль Быкаў, — беззваротна панішчана сялянства, гэты традыцыйны асяродак беларускасці, наш рабочы клас робіць толькі першыя няўмелыя спробы ўстаць з каленяў, а наша нацыянальная інтэлігенцыя ў масе сваёй — тыповае ўвасабленне лакейскага канфармізму. Менавіта ў гэтых варунках беларускі народ наблізіўся да краху нацыянальнай культуры і дзяржаўнай эканомікі". І ўсё ж гістарычнае бяспамяцтва, манкурцтва пераважнай большасці грамадства не паўплывала на адчайныя і мужныя спробы нацыянальна свядомай часткі інтэлігенцыі, прадстаўнікоў некаторых іншых слаёў насельніцтва захаваць адметныя рысы культуры, нацыянальных традыцый і звычаяў, выратаваць гонар і годнасць сваёй нацыі.

Праўда, трэба ўлічваць некаторыя спецыфічныя абставіны і грамадскую атмасферу, у якіх пачалі разгортвацца названыя працэсы. Гістарычным фонам для іх сталі правал палітыкі касметычнага рамонту аджылай таталітарнай сістэмы, самадыскрэдытацыя КПСС і яе філіялу — КПБ, якія аказаліся няздольнымі пайсці на карэнныя пераўтварэнні ў грамадстве, а таксама — і гэта галоўнае — маланкавы распад савецкай імперыі пасля жнівеньскага путчу 1991 г. Беларускія ўлады проста былі вымушаны ісці "в ногу с жизнью" і штосьці рабіць для падтрымкі самастойнасці і суверэнітэту рэспублікі.

Але па-сапраўднаму планамерны і мэтанакіраваны характар усёй справе нацыянальна-дзяржаўнага і культурнага адраджэння надала дзейнасць Беларускага народнага фронту "Адраджэньне", устаноўчы з'езд якога адбыўся 25 чэрвеня 1989 г. у Вільні. У Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі

знайшлі адлюстраванне асноўныя палажэнні яго праграмы — аб вяршынстве нацыі ў яе самавызначэнні, аб фактычнай і юрыдычнай прыналежнасці ўсёй дзяржаўнай улады народу, неабходнасці ўтварэння прававой дзяржавы, аб забеспячэнні свабоднага культурнага і духоўнага развіцця беларускай нацыі, захаванні нацыянальных традыцый, гістарычнай сімволікі і інш. Па ініцыятыве парламенцкай апазіцыі БНФ прыняты шэраг канкрэтных законаў і пастаноў, накіраваных на ажыццяўленне чарговых задач дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва, адраджэнне нацыянальнай свядомасці і гістарычнай спадчыны.

Клопатамі аб дасягненні рэспублікай сапраўднай незалежнасці пранікнуты праграмныя дакументы і практычная дзейнасць Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, Беларускай нацыянальна-дэмакратычнай партыі, Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці, Беларускай сялянскай партыі і іншых грамадскіх аб'яднанняў. Яны таксама зыходзяць з таго, што адраджэнне культуры з'яўляецца важнейшай перадумовай кансалідацыі і выжывання беларускай нацыі, выступаюць за яе далейшы прагрэс на аснове сцвярджэння агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.

Лёс нацыянальнага адраджэння Беларусі, яе сацыяльна-палітычнае і культурнае абнаўленне становяцца прадметам даследаванняў некаторых вучоных-гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў, філолагаў, этнографаў і іншых спецыялістаў, асобных творчых калектываў і аб'яднанняў. Усебаковаму аналізу гэтыя праблемы былі падвергнуты, напрыклад, на леташняй Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў Маладзечна на тэму "Фармаванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў". У прынятых канферэнцыяй рэкамендацыях адзначаецца, што ў выніку татальнай русіфікацыі і, часткова, паланізацыі сёння моцна падарваны ўніверсальныя сімвалы самасвядомасці беларусаў, носьбіты іх духоўнасці — родная мова, аўтэнтычны фальклор, традыцыйны нацыянальны лад жыцця, рэлігія.

Адсюль неабходнасць своечасовага і безумоўнага выканання Законаў аб мовах, аб адукацыі, культуры і інш., эканамічнага і духоўнага адраджэння сялянства і беларускай вёскі, ператварэння гарадоў і мястэчак у асяродкі беларускай культуры, істотнага паляпшэння гуманітарнай адукацыі, духоўна-этычнага, рэлігійнага, эстэтычнага і патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі, падтрымкі нацыянальна-культурнага адраджэння ўсіх нацыянальных супольнасцей Беларусі.

Разам з тым, аб'ектыўны працэс нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі, авалодання ёю дасягненнямі сучаснай цывілізацыі, сусветнага культурнага вопыту стрымліваецца пасіўнасцю, касмапалітычнай пазіцыяй, а часам і адкрытай агрэсіўнасцю некаторых надзеленых уладай людзей, грамадска-палітычных аб'яднанняў і рухаў. Сведчаннем гэтага могуць стаць тыя песімістычныя прагнозы наконт незалежнага, самастойнага развіцця беларускай дзяржавы, ускосныя, а часам і прамыя запалохванні нейкім сацыяльным

выбухам, югаслаўскім варыянтам альбо заклікі тыпу "одёрнуть", "призвать к порядку", "отдать под суд" так званых "рэфарматараў-нацыяналістаў", "арганізатараў развалу Саюза", якія нярэдка выходзяць з-пад пяра асобных аўтараў неабальшавіцкіх і псеўдапатрыятычных выданняў, гучаць у некаторых масавых аўдыторыях, на мітынгах і нават на сесіях прадстаўнічых органаў улады.

Паспяхова вырашыць задачы адраджэння Беларусі можна толькі на аснове ўмацавання яе дзяржаўнага суверэнітэту, развіцця ў кожнага грамадзяніна пачуцця нацыянальнага гонару, павагі да іншых народаў і краін свету, асабістага дачынення да лёсу сваёй Айчыны. Але дасягненне гэтых светлых мэт ніколі не давалася лёгка, а таму, па словах беларускага філосафа Сулімы, права на народную зямлю, на сваю Бацькаўшчыну, на сваю мову, культуру, на самавызначэнне, на вольнае развіццё, нацыянальнае аблічча трэба заўсёды падтрымліваць напружанай энергіяй, высокай духоўнай актыўнасцю, як быццам сапраўды кожную часіну заваёўваць нанова. І своеасаблівым сімвалам надзеі і станоўчага зыходу гэтай барацьбы для ўсіх рупліўцаў на ніве нацыянальна-культурнага адраджэння з'яўляюцца прарочыя словы геніяльнага Я.Купалы з верша "Беларушчына" (1908 г.):

І цяпер, хоць прыблудаў даносы
ў ход пушчаны,
Хоць пад права тваё падрываецца
шмат хто, як крот, —
Як жыла і жывеш, будзеш жыць,
Беларушчына!
Зразумеў і успомніў цябе твой
мільённы народ.

("Настаўніцкая газета", 7 ліпеня 1993 г.)

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ХАРАКТАР: СПРОБА ДАСЛЕДАВАННЯ

Нацыянальны характар можна коратка вызначыць як своеасаблівую сукупнасць розных псіхалагічных рысаў і якасцей, уласцівых у той ці іншай меры большасці прадстаўнікоў пэўнай нацыянальнай супольнасці. Асаблівасці нацыянальнага характару прама ці ўскосна адлюстроўваюцца ў найбольш распаўсюджаных рысах паводзінаў, пачуццяў і перажыванняў пераважнай часткі людзей, якія адносяцца да аднаго народа. Пры гэтым варта зазначыць, што нацыянальны характар з'яўляецца досыць устойлівым, стабільным, яго надзвычай цяжка (а часам і немагчыма) змяніць усялякімі адміністрацыйнымі мерамі альбо гвалтоўнымі дзеяннямі. Але, нягледзячы на падобную ўстойлівасць, нацыянальны характар усё ж можа паступова мяняцца, падвяргацца штучным уплывам і разнастайным дэфармацыям.

У навуковай літаратуры існуе некалькі канцэпцый аб сутнасці нацыянальнага характару, сярод якіх асноўнымі можна лічыць біялагічную і сацыяльна-гістарычную. Згодна з першай канцэпцыяй, нацыянальны характар разглядаецца як нешта прыроджанае, абумоўленае генетычна і таму "пераходзячае" з пакалення ў пакаленне. Прадстаўнікі другой канцэпцыі вызначальнымі ў фарміраванні нацыянальных характараў лічаць уплыў сацыяльна-гістарычных, найперш этнакультурных фактараў. На наш погляд, падобныя падыходы (пры ўсёй іх слушнасці) ўсё ж аднабаковыя, бо нацыянальны характар з'яўляецца шматфактарнай з'явай, г. зн. залежнай ад адначасовага ўплыву шматлікіх дэтэрмінант — прыродна-геаграфічных, дэмаграфічных, сацыяльна-палітычных, эканамічных, канфесійных, этнагенетычных, іррацыянальна-містычных і інш.

Грунтоўнае даследаванне нацыянальнага характару прыкметна ўскладняецца тым, што ён неаднолькава можа выяўляцца ў прадстаўнікоў розных сацыяльных пластоў грамадства, полаўзроставых, прафесійна-вытворчых груп людзей, якія належаць да адной нацыянальнай супольнасці. Таму ў некаторых навуковых распрацоўках прынята зыходзіць з метадалагічнай пазіцыі аналізу так званага тыповага члена той ці іншай нацыі, які пэўным чынам нібы сінтэзуе ў сабе ўсе самыя распаўсюджаныя псіхалагічныя рысы пераважнай большасці насельніцтва. Здаецца мэтазгодным выкарыстаць падобны падыход і пры аналізе беларускага характару, тым больш што ў свой час знаўца "народнай душы" У.Караткевіч таксама выкарыстоўваў паняцце "тыповы беларус". Дарэчы, у пачатку XX ст. вядомыя даследчыкі І.Канчэўскі (Абдзіраловіч), Ф.Шантыр, У.Самойла (Суліма), А.Цвікевіч выказвалі асабістыя думкі наконт характару беларусаў, прычым у іх працах ён вызначаўся па-рознаму — "нацыянальная душа", "душа народа" і г.д.

Паколькі кожны нацыянальны характар уяўляе складаную сукупнасць разнастайных (нярэдка супрацьлеглых) псіхалагічных якасцей, то дзеля лепшага ўспрымання можна ўсе рысы псіхалогіі беларусаў умоўна падзяліць на дзве асноўныя групы: станоўчыя, або дадатныя, і адмоўныя, або негатыўныя. Такі падзел з'яўляецца ў значнай меры суб'ектыўным, аднак ён дае магчымасць больш яскрава і дасціпна апісаць тыповыя рысы любога нацыянальнага характару.

ФАРМІРАВАННЕ АСНОЎ БЕЛАРУСКАГА ХАРАКТАРУ

Вытокі складвання адмысловага характару нашых продкаў "сягаюць" у тыя старажытныя часы, калі ў другой палове I тыс. н.э. землі Беларусі пачалі актыўна засяляць славянскія плямёны, якія з цягам часу амаль поўнасцю асімілявалі мясцовае насельніцтва балцкага паходжання. Іншымі словамі, ёсць адпаведныя падставы лічыць, што ў этнагенезе беларусаў немалую ролю адыграў т.зв. балцкі субстрат. Менавіта таму ў асобных псіхалагічных рысах (напрыклад, стрыманасць, вынослівасць і г.д.) беларусы нагадвалі балтаў, найперш літоўцаў. Зразумела, што паколькі аснову беларускага этнасу склалі ўсё ж славянскія плямёны, то і падабенства нацыянальнага характару беларусаў было найбольшым менавіта ў параўнанні з характарамі асобных славянскіх народаў. Тыповымі славянскімі рысамі ў характары беларусаў можна лічыць іх памяркоўнасць, гасціннасць, гуманнасць, а таксама пэўную нерашучасць, недастатковыя актыўнасць, энергічнасць.

Акрамя фактару этнагенезу, на складванне характару беларусаў досыць істотна паўплывала і своеасаблівае мірнае суіснаванне на нашых землях на працягу некалькіх стагоддзяў (найперш маюцца на ўвазе X—XIII стст.) язычніцтва і хрысціянства. Старажытнае язычніцтва за працяглы час яго існавання "выхоўвала" ў людзей такія рысы, як некаторы амаралізм, непасрэднасць выказвання эмоцый і пачуццяў, "адкрытасць" знешняму свету, абвостранае адчуванне непарыўнай еднасці з прыродай. Пашырэнне з II тыс. н.э. хрысціянства з яго маральнымі запаведзямі спрыяла выпрацоўцы ў беларусаў такіх станоўчых якасцей, як гуманнасць, мяккасардэчнасць, памяркоўнасць, паважлівасць у адносінах да блізкіх, старых, дзяцей і інш.

Даволі моцнае ўздзеянне на фармаванне нацыянальнага характару аказвае і прыродна-геаграфічны фактар. Унікальныя асаблівасці прыроды нашай зямлі прыкметна паўплывалі на складванне адмысловага нацыянальнага характару беларусаў. Паколькі Беларусь мае пераважна раўнінны і нізінны рэльеф, то і да беларусаў можна ў поўнай меры аднесці выснову псіхолагаў аб тым, што жыхарам раўнінных тэрыторый, як правіла, уласцівы спакойны, разважлівы характар. Акрамя таго, беларуская прырода пазбаўлена рэзкіх пераходаў ад аднаго рэльефу да другога (звычайна раўніны плаўна пераходзяць ва ўзвышшы і

наадварот), што ў рэшце рэшт прадвызначыла фармаванне чалавека з такім жа "акруглым", ураўнаважаным характарам. Таму ў адрозненне ад многіх горскіх народаў беларусы менш энергічныя, больш стрыманыя і спакойныя.

Варта адзначыць, што жыхары паўднёвых і паўночных раёнаў Беларусі маюць некалькі адрозныя характары, што не ў апошнюю чаргу абумоўлена і рознасцю прыродных умоў у гэтых мясцовасцях. Калі, напрыклад, беларусы з паўночна-ўсходніх зямель (тут у асноўным узгоркавы рэльеф) больш падобныя да расійцаў, то тыя, хто жыве на Палессі з яго раўнінамі, нізінамі і мноствам лясоў, балот, стаяць бліжэй да украінцаў і здаюцца занадта меланхалічнымі, апатычнымі і, мабыць, менш рашучымі, актыўнымі, чым насельнікі поўначы Беларусі.

Як вядома, ва ўсе часы галоўным нашым багаццем былі шматлікія лясы і бары. У мінулыя стагоддзі лясы займалі да 80—90% усёй тэрыторыі, а ў нашы дні яны пакрываюць прыкладна трэць рэспублікі. Таму Беларусь небеспадстаўна можна лічыць сапраўднай лясной краінай, насельніцтва якой з пакалення ў пакаленне, так бы мовіць, нараджалася, працавала, кахала і паміралa пад зялёным покрывам неабсяжных лясоў. Пастаяннае жыццё сярод лясоў, балот і азёраў вымушала беларусаў няспынна і шмат працаваць, пераадольваць разнастайныя цяжкасці і перашкоды, каб пракарміць сябе і сваю сям'ю. Мажліва, досыць моцная біяэнергетыка нашых лясоў абумоўлівала знакамітую жыццястойкасць, вынослівасць, цягавітасць беларусаў. Адноснае багацце флоры і фауны дапамагала вядзенню хатняй гаспадаркі, але ў той жа час патрабавала глыбокіх ведаў аб якасцях жывёл і раслін, спецыфіцы навакольнага асяроддзя, а таксама пэўнай асцярожнасці, гатоўнасці да ўсялякіх нечаканасцей.

Пры высвятленні ўмоў фармавання і развіцця нацыянальнага характару нельга абысціся і без уліку геапалітычнага фактару. Апошні заўсёды накладваў досыць значны адбітак на спецыфіку і дынаміку гістарычнага развіцця нашай Бацькаўшчыны. Справа ў тым, што Беларусь, як гэта было засведчана ў пачатку XX ст. выдатным географам А.Смолічам і ў наш час пераканаўча пацверджана іншымі навукоўцамі, размешчана ў геаграфічным цэнтры Еўропы, які знаходзіцца, дарэчы, якраз у самым "сэрцы" нашай краіны, прыблізна па рацэ Бярэзіне. Менавіта праз тэрыторыю Беларусі праходзіць самы кароткі шлях з Расіі ў Заходнюю Еўропу і наадварот. Да таго ж Беларусь як бы злучае не толькі захад і ўсход, але таксама поўнач і поўдзень. Вядома, што са старажытнасці праз наш край праходзіў і вялікі водны шлях з "варагаў у грэкі", які актыўна выкарыстоўваўся найперш для гандлёвых зносін паміж краінамі.

Іншымі словамі, Беларусь мае дастаткова зручнае геапалітычнае становішча, бо знаходзіцца на своеасаблівым скрыжаванні ўсіх шляхоў паміж чатырма бакамі свету. З аднаго пункту гледжання, гэта, безумоўна, спрыяла пашырэнню міжнароднага гандлю, узаемапранікненню розных этнакультурных, рэлігійных, навуковых традыцый і г.д. Аднак, з другога боку, такое

унікальнае, надзвычай прывабнае становішча Беларусі нярэдка з'яўлялася і прычынай многіх трагічных падзей, складаных выпрабаванняў. У выніку беларускія землі спрадвеку былі жаданай стратэгічнай мэтай, сферай уплыву для больш агрэсіўных суседзяў, служылі арэнай кровапралітных войнаў паміж імі. Таму можна лічыць, што характар беларусаў фармаваўся і загартоўваўся найчасцей у неспрыяльных знешнепалітычных варунках, пад звон мячоў, у амаль несупынным змаганні са шматлікімі захопнікамі (мангола-татарамі, немцамі, шведамі, войскамі Польшчы, Расійскай дзяржавы і інш.). Такая працяглая, зацятая барацьба, адчайная абарона сваёй чалавечай годнасці і незалежнасці, а таксама іншы раз жыццё ва ўмовах эпідэмій і голаду паступова выпрацоўвалі ў беларусаў надзвычайную вынослівасць, мужнасць і цярплівасць. Дарэчы, гатоўнасць нашых продкаў смела абараняць сваю Айчыну адлюстравалася і ў беларускім нацыянальным гербе "Пагоня".

Адну з найбольш істотных роляў у складванні адмысловых нацыянальных характараў заўжды адыгрывае і т.зв. генетычны фактар. Спецыяльныя даследаванні пацвердзілі, што ў кожнай нацыяльнай супольнасці людзей камбінацыя ўсіх генаў унікальная, адрозная ад іншых этнічных груп. Зараз вучоныя небеспадстаўна лічаць, што любы народ мае такі набор генаў, які з'яўляецца найбольш прыдатным для яго, бо менавіта гэты набор забяспечвае жыццяздольнасць і выжыванне народа ў натуральных умовах яго існавання. Якраз уплыў "генаў этнічнасці" ў значнай ступені прадвызначае адрозненні ў характары прадстаўнікоў тых ці іншых нацый (скажам, беларусаў і яўрэяў, французаў, японцаў і г.д.).

Варта дадаць, што найлепшым чынам "агульнанацыянальная генетычная праграма" захоўваецца ў асяродку сельскіх папуляцый, якія ва ўсе часы складалі аснову беларускага этнасу і былі галоўнымі захавальнікамі, носьбітамі старажытных традыцый, звычаяў, матчынай мовы і, нарэшце, нацыянальнага характару, ментальнасці. У абставінах паступовага скарачэння колькасці сельскага і ўзрастання гарадскога насельніцтва (што стала асабліва прыкметным у гады савецкай улады) у беларусаў няўхільна разбураўся іх адметны генафонд, у які ўліваліся новыя, не ўласцівыя ім гены пераважна ад поліэтнічнага насельніцтва гарадоў і мястэчкаў. У выніку сталася так, што ў беларусаў традыцыйны генны "набор" захаваўся найперш у вёсцы, дзе ў мясцовых жыхароў, як кажуць, у крыві закладзены доўгацярплівасць, кансерватыўнасць, памяркоўнасць, вынослівасць і шэраг іншых станоўчых і адмоўных якасцей.

Акрамя ўсіх пералічаных фактараў, таксама досыць прыкметны і неадназначны (прычым пераважна негатыўны, "дэфармуючы") ўплыў на нацыянальны характар беларусаў аказвалі, напрыклад, такія асаблівасці іх гістарычнага развіцця, як даволі працяглая адсутнасць у мінулым сваёй сапраўднай дзяржаўнасці, амаль несупынныя працэсы дэнацыяналізацыі на працягу прыкладна чатырох апошніх стагоддзяў. Адметнасць характару беларусаў надавалі

яшчэ і такія немалаважныя моманты, як канфесійная "разарванасць" беларускага этнасу (праваслаўе, каталіцтва, уніяцтва), адносна нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці нашыў продкаў, запозненае фармаванне і нязначная колькасць уласнай нацыянальнай інтэлігенцыі, а ў савецкі перыяд — ідэалогія і практыка адкрытай ці замаскаванай "контрбеларусізацыі" і штучнай асіміляцыі беларусаў у 1930—80-я гг.

Негатыўныя наступствы падобнай палітыкі ў дачыненні да Беларусі, яе народа прыкметна адчуваюцца і ў наш час, хаця яны ўсё ж паступова, марудна пераадольваюцца. Так, зараз многія беларусы ўжо не саромеюцца, як раней, выказваць свае нацыянальныя пачуцці, размаўляць на роднай мове, не баяцца адкрыта выказваць палітычныя сімпатыі, уласную грамадзянскую пазіцыю і асабістую думку, якія могуць не супадаць з поглядамі "ўладу маючых". Многія людзі ўжо не з'яўляюцца нейкімі "вінцікамі" таталітарнай сістэмы, поўнасцю залежнымі ад волі органаў улады і мясцовага начальства, а таму яны пакрысе вызваляюцца ад такіх "адмоўных" рысаў характару, як празмерны канфармізм, боязь перад "вышэйстаячымі", недастатковыя рашучасць, ініцыятыўнасць і да т.п.

СТАНОЎЧЫЯ РЫСЫ БЕЛАРУСКАЙ ДУШЫ

Адной з найбольш тыповых станоўчых рыс характару беларусаў з'яўляецца, на наш погляд, іх надзвычайная талерантнасць (цярпімасць) да прадстаўнікоў розных нацый, канфесій, да людзей з іншым складам мыслення, светаўспрымання. Прычым гэтая рыса характару была, мажліва, у некаторай ступені закладзена генетычна, але яна ў той жа час выпрацоўвалася гістарычна, у канкрэтных абставінах сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця беларускага этнасу. На пачатковых этапах этнагенезу беларусаў ішла своеасаблівая "прыцірка" розных этнічных і канфесійных супольнасцей, якая суправаджалася натуральнымі ў такіх выпадках праявамі інталерантнасці, хаця апошнія былі адносна рэдкія. У выніку працяглага сумеснага жыцця шматнацыянальнага і поліканфесійнага насельніцтва ў эпоху сярэднявечча (найперш маецца на ўвазе XIV—XVII стст.) на землях Беларусі склалася досыць трывалая сітуацыя этнарэлігійнай і грамадска-палітычнай талерантнасці, чаго нельга сказаць аб становішчы ў тагачаснай Маскоўскай дзяржаве і ў некаторых краінах Заходняй Еўропы.

Пра ўласцівыя беларусам цярпімасць і памяркоўныя адносіны да "іншаземцаў" і "іншаверцаў" можа сведчыць і той факт, што на беларускай зямлі са старажытных часоў да сённяшніх дзён ніколі не было крывавых канфліктаў на нацыянальна-рэлігійнай глебе. Так, ускосным адлюстраваннем талерантнасці нашых далёкіх продкаў можа служыць таксама спакойны, негвалтоўны характар пашырэння хрысціянства з канца X ст. і ў той жа час дастаткова цярпімыя ўзаемадачыненні мясцовых язычнікаў і хрысціян у пачатку II тыс. н.э.

На працягу XIV—XVII стст. на Беларусі ўжо практычна склалася такая поліэтнічная і поліканфесійная структура насельніцтва, якая працягвала захоўвацца і ў далейшым. Менавіта тады на землях Беларусі ўзніклі пасяленні яўрэяў, рускіх, палякаў, татараў і інш., сярод якіх былі распаўсюджаны розныя рэлігійныя вераванні — праваслаўе, каталіцтва, уніяцтва, пратэстантызм, іслам, іудаізм. У канцы XVIII ст., перад далучэннем Беларусі да Расійскай імперыі, канфесійнае становішча ў беларускіх губернях было наступным: уніяты складалі каля 70% ад колькасці ўсіх жыхароў, католікаў было 15%, іудзеяў — 7%, праваслаўных — 6%, а пратэстантаў і іншых — усяго 2%. Пры вельмі стракатым складзе насельніцтва ўзаемаадносіны яго асобных этнічных і рэлігійных груп найчасцей характарызаваліся добрасуседствам, цярпімасцю і прыхільнасцю, а выпадкі непаразуменняў і спрэчак былі адносна нешматлікія.

Якраз на "талерантнай" беларускай зямлі ў эпоху сярэднявечча знаходзілі сабе надзейны прытулак, напрыклад, яўрэі і рускія стараверы (старааброцы), якія ратаваліся ад нацыянальнага і рэлігійнага ўціску ў краінах іх былога пражывання. Падобным перасяленцам у Вялікім Княстве Літоўскім, як правіла, афіцыйна гарантаваліся рэлігійныя свабоды, грамадзянскія правы і нават асобныя прывілеі, што звычайна не выклікала прыкметнага незадавальнення і непрыхільнасці. Міжнацыянальныя і міжканфесійныя кантакты на Беларусі з даўніх часоў вызначаліся дастаткова высокім узроўнем талерантнасці, нягледзячы на тое, што іншы раз мелі месца і некаторыя аб'ектыўныя прычыны для абвастрэння ўзаемаадносін. Да іх, напрыклад, можна аднесці цяжкасці матэрыяльнага становішча, спецыфіку саслоўнай, прафесійнай прыналежнасці кантактуючых груп і да т.п..

У дасавецкі час найбольш шматлікай і згуртаванай этнічнай супольнасцю Беларусі былі яўрэі. Менавіта з імі беларусам прыходзілася найчасцей уступаць у кантакты, побач жыць і працаваць (асабліва ў гарадах і мястэчках). І практычна заўсёды ўзаемаадносіны беларусаў і яўрэяў мелі досыць спакойны характар, былі пазбаўлены варожасці. З гісторыі вядома, бадай, толькі адзіная хваля яўрэйскіх пагромаў, што пракацілася па некаторых гарадах і мястэчках Усходняй Беларусі ў пачатку XX ст., найперш пад час рэвалюцыі 1905—1907 гг., і была арганізавана асобамі чорнасоценнай арыентацыі. Вядомы беларускі пісьменнік З.Бядуля небеспадстаўна сцвярджаў, што наш народ "нічога кепскага не рабіў жыдам". Канешне, невялікія непаразуменні паміж беларусамі і яўрэямі сустракаліся, што было абумоўлена канкрэтнымі з'явамі сумеснага жыцця, этнічнымі стэрэатыпамі, спецыфікай светапогляду і звычаяў двух народаў.

Амаль заўсёднай дружалюбнасцю і ўзаемнай прыхільнасцю вызначаліся, напрыклад, адносіны паміж беларусамі і татарамі, прычым апошнія звычайна добра ведалі беларускія абрады, традыцыі, мову. У гістарычных крыніцах неаднаразова сустракаюцца звесткі аб тым, што лепшымі дарадчыкамі і сябрамі

беларусаў часам былі мясцовыя яўрэі-рамеснікі, а таксама рускія, украінцы, літоўцы і інш.

Аб нацыянальнай і рэлігійнай цярпімасці беларусаў ускосна можна зрабіць выснову і на падставе аналізу іх фальклорных твораў — прыказак, прымавак, песень, казак і інш. Сярод мноства твораў народнай творчасці досыць рэдка (улічваючы надзвычайнае багацце беларускага фальклору) можна знайсці прыклады негатыўных адносін беларусаў да "іншародцаў" ці "іншаверцаў". А калі падобныя выказванні і мелі месца, то яны ў большасці выпадкаў прымалі не пагардліва-варожую, а даволі тактоўную, найчасцей тонка-гумарыстычную форму. Таму асобныя даследчыкі мінуўшчыны нашай Бацькаўшчыны справядліва лічылі, што беларусы не ведаюць нацыянальна-рэлігійнага фанатызму, агрэсіўна-ваяўнічага шавінізму і ўвогуле найчасцей бесканфліктна жывуць з суседзямі розных вераў і нацыяў. У сваёй кнізе "Зямля пад белымі крыламі" Ул.Караткевіч слушна пераконваў, што беларусам заўсёды была прыродна ўласцівая павага да іншых народаў і памяркоўнасць да тых, хто думае іначай.

У сучасны перыяд усе вышэйпрыведзеныя меркаванні пацвярджаюцца практычна поўнасцю бесканфліктным, талерантным "суіснаваннем" на Беларусі прадстаўнікоў звыш 120 нацыянальнасцей, 26 канфесій і прыкладна 30 палітычных партый, а таксама шматлікіх грамадскіх рухаў. На фоне амаль перманентнага, нярэдка ўзброенага супрацьстаяння людзей па нацыянальнай або рэлігійнай прыкметах у асобных краінах былога СССР становішча ў нашай краіне ў цэлым застаецца даволі стабільным і спакойным, пазбаўленым міжнацыянальнай, міжканфесійнай і палітычнай варожасці (што, аднак, не выключае магчымасці некаторага абвастрэння ўзаемаадносін пры неспрыяльных абставінах).

Своеасаблівае харство беларускай прыроды, непаўторная маляўнічасць яе краявідаў таксама досыць значна паўплывалі на характар беларусаў, у некаторым сэнсе прадвызначылі мяккасць, пяшчотнасць і паэтычнасць іх натуры. Сярод беларусаў, напэўна, найчасцей можна сустрэць людзей з меланхалічным тэмпераментам, асноўнымі рысамі якога лічацца прамарудлівасць, стрыманасць рухаў і дзеянняў, адсутнасць рэзкіх усплёскаў эмоцый і г.д. Таму небеспадстаўнай здаецца думка аб тым, што беларускай душы ўласціва лагодная меланхолія, якая выклікана пераважна "журботным, сумным" каларытам усёй прыроды Беларусі. Іншымі словамі, беларусы ў адпаведнасці з тыпалогіяй характараў псіхолага К.Г.Юнга хутчэй могуць быць аднесены да інтравертаў, чым да экстравертаў. Прычым людзі першага тыпу найчасцей вызначаюцца "звернутасцю" да самога сябе, засяроджанасцю на ўласным унутраным свеце, а другога — наадварот, арыентацыяй на знешні свет, на сваё сацыяльнае асяроддзе. Беларусы звычайна больш схільныя да адзіноты і роздуму, чым, напрыклад, да нястрымнай весялосці і адчайных учынкаў.

Станоўчай рысай беларускага характару можна лічыць і адсутнасць у ім агрэсіўнасці, ваяўнічага нацыяналізму і месіянскай свядомасці. Тыповы беларус у адрозненне, скажам, ад расійца, які заўсёды лёгка ўпадаў у крайнасці, даходзіў да мяжы магчымага (гэтыя рысы рускага характару неаднойчы адзначаны ў працах М.Бярдзяева), звычайна вызначаўся стрыманасцю, спакойным норавам. Падобная пазбаўленасць крайнасцей у выяўленні пачуццяў, эмоцый і думак, своеасаблівая цэнтрычнасць характару беларусаў адлюстраваліся і ў асобных фальклорных творах. Напрыклад, у народных песнях, вершах, казках перажыванні дзеючых асоб найчасцей як бы ўраўнаважаны, "прыгладжаны" і нярэдка сумяшчаюць адначасова радасць і смутак (тыповым прыкладам могуць служыць вясельныя песні).

Пад непасрэдным уплывам хрысціянства з яго вядомымі культамі і запаведзямі сярод беларусаў з цягам часу выпрацоўваліся такія маральна-духоўныя якасці, як мяккасардэчнасць, гуманнасць, міласэрнасць і спачуванне блізкаму (эмпатыя). Даследчыкі фальклору справядліва падкрэсліваюць, што беларусы стварылі мноства мяккіх і гуманных легендаў, у якіх нават сацыяльна-эканамічныя пытанні вырашаюцца ў духу хрысціянскай любові і лагоднасці. Таму не выпадкова на Беларусі ў мінулыя стагоддзі былі досыць шырока распаўсюджаны духоўныя, малітоўныя вершы і песні, якія звычайна выконвалі вельмі паважаныя "простым людам" сляпыя старцы-лірнікі.

Аб складзе душы беларусаў можа даць некаторае ўяўленне і іх схільнасць да светлых колераў у сваім адзенні, хатняй абстаноўцы і г.д. (прыгадаем таксама бел-чырвона-белы беларускі сцяг), а, як вядома, сімволіка белага колеру азначае маральную чысціню, прыгажосць і праведнасць жыцця. Схільнасць беларусаў да міласэрнасці, добразычлівасці адлюстравалася і ў многіх народных прыказках і прымаўках: "Бога любі і бліжняга свайго не губі", "Любі другога, як сябе самога", "Шчыраму сэрцу чужая болька баліць", "Чаго сабе не хочаш, таго і другому не зыч".

Беларускаму нацыянальнаму характару практычна ва ўсе часіны (асабліва ў перыяды войнаў і ўсялякіх выпрабаванняў) былі ўласцівы такія дадатныя рысы, як мужнасць і вынослівасць, жыццястойкасць і нескаронасць. Беларусы праяўлялі заўсёдную гатоўнасць абараняць родную хату, годнасць бацькоў, дзяцей, сваякоў. Нягледзячы на неспрыяльныя, часам, здавалася б, нясцерпныя абставіны жыцця, нашы продкі найчасцей не ўпадалі ў адчай і бяздзейнасць, а, наадварот, працягвалі мужна змагацца за лепшую долю, добрасумленна працаваць дзеля забеспячэння належных, прыстойных умоў існавання.

Амаль усе, хто прыязджае на Беларусь, заўсёды падкрэсліваюць, што беларусы — народ шчыры, добразычлівы і вельмі гасцінны. Мажліва, менавіта такая надзвычайная гасціннасць як бы сінтэзуе, аб'ядноўвае і некаторыя іншыя прывабныя якасці нашага народа — талерантнасць, памяркоўнасць, лагоднасць, павагу ад "іншаземцаў" і г.д. Не выпадкова на Беларусі была распаўсюджана

характэрная прыказка "Госць у хаце — Бог у хаце". Нават пры ўсялякіх жыццёвых цяжкасцях і нягодах беларусы звычайна імкнуліся зрабіць усё магчымае, каб задаволіць сваіх гасцей, не выклікаць з іх боку ніякіх адмоўных пачуццяў.

У цэлым наш народ вылучаецца значным творча-стваральным патэнцыялам, аб чым красамоўна сведчаць незвычайнае багацце фальклору, шматлікія ўзоры народных твораў (песні, казкі, легенды, паданні і інш.) высокага мастацкага ўзроўню і вытанчанага эстэтычнага густу, а таксама немалая колькасць дзеячаў беларускай культуры, тварчасць якіх атрымала прызнанне далёка за межамі краіны. Беларусы, як сцвярджае міжнародная статыстыка, з'яўляюцца адным з самых здольных і працавітых народаў. Так, наш народ таленавіты, да таго ж ён "любіць праўду і красу, — ён спакойны і разважлівы, а пры гэтым цвёрды" (В.Ластоўскі).

АДМОЎНЫЯ ЯКАСЦІ ХАРАКТАРУ БЕЛАРУСАЎ

Ва ўсе часы свайго гістарычнага развіцця ў беларусаў адначасова са станоўчымі праяўляліся таксама і некаторыя адмоўныя рысы нацыянальнага характару. Апошнія, як і станоўчыя, выпрацоўваліся паступова, пад уплывам розных трагічных падзей у гісторыі Беларусі, асаблівасцей яе сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага, духоўна-культурнага развіцця, спецыфікі геапалітычнага становішча і г.д. Беларусы амаль заўсёды знаходзіліся на мяжы двух моцных уплываў — усходніх і заходніх, якія, па словах І.Абдзіраловіча, "круцілі і гвалцілі душу беларуса". Сапраўды, некаторая пасіўнасць і апатычнасць былі ў рэшце рэшт "прадуктам" тых гістарычных варункаў, у якіх праходзіла шматвяковае жыццё нашых продкаў..

Ёсць, здаецца, важкія падставы прымяніць і да беларусаў вядомае выказванне: "Недахопы чалавека — гэта працяг яго вартасцей". Напрыклад, нерашучасць і некаторая абыякавасць, інертнасць, магчыма, з'яўляюцца вынікам празмернай, "гіпертрафаванай" талерантнасці і памяркоўнасці. Больш таго, празмерна развітая талерантнасць часам магла і шкодзіць, бо гэтую асаблівасць характару нярэдка выкарыстоўвалі ў сваіх асіміляцыйных мэтах і польскія, і расійскія ўлады. А беларускі народ, спакойны і спагадлівы, іншы раз моўчкі пераносіў "глумленне" (паводле М.Багдановіча) над сваёй мовай, культурай, не выказваючы моцнага пратэсту, і часам з паслухмянасцю, пакорнасцю ўспрымаў і цярпеў чужацкую ўладу. Вельмі вобразна і дакладна адносіны да беларускага народа ў мінулым паказаў Янка Купала ў вершы "Беларушчына" (1908): "І круцілі цябе, як каму падабалася // Кожны строіў, наводзіў цябе на свой строй, на свой лад // Ажно часам жальба, як кляцьба, разлягалася // Ды нячутай ляцела, ўміраючы, ў грудзі назад...".

Некаторую пасіўнасць і апатычнасць беларусаў, іх недастатковую здольнасць да прадпрымальніцтва раней тлумачылі "падаўляючымі" энергію і волю

асіміляцыйнымі ўплывамі з усходу і захаду, даволі раннім і моцным развіццём прыгонніцтва, а таксама тым, што, напрыклад, у сферы асобных промыслаў, рамёстваў і асабліва гандлёвай дзейнасці беларусы звычайна не маглі вытрымаць канкурэнцыі з боку энергічных і бойкіх яўрэяў. Увогуле, менавіта спакойны характар беларусаў паўплываў і на выбар іх працоўных заняткаў (такіх жа няспешных).

У мінулым многія лічылі беларусаў надзвычай пакорлівай, ціхмянай, ва ўсім безадмоўнай народнасцю. Пры гэтым адзначалася, што з цягам часу беларускі народ звыкся з неспрыяльнымі, амаль заўсёды несвабоднымі варункамі жыцця, не імкнуўся да паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча і ў выніку зрабіўся нібыта "рабом па духу". Сапраўды, нягледзячы нават на шматлікія цяжкасці, сярод беларусаў не атрымалі шырокага развіцця апазіцыйныя, дысідэнцкія ідэі, а нацыянальна-вызваленчая барацьба не мела такога маштабу, як скажам, на Украіне. Не маюць беларусы ў сваім характары і таго іррацыянальнага, нястрымнага імкнення да асабістай свабоды і волі, якім ва ўсе часы вызначаліся цыганы.

У характары беларусаў караніцца і такая рыса, як заўсёдная схільнасць да кампрамісаў у вырашэнні жыццёвых праблем, да згоды (прыгадаем прыказку "Згода будуе, нязгода руйнуе"). Аднак у выпадках празмернага развіцця гэтых якасцей "пазітыў" можа лёгка пераходзіць у "негатыў", і тады ўжо частку беларусаў вызначаюць пэўнае прыстасаванства, канфармізм, недастатковая настойлівасць у абароне ўласных поглядаў і перакананняў. Прычым гэтыя псіхалагічныя якасці, на наш погляд, прыкметна ўзмацніліся ў перыяд існавання савецкай таталітарнай сістэмы з яе падаўленнем іншадумства, абмежаваннем асобных правоў чалавека і магчымасцей для поўнай самарэалізацыі асобы.

Практычна перманентны (бесперапынны) стан прыгнечанасці і залежнасці ў ранейшыя часы абумоўліваў "млявае і санлівае" жыццё беларусаў, некаторую страту імі былой энергіі, аслабленне "жыццёвага парыву" (паводле А.Бергсона). Сапраўды, немалая частка беларусаў нярэдка аддавала перавагу знешне малапрыкметнаму жыццю без выразнага праяўлення эмоцый, думак і пачуццяў, вызначалася пакорлівасцю прадстаўнікам улады і ў пэўнай ступені сервілісцкай (рабскай) псіхалогіяй. Гэтыя рысы, як пацвердзіла жыццё, найбольш значна пашырыліся якраз на працягу апошніх дзесяцігоддзяў.

Асобныя даследчыкі (гісторыкі, этнографы, фальклярысты) раней падкрэслівалі, што беларусы ў большасці бываюць даволі скрытнымі, недаверлівымі, асцярожнымі ва ўзаемаадносінах з незнаёмымі людзьмі, "чужынцамі". Прычына падобнай недаверлівасці, насцярожанасці ляжыць, магчыма, у спецыфіцы гістарычнага шляху беларусаў са шматлікімі нападамі, войнамі і здзекамі з боку іншых дзяржаў, паноў-прыгнятальнікаў, асімілятараў і інш. Менавіта як своеасаблівы імунітэт на пастаянныя агрэсіўныя намаганні "дабрадзеяў" з усходу і захаду навязаць свае погляды іншым можна разглядаць беларускую насцярожанасць і замкнёнасць. Тыповыя беларусы заўсёды ўмелі

спакойна, уважліва выслухаць думкі розных "іншаверцаў", "іншаземцаў", аднак усё ж не падтрымлівалі, не падзялялі іх, калі яны не адпавядалі ўнутраным, душэўным перакананням. Пры гэтым справядлівым будзе сказаць і тое, што калі да беларуса падысці з адкрытай душой, без злосных намераў, то ён адразу ж пакажа ўсю сваю гасціннасць, добразычлівасць.

У выніку ўздзеяння розных неспрыяльных фактараў у беларусаў склаліся, трэба меркаваць, пераважна сензітыўны і астэнічны тыпы характару, якія характарызуюцца абвостранымі пачуццямі няўпэўненасці, нерашучасці, занепакоенасці, схільнасцю да дэпрэсіі, апатыі, увогуле пэўным "комплексам непаўнацэннасці" (тэрмін належыць псіхолагу А.Адлеру). Прычым падобны комплекс непаўнацэннасці выяўляўся, напрыклад, у прадузятым успрыманні беларусамі сваёй культуры, мовы як ніжэйшых, "мужыцкіх", "хамскіх" у параўнанні з рускімі і да т.п.

Прыведзеныя меркаванні пацвярджаюцца ў нашы дні і вынікамі спецыяльных даследаванняў, згодна з якімі так званы слабы тып характару, што праяўляецца ў нерашучасці і безабароннасці, значна часцей сустракаецца сярод сельскіх жыхароў Беларусі, а ў гарадах, наадварот, больш выяўлена людзей з досыць моцным і кантактным характарам. У сучасны перыяд і ў далейшым характар беларусаў хутчэй за ўсё будзе, відаць, "набываць" новыя як станоўчыя, так і адмоўныя рысы, абумоўленыя істотнымі зменамі ў розных сферах жыццядзейнасці грамадства.

* * *

Такім чынам, у беларускім нацыянальным характары адначасова, узаемазвязана існуюць розныя, а часам і супрацьлеглыя рысы. Усе гэтыя якасці, узятыя разам, у сукупнасці, ствараюць толькі прыблізную, абагульненую карціну характару беларусаў, не раскрываюць, зразумела, усёй яго складанасці і непаўторнасці. Характар беларусаў вызначаецца, акрамя названых, яшчэ і мноствам іншых дадатных і негатыўных якасцей, дасціпна і дакладна вытлумачыць, апісаць якія бывае вельмі складана, а часам і амаль немагчыма. Беларуская душа надзвычай разнастайная, загадкавая і невычарпальная, прычым у ёй заўсёды будуць існаваць і нейкія глыбінныя таямніцы, да разгадкі якіх мы павінны імкнуцца. На наш погляд, дасягнуць светлых ідэалаў новага Адраджэння можна толькі ў тым выпадку, калі будуць уважліва аналізавацца, улічвацца і выкарыстоўвацца ў практычнай дзейнасці найлепшыя станоўчыя рысы і адначасова пераадольвацца "адмоўныя" бакі беларускага нацыянальнага характару. У сувязі з гэтым хацелася б прывесці мудрыя словы Ф.Шантыра, якія былі сказаны звыш 70 гадоў назад, але і сёння гучаць надзвычай актуальна для ўсіх шчырых патрыётаў Бацькаўшчыны: "Свядомасць свайго краю, усяго свайго роднага, свядомасць поступу свайго нацыянальнага "я" — гэта найважнейшая патрэба ўсяго народа, гэта той штодзённы яго духоўны хлеб, без каторага ён, як народ, дастойна жыць не можа...".

("Адукацыя і выхаванне", 1995, № 5)

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ У МІНУЛЫМ І СЁННЯ

Сучасны перыяд развіцця нашага грамадства вызначаецца узрастаннем цікавасці людзей да свайго мінулага, да багатай і разнастайнай народнай спадчыны. Адначасова з гэтым паступова паглыбляецца нацыянальная самасвядомасць жыхароў нашай краіны, што звычайна спрыяе працэсам кансалідацыі і адраджэння кожнай нацыі. Дык што ж сабой уяўляе нацыянальная самасвядомасць беларусаў, якія адметныя рысы яе гістарычнай эвалюцыі і сённяшняга становішча?

Нацыянальная самасвядомасць можа быць вызначана як своеасаблівая сістэма ўяўленняў, пачуццяў і ведаў этнічнай супольнасці людзей (у тым ліку і яе асобных індывідаў) аб сваёй "кроўнай" прыналежнасці да пэўнай нацыі, гістарычным шляху апошняй, а таксама аб саміх сабе, сваім месцы і ролі ў жыцці роднага народа. Фармаванне нацыянальнай самасвядомасці адбываецца звычайна на аснове ўсведамлення людзьмі свайго агульнага паходжання (ад адных "бацькоўскіх каранёў"), адчування непарыўнай, прыродна-генетычнай "звязанасці" з роднай зямлёй, гісторыяй свайго края, а таксама самабытнасці культуры, мовы, нацыянальнага характару, менталітэту і інш.

Нацыянальная (дакладней — этнічная) самасвядомасць старажытных жыхароў Беларусі пачала складвацца ўжо ў той далёкі перыяд, калі на нашай зямлі толькі адбываліся працэсы этнагенезу самабытнай протабеларускай этнічнай супольнасці. Якраз тады адначасова з паступовым складваннем беларускага этнасу аформілася і адпаведная этнічная самасвядомасць беларусаў. У далейшым, на працягу наступных стагоддзяў, яна выяўлялася ў розных формах, мела адметныя рысы і глыбіню ў той ці іншы гістарычны перыяд. Так, у эпоху першабытнаабшчыннага ладу элементы этнічнай самасвядомасці тагачасных родаплемянных, кроўна-сваяцкіх супольнасцей Беларусі адлюстроўваліся найперш ва ўсведамленні (нярэдка падсвядомым, эмацыянальным) свайго паходжання ад аднаго міфічнага продка, а таксама блізкасці традыцый, звычаяў, абрадаў, мовы і інш. Як правіла, саманазвы членаў асобных радоў, плямён у тыя старажытныя часы альбо ўвогуле адсутнічалі, альбо існавалі ў невыразнай форме, звычайна адпаведнай месцу пражывання людзей (напрыклад, дрыгавічы — жыхары балотаў, дрыгвы, драўляне — жыхары лясоў).

У перыяд існавання такіх магутных дзяржаўных утварэнняў, як Вялікае княства Літоўскае (з сярэдзіны XIII ст.) і Рэч Паспалітая (з другой паловы XVI ст.), этнічная самасвядомасць іх тагачасных насельнікаў мела розныя формы і спецыфічныя рысы. Прычым гэтая самасвядомасць у розных сацыяльна-саслоўных, прафесійных, тэрытарыяльных, канфесійных групах насельніцтва праяўлялася неаднолькава. Для прыкладу можна адзначыць, што этнічная са-

масвядомасць пануючых саслоўяў (магнатаў, шляхты) нярэдка замянялася менавіта саслоўнай самасвядомасцю. Так, прадстаўнікі прывілеяванага вайскова-служылага саслоўя — шляхты — у часы позняга сярэднявечча нярэдка лічылі сябе асобным "шляхецкім народам".

Што датычыцца непрывілеяваных саслоўяў (найперш сялянства) Беларусі, то іх этнічная самасвядомасць у мінулыя стагоддзі вызначалася разнастайнасцю канкрэтных праяўленняў і рознай глыбінёй, "насычанасцю". Увогуле, "просты люд" Беларусі значна менш, у адрозненне ад магнатаў, паддаваўся асіміляцыйным уплывам. Гэта было абумоўлена ў немалой ступені і тым, што ва ўсе часіны гістарычнага развіцця беларусаў паміж багатымі і беднымі, пануючымі і прыгнечанымі слаямі грамадства, а таксама паміж сялянамі і гараджанамі існавалі пэўныя сацыяльна-саслоўныя межы, якія, так бы мовіць, адгароджвалі іх адзін ад аднаго, абумоўлівалі адносна малую інтэнсіўнасць кантактаў. Усё гэта прыводзіла да таго, што калі ў верхніх стратах беларускага грамадства досыць актыўна адбываліся асіміляцыйныя працэсы, то ў "ніжэйшых пластах" звычайна працяглы час захоўваліся старадаўнія традыцыі, абрады, а таксама і формы самасвядомасці і г.д.

У тагачасны перыяд сярод мясцовых жыхароў Беларусі пераважалі лакальна-тэрытарыяльныя формы самасвядомасці (напрыклад, саманазва "палешукі" — ад тапоніма "Палессе"), канфесіянальныя (г. зн. саманазва паводле канфесіянальнай прыналежнасці — "праваслаўныя людзі", "католікі"), а таксама зямляцкія (скажам, "случане", "тураўцы", "палачане") і так званыя этнацэнтрычныя ("тутэйшыя", "тубыльцы").

У XIV—XVI стст., калі ў Вялікім княстве Літоўскім значна ўзмацніліся сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, этнадэмаграфічныя і культурныя сувязі паміж зямляцкімі супольнасцямі, упершыню пачала фармавацца ўжо агульнаэтнічная самасвядомасць насельніцтва, што знайшло адлюстраванне найперш ва ўзнікненні і паступовым распаўсюджванні этнонімаў "літвіны" ("ліцвіны") і "русіны", якія паходзілі ад назваў "Літва" і "Русь". Літвою і літвінамі называлі адпаведна Вялікае княства Літоўскае і яго насельніцтва. Менавіта з "літвінамі" на працягу гэтых стагоддзяў (і нават у далейшым, па XIX ст. уключна) самаідэнтыфікавала сябе значная частка шляхты ВКЛ, прычым розных веравызнанняў — каталіцкага, уніяцкага, а часам і праваслаўнага. Адначасова саманазва "літвіны" пачала пашырацца і ў асяродку іншых сацыяльна-саслоўных катэгорый (дваранства, мяшчанства, сялянства) насельніцтва этнічных беларускіх земляў.

І толькі ў гістарычных крыніцах першай паловы XVII ст. практычна ўпершыню зафіксавана этнанімічнае вызначэнне "беларусцы", непасрэдна звязанае са стабільным замацаваннем за землямі пераважна паўночна-ўсходняй Беларусі тапоніма "Белая Русь". У XVII—XVIII стст. нацыянальная самасвядомасць жыхароў "Белай Русі" (маецца на ўвазе найперш тэрыторыя Полацкага,

Віцебскага і Мсціслаўскага ваяводстваў) выяўлялася ў даволі ўстойлівым бытаванні саманазвы "беларусцы" альбо радзей — "беларусы", "белыя русы", "выхадцы з Белай Русі".

З канца XVII — пачатку XVIII ст., па вобразным выразе М.Багдановіча, на Беларусі ўжо даволі адчувальнай стала "летаргія беларускага нацыянальнага жыцця", што знайшло адлюстраванне ў паступовай паланізацыі вышэйшага і сярэдняга слаёў беларускага дваранства, шляхты і гарадскога мяшчанства. Многія прадстаўнікі прывілеяваных саслоўяў у XVII—XVIII стст. мянялі сваю беларускую ("ліцвінскую") самасвядомасць, засвойвалі польскую мову, а часам прымалі каталіцкую веру і ў выніку пачыналі лічыць сябе ўжо католікамі, палякамі. Дарэчы, падобнае апалячванне беларусаў у тыя часы з'яўлялася адной са своеасаблівых крыніц павелічэння колькасці палякаў на Беларусі, бо, як вядома, масавых міграцый сюды палякаў з тэрыторыі Польшчы ў тыя часы не было зафіксавана. Зыходзячы з вышэйсказанага, можна лічыць, што этнічная самасвядомасць пералічаных слаёў беларускага насельніцтва іншы раз мела тэндэнцыю не да далейшага яе паглыблення і развіцця, а, наадварот, да своеасаблівага "рэгрэсу", "дэградацыі".

На працягу XIX — пачатку XX ст. у нацыянальнай самасвядомасці беларусаў адбыліся даволі істотныя змены, выкліканыя ўзмацненнем працэсаў кансалідацыі беларускай народнасці ў нацыю. Аднак рост этнічнай самасвядомасці беларусаў штучна стрымлівалі спачатку тэндэнцыі да паланізацыі, акаталічвання, а пазней — прыкладна з сярэдзіны XIX ст. — татальнай русіфікацыі беларускага насельніцтва. Гэтыя фактары нібы "разрывалі" беларускі этнас па канфесіянальнай прыкмеце, што ў выніку нярэдка прыводзіла да змянення беларусамі сваёй нацыянальнасй самаідэнтыфікацыі. Так, у XVII—XIX стст. мелі месца выпадкі замены этнанімічных вызначэнняў асобных груп людзей канфесіянальнымі (канфесіёнімамі).

На Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. некаторыя групы мясцовага каталіцкага насельніцтва беларускага паходжання лічылі сябе (у адпаведнасці з канфесіянальнай прыналежнасцю) палякамі, а праваслаўныя — рускімі. Своеасаблівая "разарванасць" этнасу на дзве часткі па рэлігіі перашкаджала фармаванню агульнаэтнічнай самасвядомасці і "выпрацоўцы" пачуцця нацыянальнай еднасці ўсіх беларусаў. Хаця многія з іх (па паходжанні) адносілі сябе або да рускіх, або да палякаў, але ўсё ж яны ў большасці выпадкаў размаўлялі па-беларуску, добра ведалі беларускія абрады, звычаі, народныя спевы, казкі, легенды і г.д. Таму не выпадкова Ф.Шантыр — першы нарком нацыянальных спраў БССР — у 1918 г. пісаў, што беларускі народ, забыўшы пад даўленнем гістарычных фактараў (найперш тут маецца на ўвазе палітыка паланізацыі і русіфікацыі, штучнае абмежаванне сферы выкарыстання беларускай мовы ў XVII—XIX стст. і інш. — Аўт.) сваё нацыянальнае імя, ... у цэлым не перастаў быць самім сабою, народам з сваім гістарычным мінулым, з сваім уласным

іменем. Нават знаходзячыся працяглы час як бы ў "паўсне нацыянальнай несвядомасці", беларускі народ заўсёды разумеў сваю нацыянальную асобнасць, самабытнасць і непадобнасць да іншых народаў.

Паступова, у другой палове XIX ст., этнанімічная саманазва *"беларусы"* распаўсюджвалася і на захад Беларусі, у тыя раёны, дзе мясцовае насельніцтва ў мінулым вызначалася пераважна як *ліцвіны* і дзе было нямала этнічных палякаў і апалячаных беларусаў. Царскаму ўраду, які вёў барацьбу з "паланізмам", было якраз даволі выгадна, каб жыхары Беларусі ўсведамлялі сябе непалякамі, дзеля чаго мясцовыя чыноўнікі зрэдку дазвалялі абмежаванае выкарыстанне беларускай мовы, але, па сутнасці, лічылі мясцовых беларусаў "адгалінаваннем рускага народа". Урадавыя колы Расійскай імперыі імкнуліся, на думку этнографа А.Шлюбскага, выкарыстоўваць беларускую мову для найлепшага правядзення русіфікацыі і для вялікадзяржаўных мэт, адначасова не дазваляючы праяўляцца ніякаму "провинциальному (г. зн. беларускаму і польскаму) патриотизму".

У XIX — пачатку XX ст. пераважна ў паўночна-заходніх і цэнтральных раёнах Беларусі ў першую чаргу сярод непісьменных і малапісьменных сялян, гараджан была пашырана лакальна-тэрытарыяльная саманазва "тутэйшыя", якую нават асобныя прадстаўнікі інтэлігенцыі ўспрынялі як універсальны беларускі этнонім. Значная частка беларускіх сялян вызначала сябе "тутэйшымі", "тубыльцамі" або "наськімі", а не беларусамі, рускімі, палякамі.

Названы феномен "тутэйшасці" з'яўляўся своеасаблівым вынікам ранейшай дэнацыяналізацыі і стаў сапраўднай трагедыяй для нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, што знайшло вобразнае адлюстраванне ў знакамітай п'есе Я.Купалы "Тутэйшыя" (1922). Распаўсюджанне гэтага тэрміна сведчыла пра вельмі нізкі ўзровень менавіта нацыянальнай самасвядомасці значнай часткі беларускага народа ў перыяд, калі паступова пашыраўся беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, узрастала колькасць нацыянальна-свядомых людзей — найперш сярод інтэлігенцыі, шляхты, разначынцаў. Аднак дзеля справядлівасці варта заўважыць, што хаця "тутэйшыя" (па выразе аднаго з герояў згаданай п'есы) былі "вялікае нішто" для свайго народа, але яны, не лічачы сябе ўласна беларусамі, усё ж не адносілі сябе ні да рускіх, ні да палякаў, г. зн. не паддаліся поўнай асіміляцыі. Самасвядомасць "тутэйшых" не мела выразнага этнічнага зместу, а з'яўлялася "размытай", неакрэсленай. А ўвогуле, падобная "хвароба тутэйшасці" аказалася, як сведчыць гісторыя, да канца не вылечанай нават да цяперашняга часу.

Даволі моцны ўздым агульнаэтнічнай кансалідацыі і рост нацыянальнай самасвядомасці беларусаў адбыўся і ў 20-я гг. XX ст., у перыяд правядзення ў рэспубліцы дзяржаўнай палітыкі беларусізацыі. Тады, ва ўмовах даволі хуткага развіцця беларускай культуры, пашырэння сферы ўжывання беларускай мовы, прыкметна павысіўся ўзровень нацыянальнай самасвядомасці, бо многія бела-

русы, якія ў мінулым лічылі сваю родную мову, культуру "мужыцкімі", "халопскімі", "ніжэйшымі" (у параўнанні з "вялікай" рускай мовай), паступова пераадольвалі гэтыя негатыўныя стэрэатыпы, усведамлялі сваё сапраўднае паходжанне, свае "бацькоўскія карані". Згодна з перапісам насельніцтва 1926 г., беларусы складалі ўжо 80,62% ад колькасці ўсяго насельніцтва БССР, прычым абсалютная іх большасць лічыла сваёй роднай менавіта "матчыну" беларускую мову (найперш мясцовае сялянства). Як сведчаць архіўныя крыніцы, у 20-х гг. беларусы-католікі іншы раз лічылі сябе палякамі (хаця такіх выпадкаў у цэлым было няшмат) толькі на той падставе, што трымаліся каталіцкай веры, але пры гэтым яны звычайна польскай мовай не валодалі, карысталіся ў паўсядзённым жыцці беларускай.

У далейшым пачалі набіраць моц асімілятарскія тэндэнцыі, і пад уплывам палітыкі "контрбеларусізацыі" 30-х гг. і дэнацыяналізацыі ў наступныя дзесяцігоддзі (аж да канца 80-х гг.) частка свядомых беларусаў страціла пачуццё свайго ўласнага паходжання, самасвядомасць і родную мову. Сведчаннем узмацнення працэсаў моўнай асіміляцыі беларусаў, своеасаблівага "рэгрэсу" іх нацыянальнай самасвядомасці могуць служыць наступныя факты. Удзельная вага беларусаў, якія прызналі роднай беларускую мову, з 1970 па 1989 г. зменшылася на 10%. І наадварот, доля беларусаў, якія прызналі роднай рускую мову, усяго толькі за дзесяць гадоў (з 1970 па 1979 г.) узрасла на 6%.

Рэгіянальныя асаблівасці нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва рэспублікі ўскосным чынам адлюстраваліся і ў выбарах першага прэзідэнта краіны. Паколькі з шасці кандыдатаў, якія ўдзельнічалі ў першым туры прэзідэнцкіх выбараў, толькі два (Пазьняк і Шушкевіч) — гэта прыхільнікі беларускасці, выразнікі беларускай нацыянальнай ідэі, то з гэтага можна зрабіць (з пэўнай доляй умоўнасці) некаторыя высновы. Найбольш высокі ўзровень менавіта нацыянальнай самасвядомасці, відаць, характэрны для жыхароў заходняй і цэнтральнай Беларусі, бо, напрыклад, у Гродзенскай вобласці за Пазьняка і Шушкевіча прагаласавала 30,8% ад усіх удзельнікаў выбараў, тады як у Магілёўскай вобласці адпаведная лічба склала ўсяго 8,5%. Акрамя таго, самым высокім "рэйтынг" гэтых палітыкаў аказаўся ў сталіцы рэспублікі, дзе яны разам "узялі" ажно 42,1% усіх галасоў, што больш чым у тры разы перавышае вынікі па г. Магілёве (12,7%). Вышэйпрыведзеныя лічбы яшчэ раз пацвердзілі (хаця і ўскосна), што, як і ў мінулым, нацыянальная самасвядомасць беларусаў вызначаецца большай развітасцю і глыбінёй у заходніх і цэнтральных раёнах Беларусі ў адрозненне ад больш асіміляванага, зрусіфікаванага насельніцтва ўсходніх рэгіёнаў рэспублікі.

Вынікі першага агульнарэспубліканскага рэферэндуму 14 мая 1995 г. сведчаць аб тым, што ў сучасны перыяд немалая частка беларускага насельніцтва вызначаецца даволі нізкім узроўнем нацыянальнай самасвядомасці, унутрана не падзяляе ідэі аб умацаванні незалежнасці сваёй краіны, развіцці беларускай

мовы, культуры. Так, за наданне рускай мове роўнага статусу з беларускай выказалася 83,3% ад прыйшоўшых на рэферэндум (каля 54% ад усіх зарэгістраваных), тады як супраць гэтага — усяго 12,7% ці 8,2% ад колькасці маючых права прыняць удзел у рэферэндуме. Адпаведныя лічбы па пытанні аб мэтазгоднасці замены дзяржаўнай сімволікі склалі 75,1 (48,6%) і 20,5% (13,3%). У той жа час трэцяя частка ўключаных у спісы (прыкладна 2,6 млн. чал.) увогуле не прыйшла на рэферэндум, праявіўшы індыферэнтызм, абыякавасць да вырашаемых праблем. Гэта яшчэ раз пераканаўча пацвярджае, што за апошнія гады ўмацаванне нацыянальнай самасвядомасці адбывалася даволі марудна і было ўласціва не вельмі шырокаму колу беларусаў.

Такім чынам, даследаванне гістарычнай эвалюцыі нацыянальнай самасвядомасці беларусаў дазваляе зрабіць агульныя высновы. Уласна нацыянальная самасвядомасць беларусаў больш-менш акрэслена аформілася адносна позна, у перыяд XIX — пачатку XX ст. Да таго часу для беларусаў была характэрна пераважна этнічная самасвядомасць, прычым найперш у форме лакальна-тэрытарыяльных, этнацэнтрычных саманазваў (феномен "тутэйшасці" быў даволі шырока распаўсюджаны на Беларусі).

Пачынаючы з пачатку XIX ст. далейшая эвалюцыя, паглыбленне нацыянальнай самасвядомасці былі штучна запаволены пад уплывам паланізацыі, а з другой паловы XIX ст. — татальнай русіфікацыі. Прыкметная актывізацыя працэсаў фармавання, "крышталізацыі" нацыянальнай самасвядомасці сярод беларусаў практычна ўсіх сацыяльных катэгорый і груп назіралася ў канцы XIX — пачатку XX ст., асабліва ў 20-я гг., пад час правядзення палітыкі беларусізацыі. У наступныя дзесяцігоддзі зноў пачаўся перыяд "заняпаду" нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, што было непасрэдна звязана з разгортваннем "антыбеларусізацыі" ў 30—80-я гг. Канкрэтна-гістарычны аналіз паказаў, што нацыянальная самасвядомасць хутчэй, дынамічней фарміравалася ў заходняй частцы Беларусі, у той час як насельніцтва яе ўсходніх земляў было заўсёды больш моцна дэнацыяналізавана. Асноўнымі носьбітамі нацыянальнай самасвядомасці ў XIX—XX стст. былі пераважна прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, часткова сялянства, служачых і інш. Увогуле, гістарычная эвалюцыя нацыянальнай самасвядомасці беларусаў вызначалася нераўнамернасцю, наяўнасцю перыядаў не толькі яе паглыблення, але і рэгрэсу, замаруджанай дынамікай яе фармавання і развіцця.

("Адукацыя і выхаванне", 1996, № 3)

НА МЯЖЫ ДЭНАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ

Пасля абвяшчэння Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце і прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь здавалася, што створана нейкая прававая аснова для нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, узбагачэння духоўных традыцый і набыткаў беларускага народа. Але па меры таго, як у суседняй Расіі набіралі моцы жырыноўшчына і зюганаўшчына, як падымалі галаву дамаслыя гукальнікі "саборнага сацыялізму", станавілася ўсё трывожней і трывожней на душы. А ініцыіраваны ўладамі майскі рэферэндум 1995 г. і нядаўні "саюз непарушны дзвюх рэспублікі свабодных" канчаткова засведчылі, што беларусам яшчэ не хутка дазволяць раздзяліць з іншымі народамі радасць сапраўднай свабоды і незалежнасці. І што новая хваля дэнацыяналізацыі ўжо сёння абарочваецца страшэннымі дэфармацыямі ў сацыяльна-палітычным і духоўным жыцці, якое ўсё больш апускаецца ў бездань рэстаўрацыйна-бальшавіцкай дэмагогіі, жорсткай цэнзуры і аўтарытарызму.

Як справядліва зазначыў В.Быкаў у сваім артыкуле "Горкі смак перамогі", народы і нацыі, у т.л. і беларуская, выхаваныя ў духоўнай Бастыліі і раптам выпушчаныя на волю, аказаліся няздольнымі існаваць вольна, будаваць жыццё на ўласны розум. Сапраўды, не нацыянальнае пачуццё як грамадская вартасць сучаснай цывілізацыі і прагрэсу, не жаданне быць гаспадаром свайго лёсу, а ўсё той жа духоўны канфармізм і рабалепнае падпарадкаванне чужой сіле паранейшаму застаюцца вызначальнай лініяй паводзін большасці грамадзян нашай краіны. Як быццам у расійскіх энерганосьбітах і запчастках, у халопскай прывязанасці да крамлёўскіх уладароў і тутэйшых змагароў "за шчасце ўсіх славян" заключаецца ўвесь сэнс быцця абяздоленых беларусаў!

САМАБЫТНЫ НАРОД І НАЦЫЯ

Дзе ж вытокі такой глыбокай дэнацыяналізацыі беларускага грамадства? Якая існуе ўзаемасувязь паміж гэтым працэсам і сучаснымі высілкамі па дэбеларусізацыі, добраахвотным адмаўленнем дзяржаўных улад ад свабоды і суверэнітэту сваёй Бацькаўшчыны? І ці ёсць гістарычная перспектыва ў тых, хто сёння на глебе беларусафобіі нажывае палітычны капітал і фінансавыя выгады, хто атрымлівае званні і чыны за бразганне зброяй і дубінкамі, рэпрэсіі супраць уласнага народа, хто не ведае іншага спосабу дыялогу з ім, акрамя запужвання, дэзінфармацыі і беспардоннай хлусні?

Пачнём з таго, што дэнацыяналізацыя — гэта страта нацыянальнаспецыфічнага ў культуры, мове і побыце народа. Але народ сам па сабе не губляе свае традыцыі, мову, норавы, звычаі, рэлігійныя ўяўленні. У гэтым яму, як правіла, "дапамагаюць" гаспадары больш моцных краін і імперый, хаця ў рэчышчы нармальных культурных узаемадачыненняў не выключаецца натуральнае, добраахвотнае ўспрыманне іншанацыянальных каштоўнасцей.

Вядома, што беларусы, як народ, і беларусы, як нацыянальная асобнасць, складваліся вякамі і на сваёй уласнай аснове. Гаворачы аб уласнай гісторыі і высокай культуры беларускага народа, М.Доўнар-Запольскі яшчэ ў 1888 г. у серыі артыкулаў "Беларускае мінулае" пісаў: "Беларусы — гэта, бадай, адзіны народ (мо толькі апрача палякаў), які з прадвечных часоў жыве ў сваёй старонцы, ніскуль сюды не прыходзіў, дык і не набраўся чужацкіх элементаў. З гэтай прычыны паводлуг сваіх гістарычных і этнаграфічных асобнасцей беларусы становяць найбольш чыстае славянскае племя, захаваўшы і зверхны выгляд славянскі і шмат адзнак яго псіхікі і быту".

Добра вядома таксама і тое, што беларуская культура не з'яўляецца простым варыянтам велікарускай, як нібыта больш "высокай" і больш "развітой". Гэта па сутнасці два самастойныя культурныя комплексы, якія з самага пачатку раслі і развіваліся незалежна адзін ад аднаго. Па сведчанні Я.Карскага, беларуская народнасць ужо да канца XIII ст. выступае сфарміраванай у сваіх асноўных рысах, апярэдзіўшы ў гэтых адносінах народнасць велікарускую, якая, такім чынам, не магла ўплываць на працэс яе ўзнікнення. Адсутнасць эканамічных сувязей паміж імі, геаграфічныя ўмовы, якія ізалявалі Беларусь ад паўночна-ўсходніх зямель, пакідалі яшчэ менш месца для якога-небудзь узаемадзеяння. Да таго ж велікарускі народ, які асіміляваў масу фінскіх плямёнаў, перажыў эпоху "татаршчыны" і адхіліўся ад спрадвечнага славянства як антрапалагічна, так і культурна, аказаўся амаль поўнасцю адрэзаным ад Заходняй Еўропы. Таму, крыху пазней, у складзе Вялікага княства Літоўскага, Беларусь працягвала развівацца на сваіх старажытнаславянскіх каранях, перажыла разам з іншымі еўрапейскімі краінамі эпоху Рэнесансу і вылучылася на адно з першых месцаў сярод культурнага славянства.

Такім чынам, асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі абумоўліваюць яе "пэўную запраграмаванасць" на заходнюю цывілізацыю з яе духоўна-культурнымі каштоўнасцямі пры захаванні сваіх традыцыйных грамадскіх інстытутаў, культурнай непаўторнасці і унікальнасці. Тым большыя адрозненні ў яе з т.зв. гібрыднымі грамадствамі, якія ўзніклі як сінтэз заходняга і ўсходняга цывілізацыйных тыпаў. Да такіх грамадстваў адносяць і Расію, якая нават пасля шматкратных "трансплантацый" заходняга вопыту не стала Еўропай, а заставалася гібрыдам, які, па выразу Г.Пляханава, меў еўрапейскую галаву на азіяцкім тулаве.

ГВАЛТОЎНАЯ КУЛЬТУРНАЯ ЭКСПАНСІЯ

Задушэнне ўсяго нацыянальнага на Беларусі прывяло ў свой час да расслаення народа па мове, культуры, рэлігіі менавіта таму, што прыйшоўшыя з захаду і ўсходу ўлады (пры ўдзеле мясцовай арыстакратыі і канфармістаў з ліку інтэлігенцыі) гвалтоўна насаджалі сваю мову і свае культурныя

каштоўнасці. Ужо ў сярэднявеччы сярод адукаванага дваранства назіралася тэндэнцыя адыходу ад культуры і мовы свайго народа, што негатыўна адбівалася на развіцці нацыянальнай культуры і ў пэўнай ступені на эканамічным становішчы простага народа, асуджала яго толькі на ўнутранае самаразвіццё. Палітыка ўсямернай паланізацыі беларускага грамадства ў Рэчы Паспалітай, яго татальнай русіфікацыі пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі сталі сапраўды трагічным увасабленнем гвалтоўнай культурнай экспансіі, насаджэння таго альбо іншага тыпу культуры ў іншамоўнае, нацыянальна самабытнае асяроддзе.

Пераслед і забароны, вынішчэнне ўсяго аўтэнтычна-беларускага асабліва ўзрасталі ў перыяды актывізацыі і пад'ёму нацыянальна-вызваленчай барацьбы народаў Беларусі, Літвы і Польшчы, якія неаднойчы сумесна адстойвалі сваё права на сацыяльнае і палітычнае вызваленне, выступалі супраць нівеліроўкі сваіх асаблівасцей і падгонкі іх "пад агульнарускі ранжыр". Немалы штуршок падобным тэндэнцыям ва ўрадавай палітыцы Расіі дало, напрыклад, паўстанне 1830—31 гг. і яго хуткае паражэнне. Разглядаючы гэтае паўстанне як чыста "польскую змову", "правакацыю", царскі ўрад усімі сіламі імкнуўся перарваць сувязь апалячанай часткі насельніцтва Беларусі з уласна польскімі абласцямі, якія, на яго думку, служылі пастаяннай крыніцай польскіх мяцяжоў. Своеасаблівае "спаборніцтва" расійскага і польскага бакоў як мага хутчэй асіміляваць мясцовае насельніцтва, адарваць яго ад сваіх каранёў, пазбавіць роднай мовы, традыцый і звычаяў прыносілі маласуцяшальныя вынікі, бо працэс двайной дэнацыяналізацыі дайшоў да таго, што беларусы пачалі саромецца ўсяго нацыянальна-беларускага, усяго таго, што іх аддзяляла ад "панапаляка і чыноўніка-велікаруса".

Пасля задушэння паўстання 1863—1864 гг. пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага, рускі ўрад павёў сістэматычную барацьбу супраць польскага элемента ў "Северо-Западном крае", адначасова не дапускаючы ніякіх праяўленняў нацыянальна-абласнога жыцця ў Беларусі. Пачаўся працэс "распалячвання" і "раскаталічвання" беларусаў, насаджэння т.зв. панрускай ідэалогіі, падмуркам якой лічыліся самадзяржаўе, праваслаўе і руская народнасць. Ставілася мэта пры дапамозе цэнзуры, школы, праваслаўнай царквы, вайсковай павіннасці і іншых сродкаў канчаткова ачысціць "вернутыя ад Польшчы землі" ад розных налётаў, непажаданых тэндэнцый і з'яў, а заадно вынішчыць усё, што не было падобным на маскоўскае і велікарускае.

У рамках расійскай абрусіцельнай палітыкі на Беларусі працягвалася разбурэнне народных традыцый і звычаяў, ідэалагічная апрацоўка ў вернападданніцкім духу прадстаўнікоў розных слаёў гарадскога і сельскага насельніцтва, свядомае задушэнне яшчэ нязначных, кволых парасткаў беларускага руху. Руская мова трывала ўвайшла ў адміністрацыйнае кіраванне, стала мовай школы, усіх грамадскіх устаноў і арганізацый. У 1880-я гады поўнас-

цю знікла польская прэса, яе замянілі рускія газеты і рускія кнігі. Было зачынена каля двухсот уніяцкіх манастыроў і цэркваў, пры якіх тады найбольш і месцілася беларуская асвета, сотні так званых народных школ, якія, на думку начальства, не давалі ніякай карысці тутэйшым мужыкам-беларусам.

Непрыхільна было сустрэта народам адкрыццё на Беларусі расійскіх школ, таму што "маткі не без падстаў баяліся, што іх дзяцей пераробяць на маскалёў" (Я.Лёсік). Вышэйшыя чыноўнікі не давалі ходу беларускім ураджэнцам, якія пасля заканчэння вучобы ва універсітэтах Расіі займалі ў родных месцах другарадныя, малапрыкметныя адміністрацыйныя пасады (тыпу сакратароў статыстычных камітэтэтаў і інш.). Не дзіўна, што ў сваіх данясеннях у Петраград расійская адміністрацыя сведчыла, што мясцовыя жыхары глядзяць "як ваўкі ў лес".

"НЕ ЧУЮЧЫ СТОГНАЎ І КРЫКАЎ БЕЛАРУСАЎ"

Характэрна, што ў той час, калі нацыянальна свядомая частка інтэлігенцыі распачала ў канцы XIX — пачатку XX ст. актыўную працу па арганізацыі дзейных асяродкаў беларускай культуры і пошуку найбольш прымальных шляхоў развіцця Беларусі, пачалі ўзнікаць і расці, як грыбы пасля дажджу, антыбеларускія, шавіністычныя арганізацыі — Рускае ўскраіннае таварыства, т.зв. Беларускае таварыства, Саюз беларускай дэмакратыі, Беларускі народны камітэт і да т.п. Зыходнай ідэалагічнай устаноўкай усіх гэтых арганізацый быў тэзіс аб тым, што Беларусь не з'яўляецца краінай з асобнай нацыянальнай культурай і што яна занадта слабая, занадта блізка стаіць да Расіі, каб выпрацаваць нешта сваё, незалежнае ад яе. А галоўную сваю мэту заходнерусы бачылі ў процідзеянні беларускаму нацыянальнаму руху і ў самаадданым служэнні ідэалу вялікай, магутнай Расіі, якую лічылі станавым хрыбтом будучага "агульна-славянскага адзінства".

Аднак нельга схаваць таго факта, што падобнымі метадалагічнымі ўстаноўкамі кіраваўся чарнасоценны "Саюз рускага народа" ў сваёй дзейнасці па бязлітасным вынішчэнні "крамолы", арганізацыі яўрэйскіх пагромаў у мэтах "трывалага аб'яднання рускіх людзей для агульнай работы на карысць вялікай, адзінай і недзялімай Расіі". У Статуце Саюза ясна і адназначна падкрэслівалася, што рускай народнасці — збіральніцы зямлі Рускай — належыць першынствуючае значэнне ў дзяржаўным жыцці і дзяржаўным будаўніцтве, што Саюз не робіць розніцы паміж велікарусамі, беларусамі і маларусамі і што руская мова ёсць пануючая мова Расійскай імперыі для ўсіх насяляючых яе народаў. (Гл.: Острецов В.Черная сотня и красная сотня. М., 1991. С. 41—42).

Прыхільнікі і ідэолагі нацыянальна-культурнага адраджэння добра ўсведамлялі рэальныя цяжкасці і перашкоды на шляху ажыццяўлення нацыя-

нальнай ідэі ў наступіўшыя на Беларусі "часы агульнай заблытанасці", калі пасля лютаўскай і кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. новыя гаспадары сталі зноў навязваць беларускаму народу ненатуральныя формы жыцця, заганяць усё ў "труну формулаў", абапіраючыся пры гэтым на трагічны вопыт мінулага, калі ўлады даводзілі жыццёвасць сваіх лозунгаў сілай пагрозы расстрэлу, інквізіцыяй, катаваннем і гумавай палкай.

У гэтым плане ўяўляюцца небеспадстаўнымі меркаванні Б.Бярозы, выказаныя ім у брашуры "Расейска-польскі баль і беларускае пахмелле" (1921 г.). У вобразна-палемічнай і востра-публіцыстычнай форме ён расказвае, як польскі народ змагаўся супраць асіміляцыі і дэнацыяналізацыі, як яму навязвалі чужую культуру, мову і рэлігію, як адначасова з гэтым душылі беларусаў і ўсё беларускае і, нарэшце, як самі палякі пасля рыжскага дагавору 1921 г. пераносілі "вопыт" сваіх асімілятараў на беларускую глебу. "Многа гадоў, — адзначаў аўтар, — так здзекаваўся расійскі ўрад і святкаваў сваю перамогу над слабейшым польскім народам. Заняпаўшы ад безупыннага здзеку, ён разам ужо глуміўся і высмейваў чужы і незразумелы яму беларускі народ. Нягледзячы на мукі двух народаў — палякаў і беларусаў, — не чуючы іх стогнаў і крыкаў ад моцных расійскіх клешчаў, расійскія патрыёты галасілі на ўвесь свет: "Няма ніякай Польшчы і няма ніякай Беларусі! А ёсць адзіная і недзялімая матушка Русь". Шмат беларускіх грамадзян у той час было выслана разам з палякамі на катаргу ў Сібір, мільёны беларускіх і польскіх бежанцаў, уцякаючы ад вайны, кідалі свае хаты і вёскі і выязджалі ў Расію, дзе іх спаткалі голад і холад; тысячы беларусаў былі скалечаны альбо загінулі ў той вайне.

МАСАВЫ ТЭРОР І РАЗБУРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Праблема пераадолення шырока распаўсюджанай практыкі насаджэння "больш высокай" рускай культуры, стварэння спрыяльных умоў для развіцця культуры ўсіх нацыянальных супольнасцей Беларусі на фоне глабальнага панавання велікарускай нацыянальнасці вылучылася на першы план у працэсе ажыццяўлення т.зв. палітыкі беларусізацыі ў 1920-я гады. У дакументах пленумаў ЦК КП(б)Б, ЦВК БССР тады адкрыта ставілася пытанне аб тым, што рост беларускай культуры (мова, літаратура, школа, удзел беларусаў у палітычным, культурным і гаспадарчым жыцці) асабліва адстаў, калі параўнаць з рускай, яўрэйскай і польскай нацыянальнасцямі, што немагчыма вырашыць у БССР асноўныя задачы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва без удзялення выключнай ўвагі рабоце па развіцці беларускай культуры.

Даволі цікавай выглядае тагачасная трактоўка вытокаў і сутнасці нацыянал-дэмакратызму як "варожай ідэалагічнай сістэмы". Аказваецца, як пісаў у сваёй кнізе "Навука на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі" (1931 г.) акадэмік С.Вольфсан, яшчэ ў Ф.Багушэвіча і Я.Неслухоўскага (Я.Лучыны) сустракаюц-

ца ідэі, якія пазней увайшлі ў "жалезны інвентар" нацдэмакратызму — "ідэі аб тым, што беларусы маюць сваю гісторыю, з якой бачна, што Беларусь нікога не крыўдзіла, не спусташала. Яна толькі абаранялася. Дзякуючы гэтаму, яна — белая Русь, чыстая Русь, і не чырванеюць на ёй крывавыя плямы ад забойства суседніх народаў". Гэта азначала, на думку ворагаў беларушчыны, што менавіта тэорыя нацыянальнай самабытнасці і нацыянальнай культуры, на якую потым абапіраліся "нашаніўцы", "грамадоўцы", "неаадраджэнцкія шкоднікі", з'яўлялася асноўным ідэалагічным ядром беларускага дэмакратызму, галоўнай перашкодай ажыццяўленню курса на "збліжэнне сацыялістычных нацый у адзінай сям'і брацкіх народаў" і на стварэнне "агульначалавечага камуністычнага грамадства".

Барацьба супраць нацыянальна-дэмакратычнай ідэалогіі суправаджалася масавым тэрорам, ссылкамі і фізічным знішчэннем лепшых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, усіх тых, хто быў нераўнадушным да лёсу Айчыны і асмельваўся вымавіць хоць слова супраць нацыянальнага ўціску і заняволення. Паралельна ішло масавае скарачэнне колькасці беларускамоўных школ, народных дамоў, хатаў-чытальняў, выдання беларускіх кніг і газет. Былі ліквідаваны нацыянальныя сельсаветы, адбывалася замена беларусаў на кіруючых пасадах, а на месцы адкліканых і звольненых прызначаліся небеларусы (пераважна расійцы) альбо самыя паслухмяныя і вернападданыя Маскве мясцовыя кар'ерысты.

ПРЫМУСОВЫ БІЛІНГВІЗМ У ГОНАР "БРАТНЯЙ ДРУЖБЫ"

Тая ж сталінская рэпрэсіўная машына, тая ж паталагічная боязь нацыянальнага самавызначэння, усяго нацыянальна-спецыфічнага сталі прычынай далейшага ўзмацнення асімілятарскіх тэндэнцый у пасляваенны перыяд. Яны леглі ў аснову новага шырокамаштабнага эксперыменту па дэнацыяналізацыі беларускага грамадства, які суправаджаўся "укреплением" кіруючых кадраў Беларусі выхадцамі з розных абласцей РСФСР, адміністрацыйным увядзеннем т.зв. двухмоўя ў рэспубліцы і прымусовай русіфікацыяй сістэмы народнай асветы. Бюракраты ад навукі і адукацыі не грэбавалі ніякімі сродкамі, каб дагадзіць апантаным правадырам-інтэрнацыяналістам прадэманстраваць выключнасць і першынствуючае значэнне рускай мовы ў авалоданні "вышынямі навукі" і ўмацаванні "братняй дружбы" народаў СССР. Ды ўсё гэта, кажучы прама, вельмі адпавядала новаму павароту ў ажыццяўленні "ленінскай нацыянальнай палітыкі", акрэсленаму Сталіным 24 мая 1945 г. Менавіта ў гэты дзень на прыёме ў Крамлі "вялікі правадыр усіх часоў і народаў" адкрыта абвясціў рускі народ "руководящим народом", "наиболее выдающейся нацией из всех наций, входящих в Советский Союз".

Аб разбуральнай сіле прымусовага білінгвізму і рэалізацыі на практыцы

лозунга "Одна страна — один народ — один язык" сведчыла тое, што ўжо ў сярэдзіне 1970-х гадоў на беларускай мове размаўляла менш трэці карэннага насельніцтва рэспублікі (у асноўным сельскія жыхары старэй 35—40 гадоў), а 50—60 працэнтаў беларусаў карысталіся т.зв. трасянкай альбо нейкай змешанай руска-беларускай "паўмовай". Да сярэдзіны 1980-х гадоў практычна не захавалася ніводнага сацыяльнага інстытута, арыентаванага на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці. Ва ўсіх гарадах і райцэнтрах Беларусі не засталося ніводнай беларускамоўнай школы і ніводнага беларускамоўнага дзіцячага садка. Толькі на рускай мове ажыццяўлялася падрыхтоўка кадраў у ВНУ, тэхнікумах і прафтэхвучылішчах. Па колькасці выпускаемых кніг на нацыянальнай мове Беларусь займала апошняе месца сярод усіх рэспублік СССР.

Але ў той жа самы час, калі крызіс нацыянальнай культуры дасягнуў сваёй крытычнай кропкі, у афіцыйных дакладах і выступленнях на поўным сур'ёзе гаварылася аб тым, што палітыка сацыялістычнай дзяржавы, накіраваная на ўсебаковае развіццё ўсіх нацый і народнасцей краіны, з'яўляецца вызначальным арыенцірам духоўнага ўзбагачэння народа, плённага развіцця беларуска культуры. Так, напрыклад, на пленуме ЦК КПБ у сакавіку 1987 г. першы сакратар ЦК КПБ Я.Сакалоў сцвярджаў, што ў Беларусі створаны ўсе ўмовы для свабоднага развіцця беларускай мовы і нацыянальнай культуры, што рэспубліка стала рэгіёнам развітога двухмоўя, якое аказвае пазітыўнае ўздзеянне на росквіт яе культуры. Катэгарычную нязгоду з такой ацэнкай выказалі многія дзеячы культуры і мастацтва Беларусі, якія ў сваім звароце ў ЦК КПСС ад 4 чэрвеня 1987 г. пераканаўча, на канкрэтных лічбах і фактах паказалі трагічныя вынікі дэнацыяналізацыі ў сферы адукацыі, кнігавыдавецкай справы, СМІ, і падкрэслілі, што свабоднае волевыяўленне ў выбары мовы, на якое спасылаўся Сакалоў, часцей за ўсё абарочвалася свабодным прымусам да рускай. Вельмі павучальным з'яўляецца і той факт, што аўтары пісьма, а яго падпісалі 137 чалавек, выказалі ўпэўненасць, што русіфікацыя Беларусі, якая праводзілася бюракратычным апаратам, і знішчэнне беларускай мовы не можа не выклікаць у рускага народа і прагрэсіўнай рускай інтэлігенцыі пачуццё сораму і пратэсту (гл.: Гражданские движения в Белоруссии: документы и материалы. 1986—1991. М., 1991. С. 286—289).

"КАЛІ Ў ВАШУ ХАТУ ПРЫЙШЛІ ЗЛОДЗЕІ..."

Праз некаторы час, роўна за тыдзень да сумна вядомых падзей 30 кастрычніка 1988 г., у ЦК КПБ адбылася нарада па пытаннях "палітычнага характару", на якой партарганізацыі і праваахоўныя органы атрымалі канкрэтную ўстаноўку ў сувязі з запланаваным апазіцыяй святкаваннем "Дзядоў", якая гучала прыкладна так: "Калі ў вашу хату прыходзяць злодзеі, вы павінны выставіць іх за дзверы". Ну, а як на практыцы былі рэалізаваны гэтыя ўстаноўкі,

усе мы добра памятаем. Здаецца, гэта была неблагая рэпетыцыя-праверка трываласці таго "жалезнага кулака", якім сёння размахваюць улады перад сваімі падданымі, і ад адной маніфестацыі да другой дэманструюць гатоўнасць выкарыстаць яго супраць мірных, бяззбройных і безабаронных грамадзян.

А ўзяць сучасных славянафілаў-заходнерусаў. Як вядома, першым на афіцыйным узроўні тэзіс аб "славянскім адзінстве" "тэарэтычна" абгрунтаваў В.Кебіч, які прама і катэгарычна заявіў, што Беларусі наканавана жыць адной сям'ёй з Расіяй і Украінай. І няўцям было беднаму прэм'еру, што падкінутая яму ідэйка выцягнута з арсенала "класічных" славянафілаў, якія ніколі не любілі ні свой народ, ні тым больш сваіх "адзінакроўных" братоў з усходу і захаду. А ў нашыя дні яе на Беларусь першым прывёз ніхто іншы, як сам А.Баркашоў. Аказваецца, летам 1991 г. старшыня праўлення Славянскага Сабора (ён жа лідэр прафашысцкай арганізацыі "Рускае нацыянальнае адзінства") арганізаваў у Мінску выязное пасяджэнне, на якім прадстаўнікі "з 58 гарадоў свету" абмяркоўвалі пытанні выжывання дзяржаўных структур, падрыву боегатоўнасці арміі і распальвання нацыяналістычнай істэрыі ў славянскіх краінах". Ён адназначна і небессэнсоўна сказаў, што каб выратаваць былую імперыю і "запаліць энтузіязм людзей", ёсць "адзіны шлях — стаўка на славянскую ідэю, якая заключаецца ў пабудове адзінай, магутнай, справядлівай дзяржавы" ("7 дней", 1991, 8—14 ліпеня). А ў канцы таго ж года першы сустаршыня міжнароднай арганізацыі Славянскі Сабор С.Карпаў, які прыехаў у Мінск для "каардынацыі дзейнасці беларускіх патрыятычных сіл", паставіў задачу кансалідавацца на ідэі захавання славянства як асаблівай цывілізацыі і выказаў упэўненасць у тым, што ў працэсе адраджэння славянства галоўную місію выканае Беларусь. Маўляў, тут лепш захаваліся славянскі дух і традыцыі, людзі працалюбівыя, добрыя і адкрытыя ("7 дней", 1991, 7—13 кастрычніка). Падобныя парады праз беларускія афіцыйныя СМІ распаўсюджвалі такія эмісары з братняй Расіі, як У.Жырыноўскі, Д.Васільеў, В.Алксніс, Н.Андрэева, В.Аксючыц, А.Праханаў і інш.

Ну, а потым гэтыя "глыбакадумныя" парады-рэкамендацыі клаліся ў аснову праграмных дакументаў і практычнай дзейнасці афіцыйна зарэгістраваных беларускіх "славянскіх сабораў" і "народных рухаў", лідэрамі якіх па дзіўным супадзенні аказваліся чыноўнікі з урадавых кабінетаў, а таксама розных мясцовых філіялаў ЛДПР, РНА, "Памяці" і да т.п. Варта таксама прыгадаць, што незадоўга да таго памятнага выступлення Вячаслава Францавіча з абгрунтаваннем "асноўнай мэты свайго жыцця" ў друку з'явілася серыя артыкулаў аднаго з тагачасных ідэолагаў "славянскага нацыянальна-вызваленчага руху", у якіх сцвярджалася, што зыход бітвы за Расію, за ўсю славянскую цывілізацыю ў многім залежыць ад нейтралізацыі "іншароднага цела" (сіянізму) і што калі "Народны Трыбунал Справядлівасці" прыгаворыць "агентаў уплыву" (г.зн. тых, хто разваліў СССР) да смяротнай кары, то "именем ввергнутого ими в страда-

ния народа она должна быть исполнена через повешение. Они не достойны расстрела" ("Политика. Позиция. Прогноз". 1993. Выпуск № 1). Вось такім шляхам рэкамендавалі тады аднавіць і ўсталяваць "мощную евразийскую державу", а значыць, дасягнуць т.зв. "славянскага адзінства".

ДЭНАЦЫЯНАЛІЗАВАНАЕ ГРАМАДСТВА І АЎТАРЫТАРЫЗМ

Уся гэтая дэмагогія і блюзнерска-рэпрэсіўная лексіка мелі на мэце разбурэнне этнічнай самасвядомасці беларусаў і пераўтварэнне іх у "казённых парабкаў-пралетарыятаў без сваёй гаспадаркі, без сваёй бацькаўшчыны і без уласнай волі" (А.Станкевіч). Калі ж сказаць прасцей — дык выхаванне звычайнага чалавека "натоўпу", бяздумнага выканаўцу чужой волі, які апеліруе толькі да "моцнай" улады і "моцнага" лідэра і праз іх навязвае грамадству свой густ і норавы. А з "масавай", дэнацыяналізаванай псіхалогіяй вельмі лёгка захапіць уладу і трымаць народ у паслушэнстве, выкарыстоўваючы надзвычайныя меры кіравання, пазаправавыя, гвалтоўныя метады расправы з апазіцыяй і нацыянальна свядомай часткай грамадства, перакладваць віну за правалы ў сваёй палітыцы на міфічных унутраных і знешніх ворагаў.

Ну, скажыце, калі ласка, як тут не ўспомніць былых славянафілаў, якія не прызнавалі асобнасці, асабліва палітычнай, іншых славянскіх народаў, апрача расійцаў, і лічылі, што ўсе гэтыя народы павінны зліцца ў адзін народ — расійскі і падацца пад кіраўніцтва расійскага цара.

Ды аб якой наогул славянскай салідарнасці можа ісці размова, калі ў жыцці такой салідарнасці ніколі не было і няма. "Расеец душыць беларуса і ўкраінца, чэх славака, серб — балгара і харвата, душаць і іншыя, словам, аж зямля славянская стогне ад "братняй салідарнасці", — так пісаў В.Гадлеўскі ў 1939 г. у газеце "Беларускі фронт", якая выходзіла ў Вільні ("Спадчына", 1993, № 2). А якая была славянская салідарнасць, скажам, у нашыя часы? Хто накрыў за адну ноч танкамі і бронетранспарцёрамі братнюю Чэхаславакію і задушыў распачатую там "аксамітную рэвалюцыю"? Хто прымусіў браніраваным кулаком растаптаць польскую "Салідарнасць", а разам з ёю і свабодалюбівыя памкненні брацкага польскага народа, якому яшчэ класікі марксізму завяшчалі стаць апорай дэмакратыі ў Еўропе? А хто, нарэшце, у паўночнай тайзе і тундры ў тысячах канцлагераў ГУЛАГа знішчаў мільёны сваіх родных братоў-расіян, украінцаў, беларусаў і ўсіх без разбору класавых ворагаў-іншародцаў? А хто сёння праяўляе такую міласэрнасць і трывогу за лёс аднаго з братніх славянскіх народаў былой Югаславіі і не заўважае яго здзекаў і нянавісці да другога такога ж народа?

Іншымі словамі, дзякуючы непадзельнаму ўладаранню іншаземных і мясцовых дэнацыяналізаваных гаспадароў Беларусь неаднойчы ахопліваў гістарычны нацыянальны анабіёз. На вялікі жаль, яе спрадвечнае імкненне да ўласнай самабытнасці і палітычнай незалежнасці не можа быць рэалізавана і

сёння, ва ўмовах дэкларованага суверэнітэту і фармальна дзеючай Канстытуцыяй. Прычына — усё ў той жа дэнацыяналізаванасці грамадства, касмапалітызме і ваяўнічай антыбеларушчыне некаторых уладных структур, партый і рухаў.

Наглядным праяўленнем гэтых дэфармацый сталі наступствы ініцыіраванага ўладамі рэферэндуму ў маі 1995 г. Яго вынікі садзейнічалі рэзкаму згортванню працэсаў беларусізацыі ў розных сферах грамадскага жыцця і сталі свайго роду прысудам беларускай мове да яе поўнага заняпаду і ціхага сканання. Па звестках Міністэрства адукацыі і навукі, у 1995—1996 навучальным годзе каля 70 працэнтаў першакласнікаў былі аддадзены бацькамі ў рускамоўныя класы, значна зменшылася колькасць навучэнцаў у 2—4 класах з беларускай мовай навучання. У Мінску ў гэтым жа годзе толькі 20 працэнтаў першакласнікаў навучаліся на беларускай мове. І гэта ў той час, калі літаральна яшчэ з год назад лічылася, што рускіх школ у перспектыве павінна застацца 12 працэнтаў — столькі, колькі жыве рускіх у Беларусі. Шпаркімі тэмпамі пайшоў працэс русіфікацыі ў сферы культуры, у сродках масавай інфармацыі, на Беларускім радыё і тэлебачанні.

Сказанае зусім не азначае прыніжэння альбо адмаўлення ролі прагрэсіўнай рускай культуры ва ўзбагачэнні духоўнай культуры беларускага народа, хаця гэты працэс ішоў пераважна ва ўмовах татальнай русіфікацыі і дэнацыяналізацыі. Вядома, да прыкладу, што "саблазну" расійскага месіянства і нейкай выключнай ролі рускага народа не паддаліся такія вядомыя дзеячы рускай культуры, як В.Астаф'еў, А.Ахматава, І.Бунін, М.Бярдзяеў, Д.Гранін, С.Залыгін, С.Кавалёў, Б.Пастэрнак, А.Платонаў, Д.Ліхачоў, А.Сахараў, Д.Шастаковіч і інш. З нацыянал-камуністычнымі і шавіністычнымі намерамі сённяшніх куміраў многіх падманутых і абяздоленых расіян не маюць нічога агульнага сапраўдныя патрыёты братняй Расіі. Так што не аб "русафобіі" сёння трэба трывожыцца тым, хто "дамагаецца" разумення і дапамогі ад "старэйшага брата". Лепш трэба паклапаціцца аб тым, як вывесці з нашай беларускай сям'і агрэсіўную "беларусафобію", бо нянавісць да сваёй уласнай гісторыі і культуры, да свайго народа несумяшчальная з праяўленнямі ісцінай любові і павагі да іншых народаў.

Такім чынам, паспяховае вырашэнне праблемы пераадолення вынікаў масавай дэнацыяналізацыі беларускага грамадства бачыцца не толькі ў захаванні нацыянальнай адметнасці і супраціўленні ціску разбуральных для этнасу абставін, а перш за ўсё ва ўмацаванні суверэнітэту дзяржавы, які выступае як замацаванне незалежнасці нацыянальнай самасвядомасці, прававая аснова функцыянавання і абароны нацыянальнай культуры. Але для таго, каб беларуская культура стала сапраўды свабоднай і незалежнай, трэба яснае ўсведамленне ўсім народам таго, што яго пастаяннае жаданне свабоды і незалежнасці духу можна ператварыць у чын.

("Літаратура і мастацтва", 12 ліпеня 1996 г.)

МЕНТАЛЬНАСЦЬ ГРАМАДЗЯН БЕЛАРУСІ Ў СУЧАСНЫ ПЕРЫЯД

Звычайна вельмі істотны ўплыў на развіццё грамадства аказвае т.зв. фактар ментальнасці, на які раней у айчыннай гуманістыцы і ў сацыяльнай практыцы не звярталі фактычна ніякай увагі. Сфера ментальнасці заўсёды ўяўляе сабой надзвычай важны і неад'емны аспект жыццядзейнасці кожнага соцыума на ўсіх этапах яго гістарычнай эвалюцыі. Таму цяпер прыкметна ўзрастае навуковая актуальнасць і практычная значнасць усебаковага, уважлівага даследавання такога складанага феномена, як ментальнасць (г.зн. спосаб мыслення, склад розуму) розных супольнасцей людзей ці асобнага чалавека.

Ментальнасць (або менталітэт) можна яшчэ вызначыць і як глыбінны ўзровень калектыўнай і індывідуальнай свядомасці, на якую ў немалой ступені ўплываюць і бессвядомыя, ці падсвядомыя імпульсы. Пры гэтым ментальнасць фарміруецца ў залежнасці ад этнакультурных асаблівасцей, традыцый, сацыяльных структур, і ў той жа час яна сама іх пэўным чынам фарміруе, выступаючы як цяжкавытлумачальны выток культурна-гістарычнай эвалюцыі. Увогуле, на складванне і эвалюцыю менталітэту так ці інакш ўздзейнічаюць як прыроднабіялагічныя фактары (генатып чалавека, агульны генафонд народа, ландшафт і клімат месца пражывання), так і сацыяльныя (адметныя рысы сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага, культурнага жыцця, асаблівасці сацыяльнай стратыфікацыі, сацыялізацыі і адаптацыі індывідаў, груп насельніцтва да канкрэтных абставін свайго жыцця і інш.).

Даволі даўно ўжо было слушна заўважана, што кожная гістарычная эпоха мае свае адмысловыя забабоны, і ў нечым яна нагадвае індывідуальную душу, вызначаецца сваімі асаблівасцямі, спецыфічнымі якасцямі свядомасці. Паколькі грамадства складаецца з асобных індывідаў, арганічна "ўключаных" у дзейнасць разнастайных сацыяльных груповак, калектываў, арганізацый, то можна дастаткова ўмоўна лічыць, што менавіта сукупнасць індывідуальных і калектыўных ментальнасцей адпаведным чынам адлюстроўвае і ментальнасць усяго соцыума, а таксама якой-небудзь эпохі, нацыі.

Пры гэтым варта адзначыць, што калектыўныя ўяўленні не могуць быць поўнасцю зведзены да індывідуальных, бо, як адначаў яшчэ стагоддзе таму назад сацыёлаг Э.Дзюркгейм, яны "выцякаюць" не з свядомасці індывідаў, узятых ізалявана, паасобку, а з іх аб'яднання, злучэння. Інакш кажучы, пры разглядзе менталітэту прадстаўнікоў этнічных супольнасцей неабходна мець на ўвазе, што ў ім асаблівасці індывідуальных светабачанняў нібы "сплаўлены" ў адзін цэласны феномен, унікальнасць якога якраз і тлумачыцца наяўнасцю калектыўных уяўленняў і пэўным уплывам т.зв. "калектыўнага бессвядомага" (вызначэнне належыць К.Г.Юнгу).

Усё вышэйсказанае абумоўлівае надзвычайную складанасць даследавання ментальнасцей, якія, напрыклад, французскі гісторык Ф.Брадэль называў сапраўднымі "цямніцамі". Падобныя цяжкасці выкліканы яшчэ і тым, што да сённяшняга часу практычна няма адзінай агульнапрызнанай, усебакова распрацаванай методыкі аналізу ментальных працэсаў. Таму навукоўцы розных профіляў (гісторыкі, філосафы, культуролагі, псіхолагі і інш.) неаднолькава падыходзяць да высвятлення сутнасці і адметных рысаў ментальнасці прадстаўнікоў асобных гістарычных эпох, краін, сацыяльных груп.

На наш погляд, адным з найбольш аптымальных падыходаў можна лічыць аналіз ментальнасці этнічных супольнасцей праз вывучэнне іх мовы, а таксама вуснай народнай творчасці — фальклору. Мажліва, менавіта ў асаблівасцях мовы і ў змесце аўтэнтычных фальклорных твораў найлепшым чынам адлюстраваліся адметныя рысы светабачання, спосаба мыслення, склада розуму таго ці іншага народа, яго глыбінныя ўстаноўкі, жыццёвыя арыентацыі, патаемныя мары, спадзяванні, адпаведныя эмоцыі і пачуцці.

Аб'ектам дадзенага даследавання з'яўляюцца грамадзяне Беларусі рознай сацыяльнай, прафесіянальнай, нацыянальнай, полаўзроставай прыналежнасці як непасрэдныя "носьбіты" ментальнасці. Прадметам даследавання можна лічыць адмысловыя рысы светабачання грамадзян, асаблівасці іх уяўленняў аб прасторы і часе, сваім сацыяльным і прыродным асяроддзі, а таксама грамадска-палітычных арыентацый людзей. Высвятленне адметнасцей ментальнасці насельніцтва Беларусі будзе праводзіцца праз аналіз твораў беларускага фальклору, а таксама вынікаў разнастайных сацыялагічных даследаванняў.

АСАБЛІВАСЦІ МЕНТАЛЬНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ПАВОДЛЕ ФАЛЬКЛОРНЫХ КРЫНІЦ

Традыцыйная ментальнасць беларусаў выпрацоўвалася вельмі працяглы гістарычны перыяд і набывала свае тыповыя рысы ў адмысловых абставінах сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і духоўна-культурнага жыцця. Вытокі беларускага менталітэту пачалі фарміравацца ў перыяд панавання на Беларусі язычніцтва (паганства) з яго шматлікімі арыгінальнымі культамі, звычаямі і абрадамі. Да прыняцця хрысціянства жыхарам беларускіх зямель былі ўласцівы політэізм (вера ў адначасовае існаванне многіх багоў), пантэізм (абагаўленне нябесных свяціл, зямлі, дрэў, крыніц, камянёў і іншых прыродных з'яў), анімізм (перакананне ў рэальным існаванні душы, добрых і злых духаў, антропамарфізм (упадабленне чалавеку, надзяленне чалавечымі рысамі прадметаў і з'яў прыроды, розных жывёл, міфічных істот), татэмізм (уяўленні аб звышнатуральнай роднасці паміж людзьмі і пэўным відам жывёл, раслін), фетышызм слова, або вербальная магія (вера ў цудадзейную сілу асобных слоў, выразаў).

Акрамя таго, ментальнасць старажытных людзей вызначалася падсвядомым, іррацыянальным адчуваннем шчыльнай узаемасувязі паміж чалавекам і прыродай,усім навакольным асяроддзем, Сусветам. Этнолаг і міфолаг М.Эліадэ адно з галоўных адрозненняў паміж чалавекам архаічнага і сучаснага грамадстваў бачыў у тым, што першы заўсёды адчуваў сябе непарыўна звязаным з Космасам і касмічнымі рытмамі, тады як сутнасць другога заключаецца ў яго сувязі з гісторыяй. Увогуле, у перыяд язычніцтва светабачанне людзей было пераважна міфалагічным, характэрнымі рысамі якога (акрамя ўжо названых) можна яшчэ лічыць дыфузнасць, слабое ўсведамленне розніцы паміж прасторай і часам, словамі і рэчамі, прычынай і следствам, а таксама выкарыстанне катэгорый супрацьпастаўлення, пэўныя метафарычнасць і містычнасць.

Варта адзначыць, што на працягу многіх наступных стагоддзяў (ажно да сучаснага перыяду) ментальнасць беларусаў, якой у старажытнасці былі ўласцівы ўсе вышэйпералічаныя асаблівасці, у асобных сваіх рысах заставалася па сутнасці дахрысціянскай, язычніцкай. Яскравым пацвярджэннем падобнага меркавання могуць служыць многія творы надзвычай багатага беларускага фальклору, які слушна лічыцца, бадай, самым архаічным і найлепш захаваўшым сваю старажытную аснову сярод вуснай народнай творчасці ўсіх славянскіх і многіх іншых еўрапейскіх народаў. Сапраўды, у немалой колькасці беларускіх каляндарна-абрадавых і пазаабрадавых песняў, легендаў і паданняў, прыказак і прымавак адчуваюцца відавочныя сляды язычніцкіх антропамарфізму, анімізму, пантэізму, фетышызму. Тыповымі прыкладамі міфалагічнай свядомасці можна небеспадстаўна лічыць такія выказванні з сучаснага беларускага фальклору, як “Ой рана, рана да сонца іграла”, “Згубіла зара ключы // Каля постаці йдучы”, “Ішла Купалка сялом, сялом”, “Прыехала Каляда ўвечара, ўвечара”, “Ой, рабое поля, рабоя // Радзіла жыта густоя”, і інш.

На працяглае захаванне шматлікіх рэшткаў язычніцтва ў немалой ступені паўплывала і тое, што абсалютную большасць беларусаў да пачатку XX ст. складалі непісьменныя або малапісьменныя сяляне, у свядомасці якіх вельмі доўга працягвалі існаваць пераважна міфалагічна-містычныя, іррацыянальныя ўяўленні і ўсялякія забабоны, прымхі. Таму натуральна, што архаічна-язычніцкая па сваёй глыбіннай сутнасці ментальнасць была нібы “закансервавана” ў асяроддзі беларусаў-сялян на многія стагоддзі.

Асобныя этнаграфічныя апісанні, канкрэтныя назіранні падарожнікаў сведчаць, што нават і ў XX ст. у некаторых мясцовасцях, напрыклад, на Палессі, сустракаліся людзі, якія шмат у чым прытрымлівалися паганскіх вераванняў, звычаяў, напрыклад, пакланяліся дрэвам, крыніцам, камяням і г.д. Ды і зараз некаторыя беларусы (найчасцей сяляне старога ўзросту) шчыра вераць у рэальнае існаванне шматлікіх злых духаў — лешых, русалак, чарцей, ваўкалакаў і іншай “нечысці”, маюць разнастайныя прымхі і забабоны. Да сказанага можна дадаць яшчэ і той факт, што ў сучаснай беларускай мове захаваліся, скажам,

такія словы язычніцкага паходжання, як "зніч" (г.зн. святы агонь), "пярун" (слова паходзіць ад назвы аднаго з вярхоўных багоў старажытных славянаў і выкарыстоўваецца для абазначэння ўдару маланкі).

Аднак па меры пашырэння з пачатку II тыс. н.э. хрысціянства сярод насельніцтва беларускіх зямель пачала адбывацца своеасаблівая канвергенцыя (спалучэнне) дзвюх ментальнасцей — язычніцкай і хрысціянскай, элементы кожнай з якіх спачатку даволі цесна "перапляталіся" ў светабачанні тагачасных насельнікаў Беларусі. З цягам часу да некаторых старажытных народных святаў (Каляды, Вялікдзень, Сёмуха, Купалле) царква прымеркавала свае рэлігійныя святы (адпаведна Ражство Хрыстова, Уваскрэсенне Хрыстова, Святая Тройца, Іаан Прадцеча). Уплыў хрысціянства заўважаецца і ў адначасовым суіснаванні ў ментальнасці беларусаў вобразаў язычніцкіх багоў і хрысціянскіх святых, напрыклад, Пяруна і Іллі, Ярылы і Юр'я, і г.д. У асобных беларускіх фальклорных творах (найперш у песнях, казках, легендах) таксама адначасова суіснуюць як язычніцкія, так і хрысціянскія вобразы, матывы.

Аб працяглым захаванні ў ментальнасці беларусаў элементаў язычніцкай свядомасці пераканаўча сведчыць і аналіз такога спецыфічнага жанру фальклорных твораў, як замовы (альбо загаворы, шэпты), г.зн. славесныя выказванні, якім надавалася магічнае значэнне. У мінулым разнастайныя замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю, сямейна-бытавымі адносінамі, каханнем (т.зв.прысушкі і адсушкі), лячэннем хвароб, былі дастаткова шырока распаўсюджаны найперш у сялянскім асяроддзі. Тады многія беларусы (як некаторыя, дарэчы, і зараз) шчыра верылі ў рэальнае ўздзеянне падобных загавораў, заклінанняў на жыццядзейнасць чалавека і ў незвычайныя магчымасці іх асноўных "носьбітаў"— знахараў, або шаптуноў, чарадзеяў. У большасці такіх твораў сустракаюцца відавочныя рысы анімізму, пантэізму, антропамарфізму. Гэта выяўляецца, напрыклад, ва ўслаўленні сонца, месяца, зорак, рэк, крыніц, дрэў, камянёў, "святога" агню, "жывой" вады, веры ў існаванне розных духаў, персанажаў народнай дэманалогіі. Ды і ўвогуле ужо сам факт выкарыстання ўсялякіх загавораў, шэптаў, прысушак і адсушак з'яўляецца па сутнасці адлюстраваннем старажытна-язычніцкай веры чалавека ў надзвычайную сілу вербальнай магіі.

Уяўленні беларусаў аб прасторы і часе фарміраваліся на працягу многіх стагоддзяў пад уплывам разнастайных фактараў, сярод якіх адным з найважнейшых можна лічыць прыродна-геаграфічны. Сапраўды, ландшафтна-кліматычныя ўмовы Беларусі ў значнай ступені абумовілі і прасторава-часавыя ўстаноўкі, арыентацыі беларусаў. У мінулым нашым продкам была ўласціва дастаткова моцная прывязанасць да сваёй зямлі, родных мясцін. Таму сярод беларусаў былі распаўсюджаны антропаморфныя погляды на зямлю, схільнасць да яе "ачалавечвання", для пацвярджэння чаго дастаткова прыгадаць вядомыя народныя выказванні: "Зямля — матка, і корміць, і поіць, і адзяваець", "Зям-

ля — нас усіх маці, яна нас корміць, яна нас прыгорне", "Зямелька нас корміць, а сама есці просіць", а таксама эпітэты святая, добрая ў адносінах да сваёй зямлі.

Аб своеасаблівым "зніжэнні" паняццяў аб Радзіме да ўзроўню архетыпаў "роднага краю", "кутка", "хаткі" сведчыць мноства беларускіх фальклорных твораў, найперш прыказак і прымавак: "Кожнаму свой куток мілы", У сваім краю, як у раю", "Дарагая тая хатка, дзе мяне радзіла матка","Мілы той куток, дзе рэзаны пупок", "Дзе маці нарадзіла, там і радзіма" і інш. Аднак у адрозненне ад прыведзеных, у сучасных фальклорных творах паняцце аб Радзіме ўжо найчасцей звязваецца з усёй нашай краінай, аб чым сведчаць наступныя выказванні: "Беларусь — мая Радзіма", "родная, дарагая Беларусь" і інш.

Пры гэтым беларусы нярэдка як бы супрацьпастаўлялі замілаванне, любоў да роднай старонкі пачуццю некаторай адчужанасці і няўтульнасці ў іншых мясцінах: "Чужбіна не грэець", "Чужая старана тугою арана, слёзкамі засявана", "Чужая старана — цёмны лес", "Чужбіна не родная матка: хлеба не дасць", "Родная зямля — маці, чужая старонка — мачаха". Падобныя дыхатамічныя ўяўленні, або т. зв. бінарныя апазіцыі (да якіх яшчэ можна аднесці і такія супрацьпастаўленні, як "свае—чужыя", "мы—яны", "пачатак—канец", "вясна—восень", "зіма—лета", "дзень—ноч" і інш.) заўсёды былі ўласцівы беларускай ментальнасці. А як вядома, мысленне ў катэгорыях такіх бінарных апазіцый з'ўляецца тыповым для архаічна-язычніцкай, міфалагічнай свядомасці.

Відаць, невыпадкова ў вышэйпрыведзеных і ў многіх іншых народных выказваннях ("Ідзі ў родны край, там і пад елкаю рай", "Усякаму міла свая старана", "Што край — то абычай, што старана — то навіна", "На чужой старане і вясна не красна", "Нічога не знаю, мая хата з краю" і да т.п.) для абазначэння прасторавых паняццяў найчасцей выкарыстоўваюцца словы з "цэнтрабежным", перыферычным значэннем — край, старана. Прыкладна тая ж самая "перыферычнасць" свядомасці ўласціва і рускай ментальнасці ("Родимая сторона — мать, а чужая — мачеха", "Своя сторона по шерстке гладит, чужая — насупротив"), у адрозненне ад якой балгарская свядомасць, на думку даследчыка нацыянальных вобразаў свету Г.Гачава, акцэнтуе ўвагу не па краях, а глядзіць пераважна на цэнтры, ядры розных з'яў і рэчаў. Пры гэтым, напрыклад, для германскай, амерыканскай, французскай ментальнасці ў цэлым не характэрна ўспрыняцце свайго навакольнага асяроддзя як чагосьці вельмі блізкага, роднага, кроўнага.

У беларускім менталітэце няма схільнасці да бяскрайніх прастораў, бязмежнага раздолля, што, наадварот, відавочна заўважаецца ў рускіх, украінцаў. У рускай мове існуюць паказальныя выказванні накшталт "Простору на все четыре стороны много", "Земля наша пространна" (дарэчы, і само слова "пространство" паходзіць хутчэй ад "страна"). У рускіх гістарычных песнях і ва ўкраінскіх думах нярэдка сустракаюцца вобразы шырокіх далін, бяскрайніх

стэпаў, вялікіх дарог, высокіх гораў, глыбокіх сініх мораў, што натуральна адсутнічае ў беларускім фальклоры. У апошнім невыпадкова найчасцей узгадваюцца такія найбольш распаўсюджаныя архетыпы мясцовага краю і прыроды, як лес, балота і поле ("Лес чуе, а поле бачыць", "Слухай, дуброва, што лес гаворыць", "Балота без чорта не будзе", "Абы балота, то і чорт будзе"). Варта адзначыць, што ў прыведзеных беларускіх прыказках яўна адчуваюцца асобныя рысы антропамарфізму, анімізму, веры ў вобразы народнай дэманалогіі (сярод якіх менавіта "чорт" і па сёння з'яўляецца самым пашыраным і "папулярным" у народзе персанажам).

Уяўленні беларусаў аб часе нярэдка існавалі як бы злітна, паяднана з прасторавымі арыентацыямі ("На свеце ўсяляк бывае", "Як бы чалавек знаў, дзе спаткнецца, то б абышоў тое месца", "Не за нас свет пачаўся і не за нас скончыцца" і інш.). Аднак у беларускім фальклоры ёсць мноства выказванняў, непасрэдна прысвечаных разуменню часу — "На ўсё трэба час", "Час не чакае", "Усё свой час мае", "Час на час не ўдаецца". Як бачна, беларусы даволі добра разумелі зменлівасць, незваротнасць "цячэння" часу, яго важнасць для чалавечай жыццядзейнасці. Аб гэтым жа сведчаць і многія іншыя фразеалагізмы, у якіх узгадваецца не абстрактны "час", а дакладна акрэсленыя часавыя адрэзкі: "Што гадзіна, то навіна", "На год сем прыгод, а на вяку — без ліку", "Гадзіна гадзіне, год году — розь", "У адзін дзень сем перамен", "Учарашняга дня не дагоніш", "Дзень наш, век наш". Асобныя прамежкі часу ў беларусаў іншым разам персаніфіцыраваліся з чалавекам: "Год — вялікі чалавек", "Дзень дню розь: адзін — матка, а другі — мачаха", што з'яўляецца, верагодна, адлюстраваннем старажытнага антропамарфізму.

Увогуле, сам беларускі тэрмін "час" семантычна паходзіць ад слоў "часаваць", "чакаць", што ўскосна можа сведчыць аб пэўнай замедленасці, нетаропкасці руху часу ў ментальнасці беларусаў. Дарэчы, беларускае ўспрыманне часу ў пэўным сэнсе нагадвае рускае, бо, скажам, слова "время" верагодна паходзіць ад "временить", а "год" — ад "годить", г.зн. ждать. Прычым расійскі фальклярыст Ул.Даль прыводзіць і такое паказальнае слова, як "временитель", што значыць чалавек нерашучы, "медлитель", а таксама шэраг рускіх прыказак з сэнсам апраўдання некаторай прамарудлівасці: "Поспешишь — людей насмешишь", "Тише едешь — дальше будешь", "Сколько лет, сколько зим прошло", "Век жить, век ждать" (дзеля параўнання прыгадаем тут адпаведныя беларускія выказванні "Паволі едучы, далей будзеш", "Многа вады ўплывець, пакуль чалавек таго дажывець", "Прытка едзеш — галаву звернеш"). Звяртае на сябе ўвагу і невыпадковая схільнасць да азначэння часавых змен у паняццях накшталт "прайшло", "уплыло" і да т.п.

З аналізу розных фальклорных крыніц можна зрабіць выснову і аб досыць прыкметнай "спавернутасці" ментальнасці беларусаў да мінулага, былых нормаў жыцця і традыцый. Беларус увесь час нібыта азіраецца назад, з-за чаго

сённяшняе і будучае паўстаюць нейкімі неакрэсленымі, цьмянымі, нібы другараднымі: "Пакуль жыць, не забыць", "Што было — то ведаем, а што будзе — то ўгледзім", "Даўней было складаней", "Што было, то было, ужо ўсё перамінула", "Няма чаго наперад загадваць", "Ці так , ці сяк — няхай будзе" і інш.

Жывыя ўспаміны аб даўно мінулых часах адлюстраваліся ў многіх беларускіх легендах, паданнях, гістарычных песнях, баладах, казках. Так, тыповымі сведчаннямі своеасаблівага кансерватызму ментальнасці беларусаў з'яўляюцца фраза з аднаго беларускага падання: "Гэтак жылі прадзеды і дзяды", якую нашы продкі казалі ў апраўданне сваёй няздольнасці палепшыць сваё нярэдка гаротнае жыццё, а таксама сярэднявечны дзяржаўна-палітычны прынцып "старыны не рухаць" і абапірацца на "прыклад нашых продкаў". Між іншым, невыпадкова на Беларусі яшчэ з дахрысціянскіх часоў быў вядомы культ продкаў, з якога пазней узнік народны памінальны абрад у памяць аб памерлых родзічах — "дзяды", які спраўляўся звычайна тры-чатыры разы ў год. У адрозненне ад падобных схільнасцей беларусаў, напрыклад, для дынамічных амерыканцаў больш уласціва арыентацыя не на мінулае, а найперш на сучаснасць і на будучыню (дастаткова прыгадаць хаця б знакамітую "амерыканскую мару").

Паколькі жыццё беларусаў заўсёды моцна залежала ад прыродных з'яў, ад розных пораў года, альбо прыродна-сезонных цыклаў, то ім быў уласцівы т.зв. "каляндарны модус" (накірунак) мыслення. Гэта пераканаўча пацвярджаецца пры разглядзе беларускага народнага календара і адпаведных яму фальклорных твораў. Як вядома, у беларускі народны каляндар традыцыйна ўключаюцца розныя святы і прысвяткі, якія адбываліся ў вызначаныя дні, тыдні на працягу ўсяго каляндарнага года — ад студзеня па снежань. У народным светабачанні большасць дзён года мела сваю дакладную назву, тады ж выконваліся адпаведныя абрады, дазваляліся асобныя віды работ (а часам, наадварот, поўнасцю забаранялася любая праца), праводзіліся адпаведныя гульні, спяваліся песні. Адлюстраваннем адмысловага "прыродна-каляндарнага" модусу ментальнасці беларусаў можна небеспадстаўна лічыць і тое, што назва кожнага месяца года была непасрэдна звязана з пэўнымі асаблівасцямі прыродных, кліматычных з'яў (успомнім хаця б красамоўныя назвы студзень, люты, сакавік, ліпень, лістапад, снежань, што, напрыклад, не ўласціва адпаведным рускім назвам).

Варта адзначыць, што ў сваёй аснове беларускі народны каляндар склаўся яшчэ ў старажытнасці, а затым з цягам часу паступова папаўняўся новымі святамі, абрадамі і г.д. Стагоддзямі ён выконваў ролю своеасаблівага арыенціра для жыццядзейнасці чалавека ў межах разнастайных часавых цыклаў (гадавых, сезонных, месячных, тыднёвых і сутачных). З усіх чатырох пораў года найбольшая ўвага відавочна надаецца беларусамі веснавому цыклу. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, вялікая колькасць менавіта веснавых песень (вяснянак),

якія найлепш захаваліся ў беларусаў, а таксама адмысловыя народныя абрады, практычна невядомыя іншым славянскім народам — "гуканне вясны", валачобніцтва. Дарэчы, спецыяльны аналіз беларускіх прыказак і прымавак паказаў, што найбольшая іх колькасць прысвечана менавіта вясне (каля 40, альбо 34,8 % ад усіх апублікаваных твораў) як часу абуджэння прыроды і пачатку асноўных сельскагаспадарчых работ, а найменшая — восені (усяго 15 твораў, або 13 %), тады як зіме і лету — прыкладна па 30 прыказак і прымавак (г.зн. па 26,1 %).

Як вядома, у кожную пару года адзначалася шмат "народна-рэлігійных" святаў (у якіх нярэдка своеасабліва перапляталіся язычніцкія і хрысціянскія элементы, матывы), але самым галоўным сярод іх было таксама веснавое — Вялікдзень, Уваскрэсенне Хрыстова, хаця і іншыя святы таксама мелі немалое значэнне (зімою — Каляды, Ражство Хрыстова; летам — Купалле, Сёмуха, Спас; восенню — Пакровы, Дзяды). З вялікімі і малымі святамі, прысваткамі нярэдка былі звязаны і выпрацаваныя стагоддзямі народныя прыкметы, гаспадарчыя назіранні ("Ад Каляд не ідзець у лад", "З Вялікдзеня птушкі пачынаюць пець", "Да Міколы няма дабра ніколі", "Прышоў Спас — усяму час" і інш.). Увогуле, розныя віды працоўнай дзейнасці і адпачынку, усялякія дазволы і забароны беларусаў заўсёды прымяркоўваліся да святочных дзён, а таксама часу перад імі і пасля іх ("Барыс — за саху бярысь", "Ілля блізкі: гніся, баба, нізка, уставай раненька, ды жні дапазненька","Па Міколі не сей аўса ніколі").

Аднак традыцыйная ментальнасць беларусаў, выпрацаваная стагоддзямі іх уласнага жыцця, была ў пэўным сэнсе дэфармавана ў перыяд існавання савецкай таталітарнай сістэмы. Калі браць пад увагу толькі фальклорныя творы савецкага часу, то своеасаблівым прыкладам "укаранення" (хаця нярэдка і паказнога, неглыбокага) ў свядомасць часткі беларусаў розных ідэалагем, г.зн. ідэалагічных установак і стэрэатыпаў, могуць служыць наступныя афіцыйна дазволеныя прыказкі і прымаўкі: "Ленінізм — верны шлях у камунізм", "Нам не страшна ў бядзе, бо нас партыя вядзе", "Рэвалюцыя прыйшла, людзям шчасце прынесла", "У калгасе жыць — шчаслівым быць", "Не спадзявайся на Бога — будзе з калгаса падмога", "Для савецкага народа кругом вольная дарога", "Савецкі народ — міру аплот" і шэраг іншых.

Але, безумоўна, не ўсе беларусы верылі ў такія пераважна штучна створаныя і ілюзорныя ідэалагемы, таму ўлады свядома замоўчвалі тыя народныя выказванні, у якіх выказваліся абсалютна супрацьлеглыя меркаванні: "Як у нашым у калгасе // Дысцыпліна паднялася //Адзін робіць, сем ляжыць // Ах, як добра стала жыць"; "Правадыр наш бацька Сталін // З ім заможнымі мы сталі // Працадзён у нас багата // А слёз, гора — поўна хата"; "Не баюся я марозу // Не баюся холаду // А баюся я калхозу // Што памру ад голаду" і да т.п. Таму відавочна, што нават і ў перыяд шматгадовага панавання адміністрацыйна-каманднай сістэмы пэўная частка насельніцтва нашай краіны захоўвала свае традыцыйныя

цыйныя рысы ментальнасці, не паддавалася ілжывай савецка-камуністычнай агітацыі і прапагандзе, накіраванай урэшце рэшт на паступовую аберацыю (г.зн. адхіленне) свядомасці сваіх грамадзян у неабходным уладам накірунку.

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ АРЫЕНТАЦЫІ ГРАМАДЗЯН БЕЛАРУСІ Ў СУЧАСНЫ ПЕРЫЯД

На працягу XX ст. ментальнасць і паводзіны не толькі насельнікаў нашай краіны, але і практычна ўсіх народаў свету дастаткова прыкметна змяніліся. Гэта ў значнай ступені было абумоўлена такім незвычайным сацыяльным феноменам, як "паўстанне мас" (вызначэнне Х.Артэгі-і-Гасета). Аднак яшчэ раней, прыкладна стагоддзе таму назад, выдатны французскі філосаф Г.Лебон прарочыў хуткі надыход "эры мас", якая непазбежна выведзе на авансцэну гісторыі натоўпы людзей, што ў сваю чаргу выкліча істотныя перамены ў жыццядзейнасці народаў. Ва ўмовах панавання натоўпу ("толпы") — гэтай "глебы, у якой караняцца ўсе нашы метафізічныя, палітычныя, рэлігійныя і сацыяльныя светапогляды", свядомая асоба знікае, прычым пачуцці і ідэі асобных індывідаў прымаюць адзін і той жа накірунак.

Падзеі наступных часоў пераканаўча пацвердзілі слушнасць такіх меркаванняў. Сапраўды, у XX ст. у выніку няўхільнага ўзрастання ролі аморфных мас узнік своеасаблівы тып "масавага чалавека", вызначальнымі рысамі якога можна лічыць бязлікасць, схільнасць да агрэсіўнасці, насілля і непрыняцця апазіцыйных настрояў, атаясамленне сябе з дзяржавай, абагаўленне моцнай улады, няздольнасць да стваральнай дзейнасці. На думку асобных заходніх даследчыкаў, падобныя асаблівасці ментальных установак, а таксама, напрыклад, ксенафобія, кансерватыўнасць, стэрэатыпнасць мыслення, арыентацыя на сілу і некрытычныя адносіны да існуючых парадкаў, з'яўляюцца тыповымі рысамі т.зв. "аўтарытарнай асобы", якая разглядаецца як аснова таталітарна-аўтарытарных рэжымаў. У краінах, дзе ўсталяваўся таталітарызм (а да такіх краін адносіўся і былы СССР), ён не толькі штучна абмяжоўваў свабоду мыслення, думкі, але і дыктаваў людзям, як увогуле трэба сябе паводзіць, думаць, гаварыць і адчуваць.

У апошнія гады Беларусь, як і многія іншыя краіны былой савецкай імперыі, ахапіў сістэмны, татальны крызіс. Увогуле, ён з'яўляецца заканамерным вынікам непазбежнага распаду любой таталітарнай дзяржавы. Аднак і пасля гэтага звычайна яшчэ даволі доўгі час для людзей застаюцца ўласцівымі некаторыя вышэйапісаныя рысы светабачання "масавага чалавека", "аўтарытарнай асобы". У выніку шматгадовага панавання савецкага таталітарнага рэжыму паступова склаўся адмысловы тып "савецкага чалавека" (т.зв. "homo soveticus"), ментальнасць якога вызначалася звычайна празмернай заідэалагізаванасцю, зацятым атэізмам, схільнасцю да ўсялякіх ксенафобій (найперш у выглядзе

нянавісці да шматлікіх замежных і мясцовых "ворагаў", непрыхільнасцю да іншадумства), кансерватызмам, нежаданнем прагрэсіўных грамадскіх змен і радыкальна-дэмакратычных пераўтварэнняў, разбурэннем нацыянальнай самасвядомасці, адрачэннем ад сваіх народных традыцый, роднай культуры, мовы і да т.п.

Адзначаныя тут асаблівасці ментальнасці "савецкага таталітарнага чалавека" ў тым ці іншым выглядзе працягваюць захоўвацца сярод часткі беларускага насельніцтва і ў сучасны перыяд, аб чым могуць сведчыць як асобныя падзеі мінулых гадоў, так і вынікі сацыялагічных даследаванняў (праўда, калі зыходзіць з пазіцыі аб тым, што апошнія выкананы высокапрафесійна, незаангажавана і маюць невялікую ступень "пагрэшнасці"). Так, яшчэ тры-чатыры гады таму назад незалежныя сацыялагічныя даследаванні сведчылі, што ў жыхароў Беларусі па-ранейшаму захоўваюцца дастаткова моцныя кансерватыўныя, настальгічныя арыентацыі (асабліва сярод сельскіх жыхароў і людзей старога ўзросту), а дэмакратычныя каштоўнасці, ідэі адкрытага грамадства, рынкавай эканомікі многімі ўспрымаюцца пакуль даволі слаба.

Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) у красавіку-маі 1992 г. правёў агульнарэспубліканскае сацыялагічнае апытанне "Жыццё ў наш час" дарослага насельніцтва (старэй за 16 гадоў) Рэспублікі Беларусь. Згодна з данымі гэтага апытання, амаль палова ўсіх рэспандэнтаў (47, 9 %) адказала станоўча на пытанне анкеты "Ці лічыце Вы неабходным аднаўленне СССР?", тады як адмоўны адказ далі 22 % апытаных. Пытанне "Якія з наступных груп насельніцтва з'яўляюцца для Вас найбольш непрыемнымі?" засведчыла, што сярод нашых суграмадзянаў самы высокі адмоўны "рэйтынг" маюць неафашысты (іх у якасці найбольш непрыемнай адзначылі 68, 8 % апытаных), нацыяналісты (адпаведна 56%) і прадстаўнікі сексуальных меншасцей (54,1%). Затым у падобным спісе ідуць сталіністы (46,3%), сіяністы (39,9%), камуністы (33,4%), манархісты (30,9%), прадпрымальнікі (16,1 %), дэмакраты (16 %) і, нарэшце, апошняе месца займаюць сацыялісты (12, 6 %). Прычым аказалася, што далёка не ўсе рэспандэнты традыцыйна да нацыяналістаў залічваюць прадстаўнікоў Беларускага Народнага Фронту (БНФ), бо, напрыклад, да апошніх станоўча ставяцца 22,7 % апытаных, якім непрыемны нацыяналісты.

Вынікі дадзенага даследавання пацвярджаюць, што ў сучасны перыяд ментальнасць грамадзян Беларусі вызначаецца прыкметнай інерцыйнасцю, кансерватыўнасцю (намі гэтае слова прымяняецца ў сэнсе т.зв. "савецкага кансерватызму" для вызначэння арыентацыі на захаванне сацыяльна-эканамічных і палітычных парадкаў савецкага мінулага), схільнасцю да ксенафобіі і некаторай агрэсіўнасці. Пры гэтым уражвае дастаткова высокі ўзровень непрыхільнасці насельніцтва да нацыяналістаў (як, на думку большасці рэспандэнтаў, тых людзей, што нібыта свядома распальваюць міжнацыянальную варожасць і

нянавісць да ўсяго іншаэтнічнага) і неафашыстаў, таму што ва ўмовах нашай краіны прадстаўнікоў названых палітычных плыняў практычна ўвогуле не існуе. Да таго ж, калі такія нават і ёсць, то яны, натуральна, не вызначаюць агульнага накірунку развіцця грамадства, не ўваходзяць у склад органаў улады і ўвогуле не ўяўляюць сур'ёзнай грамадскай небяспекі. Атрымліваецца, што ў значнай ступені непрыхільныя ментальныя ўстаноўкі часткі людзей да асобных сацыяльных груп насельніцтва недастаткова абгрунтаваныя, а часам і проста ўяўныя, ілюзорныя.

Аб прыкметнай палярызацыі, "разарванасці" ментальнасці грамадзян Беларусі могуць сведчыць рэйтынгі палітычных партый і грамадска-палітычных рухаў за апошнія гады. Падтрымка людзьмі дзвюх вядучых палітычных партый — Беларускага Народнага Фронту (БНФ) і Партыі камуністаў Беларусі (ПКБ), праграмныя мэты і задачы якіх нярэдка з'яўляюцца поўнасцю супрацьлеглымі, на працягу 1991—1995 гг. даволі моцна вагалася ў залежнасці ад найбольш важных, істотных падзей грамадскага жыцця. Так, у адпаведнасці з сацыялагічным апытаннем тысячы рэспандэнтаў у 55 населеных пунктах Беларусі (даследаванне ахоплівала ўсе асноўныя сацыяльна-дэмаграфічныя групы насельніцтва), рэйтынг БНФ быў найвышэйшым у верасні 1991 г. (12,1 працэнта), а ПКБ у той жа час — самым нізкім (1,1 працэнта), што відавочна было звязана з наступствамі жнівеньскага путчу. Аднак у далейшым рэйтынг ПКБ паступова ўзрастаў, дасягнуўшы свайго піку пасля першых прэзідэнцкіх выбараў у верасні 1994 г. (13,4 працэнта), а ў красавіку 1995 г. быў 8,8 працэнта, тады як адпаведныя лічбы для БНФ складалі 10,6 і 11,1 працэнта. Па даных сацыялагічнай лабараторыі "Новак" у пачатку мая бягучага года за Партыю камуністаў выказала гатоўнасць аддаць свае галасы 12 % апытаных грамадзян, тады як за Народны фронт — 8,7 %. Прычым варта яшчэ адзначыць, што за апошні час паступова ўзрастае папулярнасць тых партый (напрыклад, Беларуская партыя жанчын "Надзея", Аб'яднаная грамадзянская партыя, Беларуская экалагічная партыя і інш.), якія яшчэ год-два таму назад мелі практычна нулявы рэйтынг.

Як бачна, насельніцтва нашай краіны паводле сваіх палітычных арыентацый дастаткова выразна падзелена паміж прыхільнікамі інтэрнацыянальна-камуністычных і нацыянальна-дэмакратычных поглядаў, у той час як астатняя частка грамадзян альбо ўвогуле праяўляе апалітычнасць, альбо ў той ці іншай ступені сімпатызуе прадстаўнікам асобных з тых прыкладна трыццаці палітычных партый і рухаў, якія на сённяшні дзень афіцыйна зарэгістраваны ў Рэспубліцы Беларусь.

Аб значнай распаўсюджанасці падобнага індыферэнтызму да падзей грамадска-палітычнага жыцця можна зрабіць выснову на падставе аналізу ўдзелу насельніцтва краіны ў рэферэндуме і двух турах выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета ў маі 1995 г. Згодна з афіцыйнымі данымі, у рэспубліканскім рэфе-

рэндуме 14 мая 1995 г. зусім не прымала ўдзелу 35,2 працэнта ад агульнай колькасці грамадзян, якія мелі права ў ім удзельнічаць. У першым туры выбараў не прыйшлі на выбарчыя ўчасткі 35,3 працэнта ад усіх выбаршчыкаў, а ў другім — яшчэ больш — 43,4 працэнта. Прычым у сельскай мясцовасці, як і заўжды, людзі галасавалі больш актыўна, чым у гарадах (напрыклад, у сталіцы рэспублікі на другі тур выбараў прыйшло ўсяго 38,45 працэнта, тады як у Магілёўскай вобласці — ажно 61,6 працэнта выбаршчыкаў).

Вышэйпрыведзеныя лічбы пераканаўча пацвярджаюць, што на Беларусі ў сучасны перыяд існуе досыць шматлікі пласт тых людзей (каля трэці ад колькасці ўсіх дарослых грамадзян, альбо прыкладна 2,5 млн. чалавек), якія праяўляюць відавочны абсентэізм, г.зн. свядома ўхіляюцца ад ўсялякага ўдзелу ў выбарчых кампаніях, галасаваннях і ўвогуле ў палітычным жыцці. Цікава адзначыць, што з прыведзенымі лічбамі відавочна карэлююць і вынікі нядаўняга агульнабеларускага апытання розных груп насельніцтва адносна даверу дзяржаўным і грамадскім структурам.

Паводле дадзенага даследавання, амаль кожны трэці рэспандэнт (29 %) "поўнасцю не давярае" міліцыі, кожны чацвёрты (25 %) — мясцовым уладам, а кожны пяты — традыцыйным прафсаюзам (22 %) і органам правасуддзя (20 %). У той жа час найбольшым даверам сярод насельніцтва нашай краіны карыстаецца царква, якой "поўнасцю давярае" кожны трэці (33 %), а таксама прэзідэнт (24 % даверу) і войска (адпаведна 15 %). Прычым гэтыя шматлікія "недаверлівыя абсентэісты" ў перспектыве ўсё ж могуць (пад уплывам розных фактараў) больш-менш дакладна самавызначыцца і тым самым істотна змяніць ужо звычайны расклад палітычных сілаў на Беларусі. Але пакуль можна небеспадстаўна сцвярджаць, што немалая частка сучаснага беларускага грамадства знаходзіцца, гаворачы словамі Э.Дзюркгейма, у стане анаміі, г.зн. ва ўмовах своеасаблівага нарматыўна-каштоўнаснага вакуума, калі былыя ідэалы, каштоўнасці ўжо ў значнай ступені развенчаны, а новыя яшчэ не сфарміраваны.

Праўда, другая частка грамадства ў той ці іншай ступені вызначыла свае каштоўнасныя арыентацыі, палітычныя ўстаноўкі. Так, на сённяшні дзень электарат дзвюх асноўных грамадска-палітычных плыняў — нацыянальна-дэмакратычнай і камуністычнай — у цэлым ужо сфарміраваўся і з'яўляецца даволі стабільным, устойлівым. Так, колькасць прыхільнікаў першай плыні складае прыблізна 12—18 працэнтаў, што пацвярджаецца вынікамі першага тура прэзідэнцкіх выбараў (чэрвень 1994 г.) і ўжо згаданага рэспубліканскага рэферэндума. Менавіта ў межах гэтых 12—18 працэнтаў знаходзяцца як колькасць прагаласаваўшых на прэзідэнцкіх выбарах за Пазьняка і Шушкевіча, так і сказаўшых"супраць" па ўсіх чатырох пытаннях рэферэндуму. Пры гэтым найбольш паслядоўнікаў нацыянальна-дэмакратычных пазіцый пражывае ў гарадах (найперш у Мінску і абласных цэнтрах) і адносіцца пераважна да творчай інтэлігенцыі, служачых, вучнёўскай моладзі. У той жа час прыкладна такая ж

колькасць прыхільнікаў камуністычных ідэй (далучаючы сюды і значную частку падтрымліваючых аграрнікаў) ахоплівае ў асноўным вяскоўцаў і частку гараджан, прадстаўнікоў чыноўніцтва, пенсіянераў, ветэранаў і інш.

Відавочная палярызацыя, своеасаблівая амбівалентнасць (дваістасць) ментальнасці грамадзян Беларусі праяўляецца таксама і ў іх адносінах да дзейнасці прэзідэнта краіны. Як сведчаць спецыяльныя сацыялагічныя даследаванні, у сучасны перыяд палітыку прэзідэнта "поўнасцю адабрае" 14,8 % насельніцтва рэспублікі, тады як амаль столькі ж "поўнасцю не адабрае" (12,7 %), а чвэрць рэспандэнтаў (26 %) увогуле не змагла выказаць свайго ўласнага меркавання наконт пастаўленага пытання. Прычым рэйтынг прэзідэнта звычайна вышэйшы сярод менш адукаванай аўдыторыі і асоб пенсійнага альбо перадпенсійнага ўзросту. Безумоўна, невыпадкова гэтыя дадзеныя практычна супадаюць з вышэйпрыведзенымі лічбамі аб узроўні падтрымкі людзьмі асноўных палітычных партый краіны.

Асаблівасці полаўзроставага складу насельніцтва таксама аказваюць прыкметны ўплыў на агульны накірунак ментальнасці нашых грамадзян. Так, пэўны ўздым папулярнасці камуністычна-сацыялістычных установак можна вытлумачыць яшчэ і тым, што ў складзе насельніцтва Беларусі надзвычай вялікі працэнт людзей пенсійнага ўзросту — каля 20 працэнтаў (і тут таксама заўважаецца карэляцыя гэтай лічбы з рэйтынгамі Партыі камуністаў і прэзідэнта), якія найчасцей, як вядома з узроставай псіхалогіі, маюць немалую схільнасць да кансерватызму, настальгічных пачуццяў па гадах сваёй маладосці.

Менавіта падобныя тэндэнцыі яскрава выявіліся і падчас правядзення выбараў першага прэзідэнта нашай краіны летам 1994 г. У цэлым слушную думку аб прэзідэнцкіх выбарах як своеасаблівым эксперыменце па вызначэнні менталітэта выбаршчыкаў выказаў беларускі філосаф У.Падгол. Аднак немагчыма поўнасцю пагадзіцца з яго сцвярджэннем аб інталерантнасці беларускага народа: "Калі б наш народ на самой справе быў "памяркоўным", ён прагаласаваў бы альбо за Шушкевіча, альбо за Дубко, альбо за Новікава. А перавага была аддадзена чалавеку, ад якога чакалі адабраных катэджаў, турэмных камераў для карупцыянераў, масавых звальненняў высокіх чыноўнікаў". Справа ў тым, што беларускае грамадства, як раней ужо адзначалася, сёння вельмі моцна палярызаванае, таму відавочна нельга на ўвесь народ распаўсюджваць меркаванне аб яго "крыважэрнасці", схільнасці да жорсткай помсты сваім рэальным або ўяўным "ворагам". Нават калі прыняць ва ўвагу такі, на наш погляд, слаба абгрунтаваны "індыкатар" памяркоўнасці нашых грамадзян, як схільнасць галасаваць за Шушкевіча, Дубко і Новікава, то можна сказаць наступнае. Паводле афіцыйных крыніц, у першым туры прэзідэнцкіх выбараў (ва ўмовах дастатковага выбару кандыдатаў) цяперашні прэзідэнт набраў менш паловы (44,8 %) галасоў выбаршчыкаў, тады як тры названыя кандыдаты разам "ўзялі" 20,1 % галасоў (а ў Мінску, дарэчы, адпаведная лічба складала 29,2 % супраць толькі

26,5 %) у іхняга апанента). Да таго ж, значная частка выбаршчыкаў увогуле праігнаравала гэтую важную падзею грамадска-палітычнага жыцця рэспублікі.

*****

У цэлым для беларусаў заўсёды быў уласцівы відавочны кансерватыўны модус ментальнасці, што адначасова пацвярджаецца як аналізам разнастайных фальклорных твораў, так і вынікамі сённяшніх даследаванняў. Прычым падобная кансерватыўнасць мела практычна супрацьлеглы характар: калі ў мінулыя стагоддзі яна была накіравана на падтрымку старажытных этнакультурных і моўных традыцый, то "савецкі кансерватызм", наадварот, вызначаўся адмаўленнем усяго ўласна беларускага, схільнасцю да некрытычнага ўспрымання ўсялякіх сацыяльных міфаў, ідэалагем.

Праведзенае даследаванне шматлікіх крыніц пацвярджае, што яшчэ і сёння ў ментальнасці часткі людзей захоўваюцца пэўныя рысы архаічна-язычніцкай, міфалагічнай свядомасці. Гэта выяўляецца, як сведчаць фальклорныя крыніцы, у існаванні рэшткаў старажытнага антропамарфізма, анімізма, пантэізма, а некаторыя з'явы і падзеі грамадскага жыцця дазваляюць меркаваць аб схільнасці грамадзян да мыслення ў катэгорыях бінарных апазіцый, або "чорна-белай" логікі, узаемнай непрыхільнасці (напрыклад, "сябры-ворагі", "дэмакраты-камуністы", "інтэрнацыяналісты-нацыяналісты", прыхільнікі аўтарытарызму і дэмакратыі, і г.д.), аб захаванні ў ментальнасці дастаткова істотнага "пласта" іррацыянальных, падсвядомых арыентацый.

Ментальнасць сённяшніх грамадзян Беларусі характарызуецца даволі істотнай палярызаванасцю, гетэрагеннасцю, своеасаблівай "разарванасцю", наяўнасцю асобных рысаў свядомасці (стэрэатыпнасці, дагматызму мыслення, схільнасці да ксенафобіі) "аўтарытарна-таталітарнага" чалавека. Акрамя таго, для светабачання немалой часткі насельнікаў нашай краіны сёння ўласцівы яшчэ і відавочная апалітычнасць, абсентэізм, індыферэнтызм да падзей грамадска-палітычнага і нацыянальна-культурнага жыцця, схільнасць да розных стэрэатыпаў, ксенафобіі. У той жа час другая частка нашага грамадства вызначаецца большай сацыяльнай актыўнасцю, але і яна паводле сваіх палітыка-культурных арыентацый дакладна падзелена на дзве супрацьлеглыя і найчасцей узаемна непрыхільныя групы, — з аднаго боку, прыхільнікаў ідэй адкрытага дэмакратычнага грамадства, дзяржаўнай незалежнасці, свабоднага развіцця беларускай культуры і мовы (т.зв. нацыянальна-дэмакратычны лагер) і, з другога боку, — паслядоўнікаў камуністычнай ідэалогіі, схільных да аўтарытарных метадаў кіравання, адмаўлення або абмежавання дэмакратыі і суверэнітэту краіны (камуністычна—сацыялістычны лагер).

У перспектыве не выключана, што падобныя асаблівасці ментальных установак могуць прывесці (гэта яшчэ будзе залежаць і ад характару сукупнага

ўплыву многіх іншых фактараў) альбо да нарастання грамадскага супрацьстаяння, канфрантацыі і магчымага сацыяльнага выбуху, альбо, наадварот, да ўзмацнення сацыяльнай пасіўнасці, індыферэнтнасці, недаверлівасці большасці грамадзян да любых ідэалогій і адпаведнай замкнёнасці на "саміх сябе" ў выніку расчаравання людзей ад няздольнасці змяніць жыццё да лепшага. Трэці, найлепшы варыянт кансалідацыі нашага "расколатага" грамадства, паглыблення сацыяльнай салідарнасці грамадзян і іх сумеснага пошуку шляхоў выхаду з крызісу ў бліжэйшы час уяўляецца практычна недасягальным.

(Кантакты і дыялогі, 1996, №7—8)

ЗМЕСТ

З верай у будучыню (замест прадмовы).....3
Свабода думкі ці насілле? (С. Дубянецкі). 5
Выйсці з нацыянальнага анабіёзу (Э. Дубянецкі) 14
Нашчадкі Шавэна (С. Дубянецкі).....19
Сіндром беларусафобіі (С. Дубянецкі, Э. Дубянецкі) 28
Цяжкі шлях да адраджэння (С. Дубянецкі, Э. Дубянецкі) 38
Беларускі нацыянальны характар: спроба даследавання (Э.Дубянецкі).....48
Нацыянальная самасвядомасць беларусаў у мінулым і сёння (Э. Дубянецкі).....59
На мяжы дэнацыяналізацыі (С. Дубянецкі).....65
Ментальнасць грамадзян Беларусі у сучасны перыяд (Э. Дубянецкі).....65

Дубянецкі Станіслаў Фёдаравіч
Дубянецкі Эдуард Станіслававіч

Цяжкі шлях да адраджэння

Навукова-папулярнае выданне

Рэдактар Лаўроў С.Б.
Тэхнічны рэдактар Лукша Р.А.

Падпісана да друку 20.12.97г.
Фармат 60х90/16. Папера афсетная №1.
Гарнітура Таймс. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 5,75. Ул.-выд.арк. 6,25.
Тыраж 400 экз.

Выдавецтва С. Лаўрова. Ліцэнзія ЛВ № 845.
224023, Брэст, вул. Маскоўская, 275, п.20.

Надрукавана: 224000, г. Брэст, вул. С. Канстытуцыі , 1,
ООО "Ксерокомпани".

ЗВЕСТКІ АБ АЎТАРАХ

СТАНІСЛАЎ ДУБЯНЕЦКІ

Нарадзіўся ў 1940 г. у в.Востраў Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Кандыдат філасофскіх навук. У 1966 г. скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут, у 1973 г. Мінскую ВПШ. Настаўнічаў, быў на ідэалагічнай рабоце, працаваў у Інстытуце філасофіі і права Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. З 1994 г. загадчык рэдакцыі філасофіі, эканомікі і права выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя». Даследуе праблемы сацыяльнай філасофіі, паліталогіі і гісторыі культуры. Аўтар кніг і брашур па пытаннях палітычнага і маральнага выхавання, нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі, артыкулаў у энцыклапедычных выданнях і перыядычным друку.

ЭДУАРД ДУБЯНЕЦКІ

Нарадзіўся ў 1966 г. у в.Чудзін Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Кандыдат гістарычных навук. У 1988 г. скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт і працаваў у ім навуковым супрацоўнікам. Старшы навуковы супрацоўнік аддзела беларусазнаўства Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф.Скарыны, выкладчык Інстытута сучасных ведаў. Намеснік рэдактара інфармацыйна-аналітычнага і культуралагічнага бюлетэня «Кантакты і дыялогі». Член Беларускай псіхагістарычнай асацыяцыі, практычны псіхолаг. Даследуе праблемы міжнацыянальных адносін, этнічнай самасвядомасці, ментальнасці і нацыянальнага характару беларусаў. Аўтар кнігі «Таямніцы народнай душы» (1995), шматлікіх навукова-папулярных публікацый. Адзін з аўтараў навучальных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі і беларусазнаўству.